**Уладзіслаў Ахроменка**
**Максім Клімковіч**

# Праўдзівая гісторыя Кацапа, Хахла і Бульбаша

*апокрыф-правакацыя*

www.kamunikat.org

Мінск
Галіяфы
2009

**Прадмова да публікацыі**

Гісторыі, як навукі, ніколі не існавала, не існуе і існаваць не можа. Гэта бясспрэчна і відавочна.

Вывучэнне далёкай і не вельмі далёкай мінуўшчыны пачынаецца з першакрыніцаў. Калі першакрыніца адна, аніякіх праблемаў у даследніка не ўзнікае. Гісторыку нічога не застаецца, як даверліва пераказваць напісанае папярэднікам і не думаць, кім той быў: праўдзівым сведкам падзеяў ці іх зламысным фальсіфікатарам.

Праблемы пачынаюцца, калі першакрыніцаў некалькі. І чым іх болей, тым цяжэй даследніку, бо першакрыніцы заўсёды супярэчаць адна адной. Мы доўга шукалі якіх-небудзь сведкаў, якія б цалкам супадалі ў апісаннях фактаў і ў іх трактоўцы і, як не дзіва, знайшлі. Толькі неўзабаве высветлілася, што адзін летапісец папросту спісваў у другога.

Але ж і старажытны плагіят бязлітасна перакручваецца цягам усіх наступных стагоддзяў. Незлічоныя легіёны гісторыкаў, ідэолагаў, паліттэхнолагаў, пісьменнікаў ды прадстаўнікоў іншых старажытных прафесій ствараюць велічную і бліскучую мінуўшчыну як альтэрнатыву прыніздівай рэчаіснасці і няпэўнай будучыні.

Такім чынам, больш-меньш вартай даверу крыніцай можа быць адно аб'ектыўна першасны дакумент. Збольшага сумленныя даследнікі час ад часу спасылаюцца на нейкія загадкавыя Скрыжалі Гісторыі, на якіх нібыта і фіксуюцца праўдзівыя лёсы народаў. Да нядаўняга часу Скрыжалі гэтыя ніхто і нідзе не бачыў.

Не так даўно ў адным беларускім мястэчку руйнавалі чарговую старасвецкую камяніцу. Падпітыя калдыры, якія расцягвалі сцены на цэглу, адшукалі ў падмурках вялізную каменную пліту з загадкавымі пісьмёнамі. Замбаваныя дзяржаўнай прапагандай п'янтосы вырашылі, што гэта -- шыфроўка-інструкцыя з Захаду да беларускіх нацыяналістаў, экстрэмістаў ды іншых тэрарыстаў. Калі ж пад плітой не знайшлося парашута, рацыі, выбуховых рэчываў ды іншых традыцыйных шпегунскіх трантаў, калдыры супакоіліся і пацягнули знаходку ў камнедрабільню, каб раструшчыць пліту на жарству і такім чынам зарабіць на свае ўлюбёныя напоі.

На шчасце, побач апынуліся мы -- аўтары гэтае публікацыі. І, як толькі пабачылі дзіўныя каменныя пісьмёны, то зразумелі адразу: гэта – тыя самыя Скрыжалі Гісторыі, пра нястачу каторых меланхалійна ўздыхаюць прыхільнікі аб'ектыўнай мінушчыны. Гістарычная сенсацыя была навідавоку – у нашых руках.

Расшыфроўка тэксту заняла колькі гадоў, але намаганні далі плён. На вялікі жаль, нейкі невядомы калдыр адбіў верхнюю частку пліты, і таму першыя радкі летапісу назаўсёды страчаныя для даследнікаў. Аднак мы шчыра перакананыя, што непадробныя Скрыжалі стануць найкаштоўнейшай крыніцай праўдзівай і незаангажаванай гісторыі трох сусветна знаных народаў -- Кацапаў, Хахлоў і Бульбашоў.

**Уладзіслаў АХРОМЕНКА**
**Максім КЛІМКОВІЧ**

**...людзьмі звацца!..**

...адкінуў хвост і злез з дрэва. Гэта быў валасаты полаваспелы самец з пахмурным позіркам і нязграбнай постаццю. Свае пачуцці калматы фацат выяўляў рыкам і мыканнем -- у залежнасці ад настрою і ступені сытасці. Істота, вядомая біёлагам, як *Homo Slavianikus,* толькі збольшага нагадвала чалавека, але пераўзыходзіла ўсіх астатніх суродзічаў інтэлектам і здольнасцю да навучання.

Ягонымі паводзінамі кіравалі тры асноўныя жаданні -- голад, смага і покліч плоці. Калі першыя два можна было спатоліць на самоце, то дзеля задавальнення трэцяга давялося пайсці на хітрыкі.

На дрэвах панавала бязладная палігамія: далёкія і блізкія сваякі *Homo Slavianikus'*а кахаліся са сваімі сёстрамі, братамі і нават бабулямі. Інтэлект і дазволіў істоце вынайсці адпаведную ўмовам прынаду. Ён назбіраў ракавак-пярловіц, нанізаў іх на пруток, паклаў на паляне і свіснуў. З дрэваў неадкладна пасыпаліся самкі; за бліскучую біжутэрыю кожная жанчына згодная на ўсё.

Юрлівец меў з каго выбраць: самкі былі маладыя і прыгожыя, старыя і агідныя. *Homo Slavianikus* адлавіў з дзесятак, але ўпадабаў толькі дзьвюх.

Праз дзевяць месяцаў, як і трэба было чакаць, у кожнае з самачак адзін па адным нарадзіліся хлопчыкі. Яны гадаваліся ў адной калысцы, сталелі, па-братэрску сварыліся-мірыліся ды набіраліся розуму.

Але неўзабаве бадзяжныя цыганы, якія прыцягнуліся з вугра-фінскіх земляў, падкінулі *Homo Slavianikus'*у і ягоным жонкам малога бейбуса, якога разам з вучоным мядзведзем вадзілі па кірмашах і за грошы паказвалі публіцы. Той адразу выкінуў з калыскі родных братоў і абвесціў, што ён тут – старэйшы за ўсіх, і браты на тае падставе мусяць яму падпарадкоўвацца. Падкідыш не меў ані прозвішча, ані нават імя, і таму таксама запісаўся ў сыны *Homo Slavianikus'*а.

Чужынец, як падрос, стаў брутальным, неасэнсавана злосным дзецюком, вялікім аматарам бражкі, якую выйнашаў шляхам доўгіх эксперыментаў. Улюбёным заняткам старэйшага *Homo Slavianikus'*а было выходзіць нападпітку ў поле і заломліваць бярозы. Але нават болей за гэта ён любіў ладзіць жыдоўскія пагромы. Першай ахвярай старэйшага брата стаў Моўша Кац, за што пагромнік і атрымаў імя Кацап.

Сярэдні сын вызначаўся лірычным сантыментам і неспатольнай любоўю да варэнікаў. З дрэва, паваленага старэйшым братам, ён зрабіў скрыню, нацягнуў на яе кішкі і назваў гэтую спаруду кобзай. З біклагай крадзенай у старэйшага брата бражкі і вялікай торбай варэнікаў ён выходзіў у стэп шырокі і спяваў немудрагелістыя песні. Па-над стэпавым кавылём тырчэлі адно ўзнятыя ветрам валасы, за што сярэдняга брата і празвалі Хахлом.

Малодшы сын, як і належыць, быў самы дурны. Ён пагаджаўся на ўсё: прыбіраць паскудствы старэйшага брата, са слязьмі на вачах слухаць спевы сярэдняга, *абы не было вайны.* Мовай не валодаў цалкам: калі бацька пытаўся яго, дзе браты, малодшы гучна шчоўкаў пальцам па няголенай шыі і нязменна адказваў: «Буль-буль».

За гэта малодшага брата і назвалі Бульбашом.

Калі браты дасягнулі полаваспеласці, бацька вывеў іх на скрыжаванне дарог і загадаў разыйсціся ў розныя бакі.

-- Спыніцеся, як натрапіце на тое, чаго раней ніколі не бачылі, -- загадаў ён. -- А там -- пладзіцеся і памнажайцеся!

І браты разыйшліся ў розныя бакі...

З гэтага моманту і пачынаецца гісторыя ўзнікнення сем'яў, дзяржаваў і прыватнай уласнасці.

## Новая зямля

Прарадзіма *Homo Slavianikus'*а знаходзілася на сутыку пракаветных лясоў, дзікага стэпу і загібельнай дрыгвы.

Кацап скарыстаў права старэйшага брата і першым абраў напрамак -- пайшоў на ўсход сонца, у лясы. Ён ішоў за сонцам тры дні, пакуль хапала брагі ў біклажцы. Калі ж на чацьвертыя суткі старэйшы брат збольшага прачухаўся, то высветліў, што апынуўся ў матэчнай пушчы. *Шумел камыш, деревья гнулись, и ночка темная была.* Непраходныя зарасці зыркалі на Кацапа спалоханымі воўчымі вачыма. Абсалютна працьверазелы маладзён цвёрда вырашыў засіліцца. Ён угнуў галаў, заплюшчыў вочы і, у спадзяванні беспакутнае смерці, пабег да бліжэйшага дуба, каб раскраіць чэрап аб камель.

Раптам ягоны лоб упёрся ў нешта мяккае. Кацап узняў галаў і ўбачыў, што стаіць перад тоўстым пузатым дзядзькам з доўгімі пейсамі. За спінай пейсатага цямнеў церамок з прывабнаю шыльдай: «КАБАКЪ».

-- Жыд! -- узрадаваўся Кацап. -- Што ты на маёйісконнай зямлі робіш?

Не дачакаўшыся адказу, старэйшы брат забіў Жыда кулаком.

Кабацкі асартымент надзвычай уразіў забойцу. У піўніцы Кацап адшукаў халерную колькасць бражкі, піва і віна. Але больш за ўсё ён упадабаў белую каламутную вадкасць -- самагон. Выпіўшы, мо, з вядро, старэйшы брат узяўся брыдка лаяць Жыдоў, якія свядома спойваюць *Homo Slavianikus'*аў, пасля чаго заснуў.

Раніцою, з першым глытком самагонкі, Кацап вырашыў, што гэтая новая зямля і стане радзімай ягонага народа...

Сярэдні брат, звыклы да выгодаў жыцця, рушыў на поўдзень, у дзікі стэп. Хахол выправіўся ў шлях амаль цвярозы, бо Кацап на развітанне пазбавіў яго галоўнага тагачаснага энерганосьбіту – бражкі. Прыпякала сонейка, дзмуў вецярок, і чупрына на галаве Хахла варушылася, нібы жывая. Размілаваны сярэдні брат выцягнуў кобзу і заспяваў песню пра волю і долю. Ён даспяваў думу, дажаваў апошнія варэнікі і нечакана адчуў боль за бессэнсоўна пражыты дзень. Хацелася выпіць, але есці хацелася яшчэ больш.

Нечакана з-за спіны сярэдняга брата пачулася рохканне. Хахол азірнуўся і ўбачыў дзіўную істоту: брудна-ружовая скура з жорсткай шчэццю, доўгі лыч, агрэсіўны позірк заплылых вочак, дурнаватая ўсмешка закарэлага роту...

-- Брат... Старэйшы! -- прыгадалася Хахлу, і ён з асалодаю, што было моцы, даў у гнюсны лыч выспятка. Істота завішчэла і кульнулася дагары капытамі.

Ціхая стэповая ноч поўнілася пяшчотай: дыяменты зораў, жоўтая поўня і водар смажанага сала па-над бязмежным морам сівога кавыля...

З раніцы Хахол абсмактаў свінячую скуру, заспяваў песню пад акампанімент кобзы і зразумеў, што лепшага за гэтае месца яму ўжо не знайсці...

Малодшы ж брат абраў заходні шлях, бо нічога іншага, апроч дрыгвы, буслоў і жабаў яму не засталося. Бульбаш выправіўся ў дарогу без пітва і харчоў, бо выпіўку і закуску ў яго дарэшты забралі старэйшыя

браты.

Пошукі новай зямлі выдаліся пакутлівымі і зморнымі. Бульбашовы ногі вязлі ў дрыгве, хмызы абдзіралі твар, а аднойчы яго ўкусіла гадзюка. Штовечар знясілены малодшы брат клаўся спаць на купіну і зацікаўлена аглядаў краявід -- чырвоны захад над зялёным балотам. Так і засынаў з расплюшчынымі вачыма. А на раніцу ўжо самі сабою складаліся радкі: *«...мая шыпшына -- зялёны ліст, чырвоны цвет».* Сярод братоў Бульбаш заўсёды лічыўся дурнем, бо быў схільны да паэзіі, якая не давала матэрыяльных выгодаў.

Малодшы брат доўга і марна шукаў месца, прыдатнага для жытла, і засынаючы штовечар на новай купіне, бачыў адно і тое ж: чырвоны захад над зялёным балотам. *«Вось сымбаль твой, забыты краю родны!»* -- склаўся ў яго новы радок. З тых часоў спалучэнне чырвонага і зялёнага колераў выклікала ў Бульбаша і агіду, і замілаванне адначасова.

-- Куды яшчэ ісці з тае зямлі, якая здольная нараджаць вершы? -- запытаўся ў сябе малодшы брат і вырашыў назаўсёды застацца на балотнай выспе, ізаляванай ад усяго цывілізаванага свету...

Кацап, Хахол і Бульбаш пасяліліся на ўпадабаных імі землях назаўсёды. Яны пладзіліся і памнажаліся, аралі зямлю і пасвілі быдла. І вось аднойчы іх нашчадкі вырашылі сустрэцца...

### Магутны Божа

Кацапы, Хахлы і Бульбашы выправілі на братэрскую сустрэчу сваіх князёў. Хахлы – Уладзімера, Бульбашы – Рагвалода. Нашчадкі старэйшага брата таксама накіравалі на сустрэчу свайго князя. Але той па нацыянальнай завядзёнцы так напіўся ў дарозе, што нават не здолеў назваць сваё імя летапісцу. З гэтае прычыны кацапскі князь назаўсёды застаўся невядомым для гісторыі *Homo Slavianikus*'аў.

Сустрэча адбывалася на памежжы Кацапстана, Хахляндыі і Бульбашыі, у слынным горадзе Кіеве – рэзыдэнцыі хахляцкага князя.

Уладзімер з Рагвалодам селі за стол, а невядомага кацапскага правадыра паклалі пад лаву і сунулі яму ў рот памачаны ў самагоне лапаць з княскай нагі, бо нашчадак старэйшага сына *Homo Slavianikus*'а брыдка лаяўся.

Князі па-сваяцку выпілі самагону, закусілі салам з цыбуляй, і пад гукі хахляцкае кобзы павялі няхітрую гаворку, як *разам шукаць ім к шчасцю дарог.*

Магчыма, князі і знайшлі б дарогу да шчасця, але нечакана ў палацы Уладзімера з'явіліся два дзіўныя фацаты: стары са срэбным бізуном і малады вершнік з дзідаю. Прыблуды без дазволу падыйшлі да стала. Маладзён падчапіў дзідаю самы смачны шмат сала. Дзядок ляснуў бізуном па руках Рагвалоду і ўмомант адабраў у яго жбан з самагонам.

-- *Ты шалёны стары, хто цябе дзе хаваў!* -- абурыўся князь Бульбашоў, гледзячы, як нахабны дзядок жлукціць чужое спіртное.

-- *Хто з'їв моє сало?* – залямантаваў князь Хахлоў, зыркаючы вачыма на маладзёна з дзідай.

Невядомы кацапскі князь, што ляжаў пад лаваю, выплюнуў лапаць і радасна замацюкаўся, але гаспадар палаца ўдарам нагі прымусіў яго змоўкнуць.

-- Мы – магутныя Богі! – у адзін голас дакляравалі прыблуды. – Богі, якім вы моліцеся, але якіх вы раней ніколі не бачылі.

Вершнік праглынуў апошні кавалак сала, аблізаў дзіду і абвесціў:

-- Я – Ярыла, апякун усяго існага на зямлі, і таму *Homo Slavianikus*'ы мусяць ахвяраваць мне штодня самага тлустага кабанчыка!

-- А я – Бог маланак і агню Пярун! – назваўся дзядок, -- і таму *Homo Slavianikus*'ы мусяць штовечар ахвяраваць мне бочку вогненай вады!

Князі пераглянуліся, намысліліся і пасуворылі. Нават неадэкватны кацапскі правадыр незадаволена замычэў пад лавай.

-- А пайшлі вы ў дупу, магутныя Богі! – у адзін голас параілі князі. – Гэй, дружына, узяць іх!

Целаахоўнікі Уладзімера ўмомант схапілі Перуна і паваклі яго да Дняпра. *Ревів та стогнав Дніпр широкий*, і сівая галава бездапаможна лунала па-над хвалямі, покуль не захлынулася. Зляканы Ярыла прышпорыў каня і ўцёк куды падалей.

Нараніцу князі пахмяліліся і прыйшлі да высновы: жыць без Багоў не выпадае. Уладзімер на правах гаспадара вырашыў абвесціць адкрыты конкурс на пасаду Бога. Гэты рэлігійны тэндар увайшоў у гісторыю *Homo Slavianikus*'аў як «Іспыт вераў».

Першымі на запрашэнне, як і мае быць, прыбеглі Жыды. І хаця гэтыя аматары мацы, замешанай на крыві хрысціянскіх цнатлівак, з пенаю ў роце нахвальвалі сваю веру і лаялі чужыя, высокаму журы не спадабалася ў іўдаізме дзве рэчы: абразанне і забарона есці свініну. Хахляцкі князь Уладзімер, які меў да свініны генетычны сантымент, раз'юшыўся і прагнаў Жыдоў.

Наступным днём у Кіеў прыехалі Магаметане. Але запаветы Карану падаліся *Homo Slavianikus*'ам абсалютна антыгуманнымі. Да абразання і забароны есці свініну дадалося бязглуздае табу на алкаголь. Калі пахмельны кацапскі князь пачуў пра апошнюю забарону, дык накінуўся на Магаметанаў з мячом.

-- Алах усё адно Акбар! – прамовілі перад смерцю місіянеры Магаметанаў, -- а ты, Кацап, яшчэ тысячу разоў пашкадуеш за тое, што зняважыў Алаха...

Уладзімер загадаў прыбраць трупы ісламскіх фундаменталістаў, падцерці падлогу, пасля чаго паставіў на стол чарговы жбан самагону.

Вялікія шанцы на поспех мелі пасланцы Ватыкану. Папа Рымскі, які выпраўляў у землі *Homo Slavianikus*'аў сваіх легатаў, забавязаў іх перадаць князям воз віна і статак свінняў. Але схільныя да алкагалізму легаты выпілі ўсё віно яшчэ пры пераходзе цераз Альпы. На шляху да Кіева Папскія місіянеры слушна вырашылі, што закуска без віна -- рэч непатрэбная. Усю дарогу да земляў *Homo Slavianikus*'аў яны мянялі свінняў на віно, і таму прыбылі да рэзыдэнцыі Уладзімера толькі са Словам Божым...

Хітрыя Грэкі, хоць і дабраліся да Кіева апошнімі, але падрыхтаваліся да сустрэчы, як след. Бізантыйскія місіянеры спярша выставілі князям хабар: бражку, піва, мёд і віно, ды падкацілі да княскага стала воз заедкаў. Уладзімер, Рагвалод і невядомы кацапскі князь пілі, закусвалі, але, між іншым, пазіралі ў вакно: разбэшчаныя ўвагай міжнароднае супольнасці, яны чакалі яшчэ пасланцоў Індыі і Кітаю.

Але Грэкі, абазнаныя ў загадкавай душы *Homo Slavianikus*'аў, выдатна разумелі, чым купіць князёў. Паслы канстантынопальскага Патрыярха загадзя ведалі, што пасля п'янкі *Homo Slavianikus*'аў абавязкова пацягне ў блуд.

Грэкі не памыліліся... Не паспеў невядомы кацапскі князь вымавіць сакраментальную фразу: «Бабу бы цяпер», як грэцкія святары вывалаклі з натоўпу ладную бізантыйскую дзеўку -- імператарскую дачку Ганну.

Уладзімер, на правах гаспадара, пацягнуў да яе перапэцканые салам рукі.

-- Спачатку ўсе *Homo Slavianikus*'ы мусяць прыняць хрост! – хітра ўсміхнуліся бізантыйскія місіянеры.

Так Уладзімер, Рагвалод і невядомы кацапскі князь амаль што схіліліся прыняць хрост грэцкага ўзору. Але гісторыя гэта мела надта нечаканы працяг...

**Раскіданае гняздо**

Князь Рагвалод меў безліч шлюбных і пазашлюбных дзяцей па ўсёй Бульбашыі. З гэтае прычыны ўдзячны народ называў свайго правадыра *Бацькам,* а сваю Радзіму – *Бацькаўшчынай.* Сярод Рагвалодавых дзяцей дачка Рагнеда была ці не самай адметнай. Пра яе і згадаў бульбашоўскі князь у палацы Уладзімера. Акурат у той момант, калі хітрыя грэкі вывалаклі з натоўпу імператарскую дачку, Рагвалод грэбліва скрывіўся – маўляў, мая Рагнеда прыгажэйшая за вашу грэцкую курыцу!

-- А табе, Рагвалодзе, ніхто і не прапануе кахацца з маёй бізантыйкай! -- раз'юшыўся Уладзімер.

Рагвалод смяротна пакрыўдзіўся і на гаспадара, і на Грэкаў, і на бізантыйскую курыцу, і нават на новага магутнага Бога. Ён сеў на каня і паскакаў у Полацк. На той час гэты слынны бульбашоўскі горад быў не горшы за Кіеў.

Сквапны Ўладзімер уздыхнуў з палёгкаю – на думку Хахла, ненажэрны Бульбаш ледзьве не давёў да банкрутства гаспадарку кіеўскага княства. Апошняму госцю, невядомаму кацапскаму князю, Уладзімер даў рады: надзеў п'янному крыж на шыю і сунуў за крысо свінога кажушка жбан з самагонам.

-- Гэта – святая вада! – патлумачыў ён госцю перад тым, як даць яму выспятка.

Цяпер князь Хахлоў нарэшце паверыў, што ніхто не перашкодзіць яму авалодаць дачкой бізантыйскага імператара.

І тут хітрыя Грэкі нагадалі яму пра дамову: хрост мусяць узяць усе тры *Homo Slavianikus*'ы. Давялося нецярпліваму Ўладзімеру склікаць дружыну і рушыць на Полацк, каб абярнуць у новую веру братоў-Бульбашоў. Мужныя палачане доўга трымаліся ў хахляцкай аблозе, і здаліся толькі тады, калі быў выпіты ўвесь самагон і з'едзены апошнія свінні.

Помслівы Уладзімер дарэшты раскідаў радавое гняздо Рагвалода. Ён спаліў Полацк, уласнаручна забіў правадыра Бульбашоў, зацягнуў прыгажуню Рагнеду ў княскі намёт і здзейсніў гнюсны намер яшчэ да таго, як *зорка Венера ўзыйшла над зямлею* раскіданага гнязда Рагвалодавай сям'і.

Праз дзевяць месяцаў у Рагнеды нарадзіўся сын Ізяслаў. Разам з чарговай жонкай, нашчадкам і статкам нявольніц для свайго гарэма Ўладзімер вярнуўся да Кіева. Але імператарскай дачкі Ганны ўжо не было ў княскае рэзыдэнцыі.

-- Дзе мая баба? – гаркнуў ён на Грэкаў.

-- *На Моры Хвалынскім*, у слынным горадзе Херсанесе! -- хітра пасміхнуліся пасланцы канстантынопальскага Патрыярха.

-- Чаму?

-- Бліжэйшы хрысціянскі храм толькі там! – запэўнілі Грэкі.

Уладзімер страшна абурыўся. Ён пасадзіў сваю дружыну на чаўны і сувора загадаў прывесці бізантыўскую дзеўку ў Кіеў. У чаканні сваіх ваяроў хахляцкі князь бавіў час, святкуючы будучую перамогу над Грэкамі.

Але аблога Херсанеса зацягнулася на гады. Старэлі жонкі, падрасталі дзеці, у тым ліку і Рагнедзін сын Ізяслаў. Баючыся, што імператар Бізантыі перадумае аддаваць дачку Ганну ў дынастычна-шлюбную няволю, Уладзімер сам выправіўся пад сцены Херсанеса. Ён бязлітасна спаліў горад, разбурыў нямала хрысціянскіх храмаў, перабіў амаль усіх святароў, апаскудзіў мясцовыя святыні, пасля чаго, нарэшце, прыняў сапраўдны хрост і спазнаў таямніцу хрысціянскага шлюбу. З нарабаванымі скарбамі, статкам паланёных хрысціянаў і з чарговай жонкай Ганнай шчаслівы неафіт вярнуўся ў стольны град Кіеў.

Але Рагнеда ніяк не магла дараваць Уладзімеру раскіданага радавога гнязда. Усе гады яна выхоўвала ў сына Ізяслава нянавісць да хахляцкага бацькі. Але той даўно забыўся на старую сям'ю: увесь вольны час Уладзімір бавіў на ложку з князёўнаю Ганнай, абазнанай у вытанчаным бізантыйска-азіятскім сэксе. Правадыр Хахлоў забыўся на ўсе ранейшыя забавы: яго не цікавілі ані вайсковыя паходы, ані балі, ані паляванне на тураў, ані абсмоктванне свінячых скурак. Ад сэкса па-бізантыйску небарака Уладзімер счарнеў і схуднеў – здавалася, Ганна высмактала з яго ўсю мужчынскую моц. З усіх генетычных рэфлексаў хахляцкага ўладара захаваўся толькі адзін -- княскія вочы запальваліся пры чароўным слове «самагон».

Падступная Рагнеда зразумела: надыйшоў яе час. Яна выгнала на княскім лецішчы ў вёсцы Прадславіна бочку шалёнага самагону, нашварыла свежаніны і паслала да Ўладзімера цыдулку: «Любы, мы з Ізяславам п'ем і закусваем. Трэцім будзеш?»

Натуральна, Уладзімер, як праўдзівы *Homo Slavianikus* без ваганняў пагадзіўся стаць трэцім. Ён схлусіў жонцы Ганне, што выпраўляецца ў чарговы паход на Полаўцаў, а сам, таемна ад усіх, падаўся ў Прадславіна.

Саслабелы ад сухога грэцкага віна Уладзімер не вытрымаў і жбана самагону, зваранага па бульбашскім рэцэпце. З надыходам ночы князь паваліўся спаць. Рагнеда выцягнула з похваў меч і ўдарыла былога мужа нагой. Князь Хахлоў адразу прачнуўся і злякана паглядзеў на Рагвалодаву дачку з мячом у руках.

-- *Помніш, калі я спаткаўся з табою, зорка Венера ўзыйшла?* – лісліва нагадаў Уладзімер, роспачна пазіраючы на гострае лязо.

Рагнеда размілавалася ад успамінаў і страціла пільнасць. Працверазелы Ўладзімер выхапіў з ёйнае рукі меч. Ён ужо мерыўся адсекчы палачанцы галаў, але ў гэты момант у спачывальню ўскочыў Ізяслаў, які быў сабраўся падглядаць забавы дарослых.

-- І ты, Ізя? – ачмурэў хахляцкі князь.

Ізяслаў выхапіў свой дзіцячы меч і сувора прамовіў:

-- Бацька, не думай, што ты тут адзін!

Уражаны Уладзімер не толькі дараваў Рагнедзе жыццё, але, ад граха падалей, выслаў яе з сынам на Бацькаўшчыну, да раскіданага гнязда Рагвалодава. Так Бульбашы зноў займелі свайго князя.

**Людзі на балоце**

Наступныя сто гадоў нашчадкі *Homo Slavianikus*'а сустракаліся зрэдку. Братэрскія народы былі надта занятыя пільнымі справамі.

Кацапы з нязменным імпэтам, але са зменлівым поспехам гралілі іншародцаў, жлукцілі самагон, а ў перапынках між гэтымі заняткамі зацята таўклі адзін аднаму пысы.

Хахлы гадавалі свінняў, хадзілі ў госці да кумаўёў, адбіваліся ад Полаўцаў і цягнулі ў свае ложкі палавецкіх дзевак.

Бульбашы, узрадаваныя, што старэйшыя браты часова забыліся на іх існаванне, па-ранейшаму сядзелі на балотнае выспе, ізаляванай ад кшталтаў сусветнай цывілізацыі і штовечар цешыліся захадам сонца.

Зрэшты, гэтыя людзі на балоце былі не такімі дурнымі, як падавалася іх суседзям. Нашчадкі малодшага брата *Homo Slavianikus'*а нарэшце навучыліся мецы выгоды з геапалітычнага становішча сваёй дзяржавы. Бульбашы збудавалі на кожнае выспе па блокпасту і абклалі мытам падарожнікаў. Мыта плацілі ўсё: і мусульманскія гандляры гашышам, і варажскія найміты, і кацапскія прамысловыя шпегуны, якія кралі на Захадзе тэхналогіі вытворчасці «вогненае вады».

Але ў людзей на балоце нараджаліся не толькі мытнікі, камерсанты і паэты. Час ад часу Бульбашыя дарыла свету праўдзівых махляроў...

На той час усе балотныя мытні краіны трымаў князь Усяслаў, праўнук князёўны Рагнеды. Відавочна, гэта быў дробны палітычны авантурыст, але яго баяліся і паважалі ўсе: і самі Бульбашы, і Кацапы з Хахламі, і варажскія госці, і нават грэцкія святары. Пра Ўсяслава казалі, нібыта ён нарадзіўся ад чараў, умее перакідацца ў ваўка і здольны за дзень абегчы з інспекцыяй усе памежныя блокпасты Бульбашыі.

Аднак, насамрэч усё гэта было маною: падобныя плёткі па загадзе самога Ўсяслава распускалі купленыя за мытныя грошы гусляры і летапісцы. Так, у выніку пісьменнай PR-акцыі палітычны лідар Бульбашыі і прыдбаў мянушку «Чарадзей».

Натуральна, не ўсім навакольным народам падабалася плаціць мыта, а найперш – сквапным Хахлам. Нечакана кіеўскія князі, браты Яраславічы, захапілі саюзны палачанам Ноўгарад -- першы мытны блокпост на шляху з Варагаў у Грэкі. Хахлы самі хацелі браць грошы з падарожных.

-- Паглядзім, які ты Чарадзей! -- з'едліва заявілі нахабныя кіеўляне.

Пакуль Усяслаў з дружынаю адбіваў Ноўгарад, хітрыя братаны Яраславічы абклалі Менск – галоўны мытны тэрмінал Бульбашыі. Хахлы спалілі склады з таварамі, але, як і мае быць, захавалі піўніцу са спіртным. Хахляцкае войска наладзіла на берагах Нямігі і Свіслачы традыцыйны для *Homo Slavianikus'*аў пікнік са смажанінай, самагонам і п'янымі бойкамі; браты Яраславічы доўга яшчэ расшуквалі сваіх ваяроў па навакольных хмызах.

Неўзабаве падцягнуліся Бульбашы. Яны былі цвярозыя, а таму злосныя, і з гэтае прычыны з лёгкасцю раскідалі п'яных прыхадняў. Ацалелыя хахляцкія ваяры нараніцу пакутвалі з пахмелля. Сунуцца назад у Менск яны пабаяліся, менавіта таму і выправіліся па бімбер да бліжэйшае піўніцы – у Воршу. Там, паміж першай і другой чаркамі, у гнюсных Яраславічаў і нарадзіўся падступны план. Братаны паслалі да Ўсяслава ганца з прапановаю па-братэрску выпіць і замірыцца, у чым Яраславічы прысягалі на сымболях, святых для кожнага *Homo Slavianikus'*а: на жбане з самагонам і на Святым Крыжы.

Хаця Ўсяслаў і сам быў прайдзісветам, але нават ён не мог дапусціць, што браты парушаць дубальтовую прысягу. Правадыр Бульбашоў з невялікім атрадам сабутэльнікаў з'явіўся ў Воршы.

Вераломныя Яраславічы нават дзеля прыліку не налілі гасцям па чарцы. Яны адразу схапілі Ўсяслава, завезлі ў Кіеў і кінулі ў глыбокі поруб да жабаў і піявак.

Надзіва, ліхтугі не зламілі князя, бо цёмны поруб з тванню і крывасмокамі – родная стыхія для кожнага праўдзівага Бульбаша. Людзі, якія нарадзіліся і выраслі на балоце, прызвычаіліся жыць і ў горшых умовах. Усяслаў бавіў час, палохаючы вартаўнікоў аповядамі са сваёй нібыта «чарадзейскай» біяграфіі і, натуральна, абяцаў наладзіць у Хахляндыі райскае жыццё, як толькі народ абярэ яго правадыром. Дасведчаны палітычны махляр быў перакананы, што неўзабаве ўвесь Кіеў толькі і стане гаварыць пра ягоныя звышнатуральныя здольнасці.

Так яно і здарылася.

Варта было Яраславічам пацярпець нязначную паразку ад Полаўцаў, як прымхлівыя Хахлы кінуліся да поруба.

-- *Вічний революцьонер, дух, що тіло рве до бою, рве за поступ, щастя й волю, він живе, він ще не вмер!* – загукалі яны і прапанавалі Ўсяславу заняць пасад кіеўскіх князёў.

Сапраўдны дэмагог і папуліст ведаў, што ад народнай любові да народнай нянавісці – адзін крок. І таму не рызыкаваў прасіць сябе двойчы. На чале кіеўскай дружыны ён разбіў Полаўцаў. Але ўзнагароды за перамогу Хахлы так і не атрымалі...

Схільны да фінансавага махлярства палітычны лідар Бульбашоў абяцаў аднавіць парваныя эканамічныя сувязі і ўтварыць агульную бязмытную прастору разам з Варагамі і Грэкамі. Усяслаў кляўся інтэграваць усіх *Homo Slavianikus'*аў у агульны Саюз. Шчодра аплочаныя летапісцы стварылы гэтаму авантурысту вобраз адзінага палітыка, якому варта давяраць. Калі ж наіўныя Хахлы перадалі махляру свае грошы на здзяйсненне цыклапічных праектаў, ён прыхапіў казну і ўцёк у сваю дрыгву. Бо толькі дурныя людзі на балоце ўсё яшчэ верылі ў звышнатуральныя палітычныя здольнасці гэтага злодзея і прайдзісвета...

### ...і ваякі на грозных канях!

Падзеі, што разгарнуліся на землях *Homo Slavianikus'*аў у наступныя гады, сталіся нядобрымі вынікамі ліхтужнага супрацьстаяння паміж тагачаснымі хрысціянскімі цэнтрамі.

Папа Рымскі, як праўдзівы спадкаемца св. Пятра, справядліва імкнуўся да глабалізацыі хрысціянства. Але гэтаму працівіліся бізантыйскія імператары і прызначаныя імі Патрыярхі. Канстанцінопальскі Патрыярх, мо, і прызнаў бы першародства Рымскага Папы, каб апошні не быў хранічным алкаголікам, гнюсным ліхвяром і вытанчаным хціўцам. Зрэшты, і сам канстанцінопальскі Патрыярх не вызначаўся цнатлівасцю. Ён уласнаручна катаваў палонных хрысціянаў, меў сталы працэнт ад таталізатара на Царградскім іпадроме і, напіваючыся віна, цягаў у патрыяршыю рызніцу манашак-німфетак.

Аднак, асцярожны Патрыярх, баючыся імператарскага гневу і розгаласу, рабіў свае справы пацішу, а звышнахабны Папа, які не меў над сабой аніякага начальства, апорч Пана Бога, нават афішаваў свой амаральны лад жыцця.

Гэткі падыход да грахоўных справаў і справакаваў міжканфесійны разлад.

Аднойчы, на тэалагічным дыспуце бацькі Заходняе і Ўсходняе цэркваў паставілі пытанне рубам: варта ці не варта хаваць свае грахі ад цікаўнай грамадскасці. Пасланцы Патрыярха настойвалі на поўнае

таямніцы граха. Папскія легаты занялі супрацьлеглую пазіцыю. Царкоўныя іерархі так і не здолелі прыйсці да пагаднення. П'яны папскі легат выдраў паўбарады ў бізантыйскага архіярэя, а той, у сваю чаргу, ледзь не прыдушыў апанента ланцугом ад кадзіла. Раз'юшаныя бацькі цэркваў раз'ехаліся па сваіх парафіях. У выніку Канстанцінопальскі Патрыярх перадаў Рымскага Папу анафеме, за што і атрымаў адлучэнне ад царквы.

Але гэтая тэалагічная вайна атрымала нечаканы працяг на землях *Homo Slavianikus*'аў...

Хітрыя Грэкі, якія прызвычаіліся грэбсці жар і грошы чужымі рукамі, нечакана наладзілі кантакт з дзікунамі, што жылі на бясконцых абшарах пустэчнае Азіі. Дзікуны, якія пазываліся Басурманамі, нават не здагадваліся пра існаванне заходняга ладу жыцця: хадзілі ў скуры, гадамі не мыліся, елі сырую каніну і ўвесь час бязмэтна вандравалі па Азіі. Грэцкія пасланцы, якія прыбылі да басурманскага хана, адразу растлумачылі ўсе выгоды азіятскай экспансіі ў цывілізаваны свет. Канстанцінопальскі архістратэг падсунуў хану сфальшаваную мапу свету, на якой, нібыта між іншым, адсутнічала Бізантыя.

-- Рушце на Захад, покуль не дабярэцеся сюды! – палец архістратэга ўказаў на Рым. – Тамтэйшы хан прызываецца Папам Рымскім, у яго да халеры маладых дзевак, пародных скакуноў і бурдзюкоў з кумысам!

Басурманы дачакаліся зімы, каб замерзлі рэкі і балаты, і рушылі на Захад.

Першай збольшага абжытой краінай на шляху дзікуноў апынуўся Кацапстан. Але Басурманы нават не заўважылі кацапскіх халабудаў, замеценых снегам па самыя дахі – гэтак жа, як і паснулых на зіму тубыльцаў. *Ваякі на грозных канях* спалілі толькі мястэчкі, што стаялі на пагорках. Там азіятскія дзікуны сапсавалі абсалютна ўсіх наяўных дзевак.

З тых часоў у Кацапстане і нараджаецца шалёная колькасць вузкавокіх жоўтаскурых байструкоў, якія празмерна ганарацца расавай чысцінёй свайго "славянскага" народа. Упэўненасць, што Кацапы -- самая чыстая, прыгожая і вялікая раса ў свеце, і дагэтуль надае байструкам надзвычайнай пыхі і халернай нянавісці да ўсяго астатняга чалавецтва.

Наступнай зямлёй на шляху Басурманаў была куды больш багатая і цывілізаваная Хахляндыя. Але недасведчаныя ў геаграфіі заваёўнікі палічылі Хахляндыю за Італію, а Кіеў – за Рым. Басурманы, як і абяцаліся Грэкам, разбурылі сталіцу, згвалцілі ўсіх дзевак, а хахляцкага князя з рэшткамі дружыны загналі ў храм, які прынялі за Папскую рэзыдэнцыю, ды спалілі яго на попел.

Неўзабаве хітрыя Грэкі праз сваіх гандлёвых шпегаў дазналіся пра фатальную памылку азіятаў. Канстанцінопальскі імператар паспешліва выправіў пасольства ў Хахляндыю, але Грэкі спазніліся. На месцы Кіева яны ўбачылі адно рэшткі басурманскага войска. Вузкавокія паганцы смажылі на вуголлях хрысціянскай сталіцы каніну, кідаючы абсмактаныя косткі ацалелым хахляцкім князям-калабарантам.

-- Гэта не Рым! – спрабавалі давесці Грэкі басурманскаму хану.

-- Рым... Рым... – радасна хрумкалі конскімі храшчамі качэўнікі.

Бізантыйцы зразумелі, што пераканаць дзікуноў не выпадае, і з тае прычыны абралі сваімі хаўруснікамі недабітых Хахлоў.

-- Растлумачце гэтым недавумкам, дзе знаходзіцца Рым! – загадалі Грэкі.

-- Растлумачым! – прашамкаў дробны хахляцкі калабарант разбітым ротам,– але і мы пойдзем рабаваць Рым разам з Басурманамі.

-- Як ты будзеш рабаваць? Ты ж зубоў не маеш! – пасміхнуліся Грэкі.

-- *А я що не з'їм, то пінадкусую!* – запэўніў новы хаўруснік Басурманаў.

Пасля гэтых словаў Грэкі пераканаліся, што перадалі справу ў надзейныя рукі, і вярнуліся да Канстанцінопаля.

Хахлы пайшлі на хаўрус з Басурманамі не толькі з-за любові да рабаўніцтва. Яны пеставалі патаемную мару: калі ад заваёўнікаў дасталося старэйшым братам, дык малодшаму брату-дурню мусіць дастацца ўдвая больш. З тае прычыны Хахлы і павялі Басурманаў не ў Рым, а на поўнач – у Бульбашыю.

Паход завяршыўся бясслаўна. Вясна заспела агрэсараў *паміж пустак балот бульбашоўскай зямлі, на ўзбярэжжы ракі шумнацечнай.* Усе коні патанулі ў раскіслай дрыгве, Басурманы ўзбіліся на купіны, дзе і пачалі дохнуць па адным з голаду.

У гэты час бульбашскі князь Рынкгольд, седзячы на выспе, цешыўся ўлюбёным краявідам: захадам над балотам. Як сапраўдны народны правадыр, ён нават не зважаў на нейкія галодные енкі. Ніхто з заваёўнікаў не выбраўся з багны жывым, і з тае прычыны праўдзівых сведкаў смерці прыхадняў не засталося. Менавіта таму ўсе навакольныя народы і надалей уважалі тамтэйшага князя непераможным ваяром.

Басурманы ладзілі яшчэ некалькі паходаў на Бульбашыю, але кожным разам адступалі ні з чым: ледзьве дзікуны бачылі балотных князёў, як згадвалі пра купіны і заварочвалі прэч.

Мо, азіятскія заваёўнікі, падбухтораныя Грэкамі, і мелі нейкія шанцы на далёкую перспектыву, але Папа Рымскі, люты вораг Бізантыі, нечакана пайшоў у наступ. Ён навербаваў па ўсёй Еўропе дробную рыцарскую п'янь і погань, пасадзіў ваяроў на караблі і дэпартаваў іх у Малую Азію -- без грошай, хлеба, віна і дзевак. Тым часам папскія легаты, якія прыбылі да двароў хрысціянскіх манархаў, распачалі новую ідэалагічную акцыю. Са словаў рымскіх пасланцоў выходзіла, нібыта рыцары -- высакародныя змагары за Веру, Святога Айца і Айчыну вядуць антытэрарыстычную аперацію супраць ісламскіх фундаменталістаў, гандляроў наркотыкамі і выкрадальнікаў хрысціянак.

Рыцарам вельмі хацелася віна і дзевак, і таму ім было да халеры, каму секчы галавы: чучмекскім тэрарыстам ці праваслаўным Грэкам. Але канстанцінопальскія шынкі і лупанарыі былі бліжэйшыя за іерусалімскія корчмы і бардэлі. Папскі нунцый, высланы ў Крыжовы паход, імпэтна падбухторваў *ваякаў на грозных канях*:

-- *Бійце ў сэрца іх -- бійце мячамі, не давайце чужынцамі быць!*

Рыцары білі ўсіх, хто не жадаў навярнуцца ў лацінства. Яны разрабавалі Канстанцінопаль і нават на нейкі час стварылі сваё каралеўства. Натуральна, пасля гэтага падступныя Грэкі не змаглі падбухторваць хаўруснікаў-дзікуноў да паходаў на Рым.

Так лацінскія і бізантыйскія цемрашалы, якія не знайшлі паразумення ў справе грэхазнаўства, ледзь не знішчылі хрысціянскую цывілізацыю, не маючы з гэтага аніякай карысці.

**Всякому городу нрав і права, всякий имєєт свой ум, голова!**

Надалей менталітэт *Homo Slavianikus*'аў фармаваўся не толькі гістарычнай традыцыяй, рэлігійнай дагматыкай, рытуальнымі

забабонамі і загадамі правадыроў, але найперш – навакольным асяродкам.

Кацапы, якія першапачаткова жылі ў змрочных пушчах, па хуткім часе звялі амаль ўсе дрэвы на дровы пад самагонныя апараты. На месцы пракаветных лясоў разлегліся тужлівыя стэпы. Неабазнаныя ў экалогіі дзікуны роспачна пазіралі адзін на аднаго, задаючыся класічнымі пытаннямі *“Кто виноват?”* і *“Что делать?”* Басурмане з Залатой Арды, пад пратэктаратам каторай і знаходзіўся тагачасны Кацапстан, акурат і далі адказ на апошняе пытанне: бясконцыя стэпы сталіся ідэальным месцам для качавога ладу жыцця.

Новы жыццялад адразу прыйшоўся даспадобы праўдзівым нашчадкам угра-фінаў, саманазваных “старэйшымі” *Homo Slavianikus’*амі. Бясконцыя орды ў кібітках, на конях, сабачых запражках і проста пешкі хаатычна пацяклі ў пошуках месцаў, прыдатных для выпасу быдла. Пакуль жывёлы пасвіліся на пашы, лайдакі-качэўнікі бавілі час ва ўлюбёных нацыянальных забавах: лютых запоях, хараводах з мядзведзямі, брутальных бойках адзін з адным, а таксама ў халопскіх спевах на гонар чарговага князька, накінутага ім басурманскім ханам. У перапынках качэўнікі пахмяляліся настоянкамі на мухаморах і гадзілі пад кібіткі, традыцыйна разважаючы пры гэтым пра Веліч Кацапскага Духу. Калі капытныя істоты канчаткова спусташалі навакольныя пашы, а іх гаспадары – запасы ежы і пітва, увесь табар збольшага цверазеў і падымаўся ў пошуках месца, прыдатнага для чарговага кібіткавага мястэчка.

Але неўзабаве амаль увесь стэп быў вытаптаны і запаскуджаны. І тут Кацапы, па ўзоры старэйшых братоў-Басурманаў, скемілі, што месцы, вартыя выпасу, трэба заваёўваць. З гэтае прычыны кацапскае грамадзства і было зарганізавана па мілітарным прынцыпе з падзяленнем на *“сотни”*, *“тысячи”* і *“тьму”*. Навязлівая ідэя “вызвалення суседніх народаў” для няўхільнага пашырэння ўласных выпасаў сталася галоўнай ідэалагічнай дактрынай Кацапстану. Суседнія народы бязлітасна вызваляліся ад уласнай годнасці, маёмасці, культуры, мовы, рэлігіі, а ў выпадках доўгага супраціву – і жыцця. На новых межах качэўнікі неадкладна ставілі безгустоўныя каменныя бабы – так званых “воінаў-вызваліцеляў”, якія і дагэтуль захоўваюцца ў некаторых малаадукаваных паланёных плямёнаў.

Частка Кацапаў бессаромна вызнала сваю качэўніцкую сутнасць. *“Да, скифы мы, да, азиаты мы с роскосыми и жадными очами!»* -- ганарліва запэўнівалі яны навакольныя народы. Частка дбайна маскавалася пад белых людзей. Але ж усе насельнікі дзікага стэпу люта ненавідзілі працу, бізнэс, свабоду, дэмакратыю, правы чалавека і нават гігіену, і лічылі такі светапогляд адзіна правільным. Дзікі і занядбаны край, пыхліва названы качэўнікамі “Святым Кацапстаном”, уважаўся тамтэйшымі патрыётамі самым Духоўным, Культурным і Вялікім. Тыя, хто не падзеляў падобных перакананняў, неадкладна траплялі ў рэестр “кацапафобаў”. Першымі ў даўжэзным спісе, як і мае быць, стаялі цывілізаваныя і аседлыя Хахлы з Бульбашамі…

Хахлы, якія таксама нацярпеліся ад Басурманаў, тым не менш дасягнулі вышынь земляробства і жывёлагадоўлі. Галоўным хахляцкім злакам стала пшаніца, з якой выраблялася адмысловая гарэлка, а галоўнай татэмнай жывёлай была канчаткова абраная свіння, з якой атрымлівалася сытная закуска. Неўзабаве край сярэдняга *Homo Slavianikus’*а заззяў, *як роса на сонці.* Хахляцкія свінні былі запрошаныя да сталоў наймагутнейшых еўрапейскіх манархаў, а хахляцкія трункі

выявіліся такімі моцнымі, што неадкладна ператваралі нават самых ціхамірных людзей ў брутальных малпаў. З тае прычыны традацыйны хахляцкі трунак і называюць *“горилкой”.*

Прычынай эканамічнага цуду сталіся не толькі багатыя чарназёмы, але ж найперш – прыродная хахляцкая хітрасць. Басурманскія намеснікі, выхаваныя ў традыцыях артадаксальнага ісламу, грэбавалі алкаголем ды салам, аддаючы перавагу анашы з канінай. З тае прычыны вузкавокія ніколі не рабавалі ані кіеўскія вінакурні, ані палтаўскія аграгарадкі, што спецыялізаваліся на свінагадоўлі.

Залішкі сельгаспрадукцыі моцна паўплывалі на менталітэт сярэдняга *Homo Slavianikus*'а; Хахлы лічыліся ці не самай гасціннай нацыяй Еўропы. Закарміць і напаіць госця да смерці -- і дагэтуль святы абавязак кожнае хахляцкае гаспадыні. А рэгулярна свінячыцца пад ладную лусту сала, у разуменні многіх Хахлоў – адзіны варты мужчыны занятак. Шматгадзінныя застоллі вымагалі хоць нейкіх фізічных практыкаванняў, і схільныя да лірыкі Хахлы наскладалі процьму цудоўных песень. Застольныя спевы прыемна напружвалі дыяфрагму і такім чынам спрыялі страваванню.

Малодшыя нашчадкі *Homo Slavianikus*'а па-ранейшаму сядзелі на балотных выспах сярод камароў, пiявак, кляшчоў, кажаноў ды іншых паганых крывасмокаў і замілавана слухалі спевы жабаў.

Дурныя Бульбашы абралі ці не самыя няплодныя землі; да таго ж, апошні ледавік прыцягнуў на выспы процьму валуноў, якія трэба было прыбіраць з палеткаў, пашаў, сенажацяў і градаў. Менавіта гэтая акалічнасць і паспрыяла прыроднаму бульбашоўскаму працалюбству. Колькасць перанесеных камянёў трэ' было запісваць, і гэта, у сваю чаргу, паўплывала на традыцыйную бульбашоўскую любоў да пісьменства і кніжнай справы. З непатрэбных брылаў Бульбашы складалі шматлікія бажніцы, і гэта – ці не галоўная прычына балотнай рэлігійнасці. Рэгулярны перанос цяжараў вымагаў неадкладнага зняцця стрэсу, і гэта – аснова нязводнага бульбашоўскага п'янства. Да таго ж, у Бульбашоў было непрынята скардзіцца на жыццё суседзям, і таму вакол лічылі, што ў пацвілай дрыгве сапраўды пануюць райскія парадкі.

Праўда, тагачасныя бульбашоўскія кіраўнікі ўважалі сваіх падданых апошнім быдлам, ацэньваючы жыццё тутэйшага земляроба-працаголіка нават танней за жыццё паляўнічага сабакі. Але памяркоўныя балотныя людзі ніколі не спрабавалі зрынуць непаважную ўладу; усё, што адбывалася на суседніх землях, заставалася па-за межамі іх увагі, інтарэсаў і ўплываў. У свядомасці прыдушанага працай людства традыцыйна панавалі дзве канцэптуальныя ідэі: “Можа, так яно і трэба?..” і “Абы было ціха!..”

Такім чынам, розніца менталітэтаў Кацапаў, Хахлоў і Бульбашоў сталася незваротнай, што канчаткова і вызначыла далейшыя гістарычныя лёсы гэтых народаў.

**Хто смяецца апошнім**

Старажытныя этнографы і псіхолагі аднадушна адзначалі абыякавае стаўленне Кацапаў, Хахлоў і Бульбашоў да ўласнае гістарычнае спадчыны. Прычына такой дзікай з'явы палягала навідавоку: мазгі братэрскіх народаў, атручаная самагонам, півам і брагай, не маглі ўтрымаць у памяці больш за тры пакалення продкаў.

Так з цягам часу нашчадкі сыноў *Homo Slavianikus*'а канчаткова заблыталіся, якому народу належыць прывілея першародства. Аднойчы

Кацапы, Хахлы і Бульбашы пастанавілі сабрацца разам, каб высветліць гэтае пытанне, а заадно – канчаткова правесці дэмаркацыйныя межы сувярэнных княстваў. Месцам сустрэчы князі абралі пракаветную пушчу ў раёне бульбашоўскіх Віскулёў. Спецыяльна для гэтага была збудавана дыпламатычная рэзыдэнцыя – так званы Камянецкі стоўп з чырвонае цэглы.

Кацапы дэлегавалі на братэрскі саміт князя Аляксандра, Хахлы – князя Данілу Галіцкага, а Бульбашы – полацкага князя Вячаслава Барысавіча, больш вядомага як князь Вячка.

Першыя тры дні, як і вядзецца на дыпламатычных сустрэчах, правадыры трох братэрскіх народаў прысвяцілі немудрагелістым забавам: пілі самагон, смажылі зубровыя тушы і спаборнічалі, хто далей пусціць стралу з вежавай байніцы. На чацверты дзень саміту князі дапіліся да белай гарачкі. У гонар гэтае падзеі вежу з чырвонае цэглы назвалі Белай, а пушчу ў раёне Віскулёў, дзе нашчадкі *Homo Slavianikus*'аў вырашылі канчаткова падзяліцца – Белавежскай.

Бульбашоўскі правадыр Вячка быў цверазейшы за ўсіх. І, як разумны палітык, вырашыў скарыстаць сітуацыю на сваю карысць. Стоячы на верхняй прыступцы вежавых сходаў, ён абвясціў:

-- *Ад прадзедаў спакон вякоў нам дасталася спадчына.* І спадчына гэтая належыць нам, бо Бульбашы – старэйшыя за астатніх братоў.

-- Чаму? – у адзін голас спыталіся Аляксандр і Даніла Галіцкі.

-- Таму што Хахлы і Кацапы дагэтуль плоцяць даніну вузкавокім Басурманам, а землі Бульбашоў вольныя і ўвесь час пашыраюцца.

У якасці сіметрычнага адказу князь Аляксандр урэзаў яму кулаком у скроню. За што і атрымаў трапную заўвагу -- у пераноссе.

-- *Утри носа своїй жінці!* – параіў кацапскаму княўю

Даніла Галіцкі і выдаў аргумент на карысць свайго народа: -- старэйшыя браты – гэта Хахлы, таму што Кіеў -- «*мать городов русских*»!

Аляксандр, Даніла Галіцкі і Вячаслаў Барысавіч спрачаліся наконт першародства мо да самое раніцы. Нарэшце, князі прыйшлі да разумнай высновы: праўдзівыя рыцары мусяць даводзіць слушнасць сваіх словаў не п'янымі бойкамі, а высакароднымі подзвігамі.

-- А што такое подзвіг? – зацікавіўся недасведчаны ў рыцарскіх кшталтах Кацап.

-- Подзвіг – гэта тое, што іншыя баяцца зрабіць! – патлумачыў шляхотны Даніла Галіцкі.

Браты часова замірыліся і раз'ехаліся па сваіх землях у пошуках рыцарскіх прыгодаў.

Бульбашоўскі князь думаў нядоўга. Усе ягоныя знаёмыя князі, герцагі, каралі і нават адзін імператар мелі вайскова-марскія базы. І толькі Полацкае княства не ведала такіх геапалітычных выгодаў. Вячаслаў Барысавіч склікаў дружыну і рушыў на Балтыку. Фрыцы-тэўтоны, якія панавалі на балтыйскім узбярэжжы, не чакалі ад Бульбашоў такога нахабства. Увесь вольны час яны бавілі ў бажніцах, браварах і бардэлях. З гэтае прычыны князь Вячка незаўважна дайшоў ажно да земляў Ліваў і Эстаў. Гэтыя землі і былі абвешчаны калоніямі Бульбашыі. Зляканыя Фрыцы пакідалі ружанцы, кухлі і дзевак. Неўзабаве тэўтонскае войска абклала Юр'еўскі замак, у якім зачыніўся было полацкі князь.

Вялікі Магістр, тагачасны фюрэр Фрыцаў, моцна баяўся розгаласу. Каб Рымскі Папа дазнаўся пра ягоную мілітарную бяздарнасць, дык разжалаваў бы яго ў шэраговыя ландскнехты і выслаў бы ў чарговую супрацьтэрарыстычную аперацыю супраць палестынскіх ісламістаў.

Правадыр Фрыцаў прапаноўваў Вячаславу Барысавічу што заўгодна: грошы, зброю, новыя землі, статкі коняў і прыгонных Ліваў. Але ўпарты палачанін патрабаваў аднаго: засведчыць свой рыцарскі подзвіг пергаментнай даведкай з пячаткай Вялікага Магістра. Натуральна, фюрэр адмовіўся канстатаваць паразу. Баючыся розгаласу і ганьбы, Вялікі Магістр шчыльна абклаў Юр'еўскі замак і дачакаўся, пакуль каланіяльная экспедыцыя сканае ад нястачы харчоў і пітва…

Даніла Галіцкі хутка скеміў, што рыцарскі подзвіг – гэта не абавязкова мілітарны трыумф. Тым больш, для перамогі над Басурманамі, якія на той час панавалі ў Хахляндыі, у яго відавочна не ставала моцы. Да таго ж, *навала з Усходу* пагражала нават захадэнскім землям: атрады вузкавокіх карнікаў штогод спусташалі Галічыну. З тае прычыны прадбачлівы Даніла зарганізаваў колькі дзесяткаў схованак для будучых дзеячоў супраціву, якія назваў *"криївками"*. Многія з іх натуральным чынам рэарганізаваліся ў гандэлкі, піўніцы і крамніцы. З цягам часу гэтыя карысныя паспалітыя ўстановы пашырыліся да памераў вёсак, мястэчак і нават гарадоў. Самая знакамітая *"криївка"*, слынны горад Львоў, і дагэтуль выклікае ў дзікіх азіяцкіх землях шалёную нянавісць да яе насельнікаў і натуральную зайздрасць да асартыменту…

Кацапскі князь Аляксандр, седзячы на печцы ў сваёй рэзыдэнцыі, некалькі гадоў жлукціў самагон і асэнсоўваў словы Данілы Галіцкага: "Подзвіг – гэта тое, што іншыя баяцца зрабіць!" Нарэшце ён склікаў наўгародскае веча і паставіў пытанне рубам:

-- Чаго больш за ўсё баяцца рыцары?

-- Дупу адмарозіць! – адказалі дасведчаныя наўгародцы, якія гандлявалі з Ганзейскім хаўрусам.

-- Чаму? – не зразумеў Аляксандр.

-- *Коротка кольчужка!*

Кацап неадкладна паехаў на бераг замерзлага Чудскога возера. Ён скінуў даматканыя парткі і пасвяціў дупай у бок ненавіснага Захаду.

У той самы час на другім беразе Чудскога возера дваццаць рыцараў-мніхаў з Тэўтонскага ордэну хрысцілі мясцовых дзікуноў: Чудзь і Эстаў. Голая дупа кацапскага князя, хаця і прыўнесла ў суворы абрад лацінскага хросту мастацкую разнастайнасць, але выклікала слушнае абурэнне каталіцкіх місіянераў.

-- *Гей, славяне*! – шалёна лямантаваў Александр, вымахваючы порткамі.

Вялікі Магістр ачмурэла глянуў на княскую дупу.

-- Прывядзіце сюды гэтага *гея*, – загадаў ён сваім Фрыцам.

*Подняв мечи из рурской стали*, конныя рыцары разам з чудзскімі і эстскімі неафітамі выйшлі на тонкі веснавы лёд. Не паспеў Вялікі Магістр агледзіцца, як ягоныя ваяры разам з конямі і свежанавернутымі ў лацінства дзікунамі сыйшлі пад воду…

Кацапскі князь Аляксандр да самое смерці хадзіў на бераг Чудскога возера і свяціў голай дупай, але болей не завабіў лацінскіх аматараў вытанчанага стрыптызу.

Аспрэчыць непаўторнасць ягонага рыцарскага подзвіга не было каму. З тых часоў гэты непераможны ваяр, які ўвайшоў у гісторыю як *Александр Невский*, і стаўся першым нацыянальным героем Кацапстану. Да самое смерці князь успамінаў белавежскую сустрэчу і смяяўся з будаўніка Данілы і ваяра Вячкі.

**Энэіда навыварат**

На поўнач ад бульбашоўскіх земляў жыло дзікае племя лясных людзей, якіх свядомыя Бульбашы называлі паміж сабой *мудзякамі.* Але ў летапісах, гуслярскіх спевах і пры малых дзецях да брыдкага слова цнатліва дадавалася літара «Ж».

Лясныя дзікуны не ведалі аніякіх здабыткаў сусветнае цывілізацыі – пісьменства, земляробства і нават вытворчасці самагону. Спіртовыя напоі летапісныя Жмудзякі куплялі ў Бульбашоў і Пшэкаў за неапрацаваны бурштын, які збіралі на беразе Балтыкі. У навакольных народаў жмудзяцкае племя лічылася абазнаным ў гадаванні вужакаў, гадзюкаў, жабаў ды іншых гадаў. Жмудзяцкія жрацы-паганцы песцілі племяных змяюкаў у адмысловых капішчах-серпінтарыях, ахвяравалі ім бурштын і ўпаляваную ў матэчных пушчах дзічыну, у тым ліку і хрысціянскіх місіянераў.

Сярод Жмудзякоў хлуслівым норавам і схільнасцю да махлярства вылучаўся малады лясны брат Міндоўг -- *парубок моторний, і хлопець хочь куди Жмудзяк.* Патрыярхальныя Жмудзякі моўчкі цярпелі ягоныя выбрыкі. Але чарговае хабёльства Міндоўга ўразіла нават непісьменных дзікуноў. Распусны юнак забіў племяную гадзюку, злупіў са змяюкі скуру і зрабіў з яе прэзырватыў шматразовага карыстання. Раз'юшаныя Жмудзякі выгналі блюзнера за межы сваіх земляў. Лясныя людзі меркавалі, што злачынца або зойдзецца з голаду, або патрапіць у палон да суседзяў – Фрыцаў з Тэўтонскага Ордэну, зноў жа на пэўную загібель.

Амаль так яно і здарылася. Ледзь жывога Міндоўга схапіў рыцарскі спецназ. Маладога Жмудзяка прывезлі да Вялікага Магістра. *Цвёрда трымаўся юнак на дапросе, таячы думкі і словы свае.* Пакуль, нарэшце, не скеміў падаць сябе хрысціянінам-дысідэнтам, пацярпелым за рэлігійныя перакананні ад паганцаў-ідалапаклоннікаў. Даверлівыя Фрыцы накіравалі палоннага ў сакрэтную Кёнігсбергскую спецшколу вывучаць Катэхізу, гісторыю і Статут рыцарскай службы.

Міндоўг, сын лясоў і балотаў, адразу пачаў дурыць мніхаў-настаўнікаў. Стыпендыю, што прызначылі яму Фрыцы, ён выдаваў на піва і дзевак, і нават прадаваў тэўтонскія вайсковыя распрацоўкі Пшэкам – шпегунам з Мазавецкага княства. Адзіны спецкурс, які Жмудзяк здолеў збольшага запомніць, была старажытнарымская гісторыя.

Неўзабаве Вялікі Магістр высветліў, што ордэнскія грошы сыходзяць у жыдоўскія шынкі і пшэцкія бардэлі, а плёну ад спецшколы няма. Ніводзін навучэнец не вытрымаў іспытаў на місіянера. Раз'юшаны фюрэр Фрыцаў загадаў сфармаваць з самых хлуслівых, амаральных і распусных курсантаў дыверсійна-місіянерскую групу, на чале якой паставіў падступнага Міндоўга. Перад місіянерамі была пастаўлена задача: навярнуць навакольныя народы ў лацінства. Для легалізацыі місіянераў мніхі-аналітыкі распрацавалі легенду, паводле якой Міндоўг нібыта быў рымскім цэнтурыёнам, які разам з ацалелымі легіянерамі ўцёк з Рыму пасля захопу яго барбарамі, не раўнуючы, як Энэй з-пад Троі. Дэсантаванне групы з боку Балтыкі ўсё ж адкладалася; ніхто з дурнаватых курсантаў спецшколы так і не здолеў навучыцца лаціне. Мніхі-настаўнікі палічылі, што для невукаў-паганцаў сыйдзе і спрошчаны варыянт: да ўсіх словаў было рэкамендавана дадаваць лацінскія канчаткі «as» і «us». Так Міндоўг зрабіўся Міндоўгасам, а Нёман, да вусця якога прыплылі дыверсанты-місіянеры, стаў Нямунасам.

Наіўных Жмудзякоў надзвычай уразіў рыштунак гасцей: бліскучыя латы, вырабленыя паводле старажытнарымскіх узораў, залаты лаўровы вянок на галаве Міндоўгаса і, асабліва –- «лацінская» мова новых рымлянаў.

Перспектыва займець князем праўдзівага цэнтурыёна спакусіла непісьменных Жмудзякоў. Каранацыя мелася адбыцца на галоўным капішчы-серпінтарыі. Але падчас урачыстасцяў здарылася прыкрая неспадзяванка: галоўны жрэц-змеягадоўца пазнаў у «рымскім цэнтурыёне» таго самага юнака-махляра, якога выгналі з краіны за блюзнерства над свяшчэнным гадам. Раз'юшаны натоўп паганцаў ледзь не пазабіваў фрыцаўскіх дыверсантаў. Але на шчасце Міндоўгаса, тэўтонская сталь аказалася мацнейшай за доўбні і дрыны, выдраныя з агароджы капішча-серпентарыя.

Ацалелая група місіянераў, згодна тэўтонскай інструкцыі, падзялілася на тры брыгады. Гэтыя брыгады і накіраваліся ў розныя бакі – у адпаведнасці са старой легендай і місіянерскім заданнем.

Першая рушыла на Ўсход, да Кацапстану. Зрэшты, Кацапы аказаліся яшчэ большымі дзікунамі за Жмудзякоў. Нашчадкі старэйшага *Homo Slavianikus'*а ніколі не чулі ані пра Рым, ані пра цэнтурыёнаў, ані пра лаціну. З усёй прапаганды тэўтонскіх місіянераў Кацапы зразумелі няшмат: «маткас», «яйкас», «салас», і «шнапс-самагонас». Ані «яйкас», ані «салас» качэўнікі не знайшлі, затое «самагонаса», як заўсёды, было да халеры. Звыклыя да светлага тэўтонскага піва, лацінскія місіянеры не вытрымалі мясцовай дозы і мацунку. Ніхто з іх не дажыў да наступнае раніцы.

Другая брыгада выправіўся да Хахлоў. Але адукаваныя грэцкія папы з Кіева-Пячорскае лаўры адразу выкрылі падман, бо ведалі лаціну нават лепш за мніхаў Тэўтонскага Ордэна. Фрыцаўскіх дыверсантаў неадкладна прадалі крымскім Генуэзцам, няволнікамі на галеры.

Трэцяя брыгада ашуканцаў на чале з прайдзісветам Міндоўгасам рушыла па Нёмане-Нямунасе і нарэшце прыйшла ў тагачасную сталіцу Бульбашыі – слынны горад Навагрудак. Махлярам пашэнціла – на той час у Навагрудку памёр стары князь, і народ мусіў абраць новага правадыра. Перадвыбарчыя праграмы ўсіх тутэйшых кандыдатаў не ўключалі абяцанак сусветнага панавання. З гэтае прычыны нашчадкі малодшага *Homo Slavianikus'*а адразу купіліся на імперскую прапаганду «рымскага цэнтурыёна». Міндоўгас абяцаў стварыць Вялікую Бульбашыю ад мора да мора, аднавіць парваныя басурманскім нашэсцем эканамічныя сувязі Варагаў з Грэкамі і нават далучыць Бульбашоў да антытэрарыстычнай кааліцыі з мэтай вызвалення Іерусаліму.

Сталіцай будучай сусветнай імперыі быў абраны Навагрудак, пераназваны на Навагрудакас. Расчулены Папа Рымскі прыслаў Міндоўгасу каралеўскую карону і святароў для лацінскага хросту Бульбашыі.

Але махлярская натура наваспечанага караля неўзабаве далася ў знакі. Міндоўгас перабіў папскіх легатаў, выгнаў пасланцоў Тэўтонскага Ордэну, выракся хросту і нават лацінскага канчатку «as». Але каралеўскі тытул і спрэзентаваную карону ён, натуральна, пакінуў сабе.

Пакрыўджаныя Фрыцы некалькі разоў абкладалі Навагрудак, але кожным разам цярпелі паразкі і адыходзілі. *Сцяг брыгады* прайдзісвета Міндоўга нахабна і ганарліва лунаў над вежамі Навагрудскага замку. Праз некалькі гадоў бульбашоўскага караля забіў кілер, паравербаваны паплечнік з былой місіянерска-дыверсійнай групы. Але Бульбашы адразу абралі князем Лютвара, яшчэ большага вялікадзяржаўніка, чым Міндоўг.

Імперская ідэя, якую прыхадзень падкінуў тутэйшаму люду, атруціла цнатлівую свядомасць нашчадкаў малодшага *Homo Slavianikus'*а на шмат стагоддзяў наперад. Канцэпцыя бульбашоўскай вялікадзяржаўнасці перадвызначыла і Залаты Век, і пазнейшы заняпад краіны.

**Мужыцкая праўда**

Праз пэўны час у галовах Кацапаў, Хахлоў і Бульбашоў завіравала адна і тая ж думка. Кожнаму з трох братэрскіх народаў закрэнціла сфармуляваць уласную нацыянальную ідэю...

У змрочныя часы сярэднявечча нашчадкі *Homo Slavianikus'аў* былі далёкія ад прынцыпаў фемінізму. Рэй трымалі адно мужыкі, якія не лічылі за людзей не толькі сваіх маці, жонак і сёстраў, але і нават каханак. Менавіта таму несфармуляваную яшчэ нацыянальную ідэю назвалі *Мужыцкай праўдай*.

Розніца братэрскіх менталітэтаў адразу ж далася ў знакі...

Кацапская нацыянальная ідэя была агульнавядомай яшчэ з эпохі старэйшага *Homo Slavianikus*'а. Укладалася яна ўсяго ў адно слова: «погром». Але ажыццяўляць пагромы на практыцы выпадала далёка не заўсёды. На той час Кацапстан па-ранейшаму ўваходзіў у адну Саюзную дзяржаву з Басурманіяй, складаючы, між іншым, усяго тры адсоткі ад яе плошчы. Ладзіць пагромы на такой агромістай тэрыторыі было фізічна немагчыма. Да таго ж, паразумнелыя басурмане імкнуліся хоць неяк змягчыць неасэнсаваную брутальнасць малодшых хаўруснікаў. Дзеля гэтага дасведчаны хан сфармаваў цэлы штаб Стратэгічных даследванняў, куды набраў самых прасунутых паліттэхнолагаў: юродзівых, блажэнных, беснаватых і скамарохаў. Гэтыя PR-спецыялісты і прапанавалі нашчадкам старэйшага *Homo Slavianikus*'а немудрагелістую ўстаноўку пра адвечную гістарычную тоеснасць двух вялікіх азіяцкіх народаў, Кацапаў і Басурманаў. Яны ж выпрацавалі і канцэпцыю развіцця Саюзнае дзяржавы, якая прадугледжвала суцэльную басурманізацыю Кацапстану, пералік большасці падаткаў у Залатаардынскі федэральны бюджэт і стварэнне мілітарнага блоку на чале з ханам.

Але сярод Кацапаў знайшлася жменька сепаратыстаў-адшчапенцаў на чале з маскоўскім князем Дзмітрыем Іванавічам, які з ласкі Хана намеснічаў у Маскоўскім федэральным улусе Залатой Арды.

-- Нашто нам Саюз з жабрацкай і нязменна агрэсіўнай Басурманіяй? -- аднойчы запытаўся ён і на вачах ханскіх пасланцоў парваў Саюзную дамову, якая на той момант называлася «Залаты ярлык».

Басурманскі Хан справядліва раз'юшыўся і прыгразіў сепаратысту супрацьтэрарыстычнай аперацыяй. Але гэта не напалохала адшчапенца. Тым больш, спалучэнне кацапскай нацыянальнай ідэі і сепаратызму ўжо дало хуткі і жудасны плён. Пазаконныя фармаванні маскоўскіх латнікаў-баевікоў адразу пачалі рабіць замахі на басурманскую федэральную адміністрацыю, ладзіць тэрарыстычныя акты, браць закладнікаў і капаць на стратэгічных гандлёвых шляхах воўчыя ямы. Канфлікт пагражаў выбухнуць са дня на дзень...

Тагачасныя Хахлы, у адрозненне ад Кацапаў, не вызначаліся прыроднай брутальнасцю і схільнасцю да ўтварэння геапалітычных саюзаў. Хахляцкія мужыкі знайшлі сваю праўду ў няхітрым спалучэнні трох рэчаў: чаркі, шкваркі і застольных спеваў з кумаўямі. Але ж

хахляцкія жонкі -- *Баби Галамаги*, *Конотопські відьми* ды іншыя *Солохі*, -- аказаліся значна агрэсіўнейшымі за сваіх мужыкоў. Мужыцкая праўда Хахлоў відавочна не прыйшлася ім даспадобы. Яны прыгразілі ўвесці сухі закон ці не ў кожным *садку зеленим біля хати*. Пагроза так напалохала хахляцкіх мужыкоў, што амаль усе яны збеглі за дняпроўскія парогі, на выспу Хорціца.

Гэтая райская выспа здавён славілася шынком, які належыў заможнаму жыду Гіршу Гетману. Спярша гасцінны шынкар наліваў хахляцкім мужыкам у крэдыт. Калі пазыка дасягнула крытычнай рысы, Гетман зразумеў, што чакаць грошай ад галадранцаў не выпадае. Не ведаючы, як спагнаць пазыкі, ён запатрабаваў прызнаць яго старшынства. Хахляцкія мужыкі ўжо некалькі тыдняў пакутвалі з пахмелля. За чарку і шкварку яны былі гатовыя прызнаць шынкара кім заўгодна -- хоць князем, хоць мітрапалітам.

-- Не, -- сказаў Гірша, -- я лепш так і застануся Гетманам.

Такім чынам запарожскага Жыда абралі Найгалоўным Хахлом. Сімвалам Гетманскай улады стала пустая пляшка з-пад віна *"Перлина степу"*, якую назвалі Гетманскай Булавой. Але гэтыя дэмакратычныя выбары не ўратавалі Хахлоў ад вяртання пазыкаў. Бо існавала не толькі Мужыцкая, але і Шынкарская праўда: за чарку і шкварку трэба плаціць. Гірша Гетман, абраны Найгалоўным Хахлом, быў вымушаны выпраўляць рабаўнічыя экспедыцыі ва ўсе часткі свету. Вайсковая здабыча спраўна прапівалася ў Гетманскім шынку. Так хахляцкая нацыянальная ідэя паступова аформілася ў замкнёную эканамічныю формулу: шынок-пазыкі-рабаўніцтва-шынок.

Хахлы здавён празывалі сваіх дурных жонак козамі. Тыя, у сваю чаргу, лаялі алкаголікаў-мужыкоў казлакамі. З цягам часу літара «л» кудысь знікла. Так хахлы Гіршы Гетамна з выспы Хорціца назаўсёды сталіся казакамі. Неўзабаве яны нават утварылі ўнікальную дзяржаву – Запарожскую Сеч. Першыя грамадзяне Сечы амаль не займаліся грамадска-карыснымі справамі, а пераважна рабавалі і пілі, пілі і рабавалі. Але ж, з цягам часу, Хахлы цывілізаваліся і навярнуліся да заходніх кшталтаў...

Нашчадкі малодшага *Homo Slavianikus'a*, як і варта было чакаць, выявіліся дурнейшымі з ўсіх братоў. Бульбашы аказаліся нязданымі вынайсці нават уласную *Мужыцкую праўду*. З гэтае прычыны яны вырашылі шукаць яе па той бок захаду над балотам -- на Захадзе. Аўтарам лозунгу *«Бульбашыю - у Еўропу»* стаў мясцовы князь Андрэй. Каб цывілізаваныя еўрапейскія манархі не абвінавацілі яго ў кампраметарных сувязях з братамі-дзікунамі, ён ва ўсіх дакументах падпісваўся Альгердам, а народ свой пераназваў у Ліцьвіны.

Напачатку ўсё складалася някепска. Ліцьвінскія амбасадары былі прынятыя пры дварах усіх хрысціянскіх манархаў. Але неўзабаве Папа Рымскі паставіў Альгерду ўмову: Бульбашыя-Літва будзе прызнаная цывілізаванай краінай, калі, нарэшце, пазбавіць свет ад хахляцкіх алкаголікаў-рабаўнікоў і кацапскіх тэрарыстаў-сепаратыстаў.

Колькі не тлумачыў Альгерд старэйшым братам пра шкоднасць алкаголю і тэрактаў, але ягоныя словы не знайшлі паразумення. Нарэшце, ліцьвінскі князь уцяміў: пераканаць братоў па-добраму не выпадае. Каб выканаць папскі загад, ён нават быў змушаны пайсці на хаўрус з паганцамі-Басурманамі. Неўзабаве мабільныя брыгады ліцьвінскага рыцарскага спецназу рушылі на Маскву і тройчы палілі яе на попел. Спецатрады хуткага рэагавання штогод нішчылі бутлегерскія сеткі гетманскіх бравароў і шынкоў па ўсёй Хахляндыі.

Але ўсё было дарэмна; алкагалізм і тэрарызм аказаліся нязводнымі…

Вялікі князь Альгерд памёр ад роспачы, бо зразумеў, што ўцягнуў сваю зямлю ў вечную барацьбу з суседзямі.

Праз тры гады пасля ягонай смерці пазаконныя групоўкі маскоўскіх баявікоў выправілася ў паход на Басурманскіх федэралаў кудысь пад угра-фінскую Тулу. Маскоўскія тэрарысты, якія выбраліся *к черту на кулички,* потым расказвалі, што доўга нудзіліся на нейкім *Куликовом поле,* па якім нібыта гойсалі пахмельныя валацужныя мніхі-вершнікі Перасвет і Аслябя, палохаючы шалёным лямантам цывілізаваных і непітушчых Басурманаў. Вузкавокае войска па хуткім часе зьякалася дзікуноў, здрадзіла свайму хану і перайшло пад харугвы Дзмітрыя. Ад Басурманаў гэты князь і пераняў іхнюю найгалоўную дактрыну: *"идти до последнего моря".* Дзікае спалучэнне гэтага прынцыпу з кацапскай нацыянальнай ідэяй -- пагромамі, навечна апанавала свядомасць спадкаемцаў старэйшага брата. З тых часоў Кацапстан канчаткова ператварыўся ў рассаднік міжнароднай агрэсіі.

Такім чынам, аніводная з трох *Мужыцкіх праўдаў* не стала карыснай для нашчадкаў *Homo Slavianikus*'a. А разбуральная ідэя вялікакацапскай выключнасці справакавала крывавыя войны з малодшымі братамі…

**У нас все равны!**

За часамі вялікага князя Вітаўта Бульбашыя канчаткова аформілася ў еўрапейскую супердзяржаву. Прычынай гэтага сталася не толькі традыцыйнае бульбашоўскае працалюбства, але і разумная сацыяльная палітыка, якую праводзіў тагачасны дзяржаўны кіраўнік.

Балотныя людзі жылі на вельмі падобных выспах, дзе ўсе аднолькава добра працавалі, бо выжыць на дрыгве ў іншы спосаб было проста немагчыма. Пасля працы ўсе выпівалі пароўну і сінхронна валіліся. Стандартныя кілішкі, нязменныя краявіды, нават адвечныя песні жабаў – усё стала прычынай паталагічнай бульбашоўскай любові да ўсеагульнай роўнасці, якую на выспах яшчэ называлі "парадкам". Нават іншаземцы, якія раз-пораз сяліліся ў Бульбашыі, вельмі хутка прасякаліся тамтэйшым менталітэтам -- іх рэгулярна кусалі балотныя паразіты, якія разам з бульбашоўскай крывёю пераносілі і ідэалогію роўнасці.

Вялікі князь вельмі ўдала скарыстаў гэтую нацыянальную прыхільнасць падданых. Роўнымі між сабой былі абвешчаны усе народы Вялікага княства: Бульбашы з Жыдамі, Хахлы з Басурманамі, Пшэкі з Цыганамі. Праўда, большасць земляў Жмудзякоў гэты слынны ўладар перадаў Фрыцам, бо разумеў, што ад лясных людзей карысці ў гаспадарцы няшмат. Пэўна, з тае прычыны жмудзяцкія нашчадкі і ўважаюць Вітаўта сваім нацыянальным героям, да таго ж, бессаромна пераназваўшы яго на *Vytautas*'a.

Моцны гаспадарнік, Вітаўт дбаў і пра сацыяльную справядлівасць. Усе былі пры справе. Сяляне дбайна аралі зямлю, гарантавана пакідаючы сабе за гэта большую частку ўраджаю. Жыды сумленна гандлявалі, маючы пры гэтым такія ж правы, як і хрысціяне. Вайскоўцы мужна *баранілі родны парог,* і па выхадзе ў адстаўку кожнаму ветэрану надавалася шляхецкая годнасць і кавалак зямлі, якую, зрэшты, трэ' было апрацоўваць.

Гэтая палітыка дала надзіва станоўчы плён. Насельнікі Вялікага княства нарэшце зразумелі, што Бульбаш – гэта гучыць годна і выглядае прыгожа, што ў балотным жыцці ёсць месца для міфаў, метафар і нават цудаў.

Міжнародныя поспехі новай супердзяржавы сталіся проста неверагоднымі; балотныя людзі па праве займелі *свой пачэсны пасад між народамі.* Бульбашоўскія ваяры штогод стала перамагалі ва ўсіх еўрапейскіх рыцарскіх турнірах, бульбашоўскія камерсанты інвеставалі грошы ў найпрыбытковыя суседзскія бізнэсы, бульбашоўскія дыпламаты круцілі шматлікімі басурманскімі ханамі-марыянеткамі. Самога Вітаўта нават запрасілі стаць каралём Чэхіі, але манарх-патрыёт катэгарычна адмовіўся ад зманлівай прапановы.

Рэакцыя міжнароднай супольнасці на поспехі Бульбашыі сталася неадназначнай.

Большасць Хахлоў дагэтуль пакутвала пад басурманскім прыгнётам і з надзеяй паглядала на поўнач. Чарнігаўскія, пераяслаўскія і валынскія князькі штогод прысылалі Вітаўту гурты племянных кабанчыкаў і бочкі з элітнай гарэлкай, просячы даць рады. Натуральна, Бульбашоўскі ўладар шчыра абяцаў вызваліць спадкаемцаў сярэдняга *Homo Slavianikus*'а ад вузкавокіх прыгнятальнікаў. Кожны ліст да чарнігаўцаў, пераяслаўцаў і валынянаў традыцыйна канчаўся словамі *ще вам, браття молодії, усміхнеться доля!..*

Раз-пораз аршанскія абрусы, берасцейскі трыкатаж і гомельскія шпалеры траплялі і ў Кацапстан. Але качэўнікі абсалютна не ведалі прызначэнне гэтых рэчаў і таму з агідай адкідалі непатрэбшчыну.

Неўзабаве жменька качавой інтэлігенцыі таемна звязалася з Вітаўтам з просьбай навярнуць супляменнікаў да аседлага земляробства. Талерантны і памяркоўны Бульбаш неадкладна выправіў у Кацапстан праўдзівы Крыжовы паход, але незвычайны. На ўсход вырушыў гуманітарны канвой, наладаваны косамі-літоўкамі, рыдлёўкамі, капанцамі ды іншым сельскагаспадарчым рыштункам.

У цэнтры Маскоўскага федэральнага ўлуса бульбашоўскую экспедыцыю перанялі некалькі вершнікаў; гэта былі халопы з дворні кацапскага князя. Дазнаўшыся пра мэты візіту, вершнікі запэўнілі, што яны, маўляў, “дваране”, і з тае прычыны працаваць не збіраюцца.

-- *У нас нет дворян, у нас все равны!* – знізаў плячыма адэпт сацыяльнай роўнасці і ўласнаручна ўзяўся раскладаць на зямлі прывезены спшэнт.

З усіх прыстасаванняў нашчадкі старэйшага *Homo Slavianikus*'а ўпадабалі толькі сярпы з малаткамі. Неўзабаве Вітаўт дазнаўся, што масквічы выкарыстоўваюць рыштунак не па прызначэнні: сярпамі яны рэжуць геніталіі, а малаткамі дзяўбуць па галовах.

Але часу на новы Крыжовы паход у Вітаўта не было: на заходняй мяжы Вялікага княства нечакана актывізаваўся агрэсіўны Тэўтонскі блок. Не маючы фармальнай нагоды для абвяшчэння вайны, тагачасны фюрэр пайшоў на гнюсную правакацыю. Фрыцаўская зондэркаманда адлавіла ў памежным гушчары лясного чалавека з жмудзяцкага племені. Бяскрыўднага небараку пасадзілі ў жалезную клетку і павезлі ў Ватыкан, дзе падчас аўдыенцыі ў папскім палацы зладзілі адмысловую інсталяцыю.

Пантыфік вельмі прыхільна ставіўся да Вітаўта. Але ж падступныя Фрыцы ведалі, як здэскрэдытаваць бульбашоўскага лідара. Ціхамірны жмудзяк лыпнуў на Папу рахманымі вачыма і ветліва прывітаўся:

-- *Labas vakaras!*

Перакладчык-тэўтон неадкладна схлусіў:

-- Гэты паганы Лабус выказаў жаданне паставіць ракам Вас, Ваша Святейшаства!

Папа зніякавеў, і гнюсныя Фрыцы навыперадкі кінуліся даводзіць, што такі вось пушчанскі дзікун і ёсць тыповым прадстаўніком Бульбашоўскай дзяржавы. Падмануты Паныфік шчыра жахнуўся і неадкладна блаславіў тэўтонаў на вайну з Вялікім Княствам.

У грандыёзнай Грунвальдскай бітве закаваныя ў жалеза рыцары былі бязлітасна знішчаныя аб'яднанымі сіламі Бульбашоў, Пшэкаў, Хахлоў і нават Жмудзякоў. На ўзорна-паказальны закалот у якасці ганаровага госця быў запрошаны хан Тахтамыш. Адразу з Грунвальдскага поля ўражаны Басурманін паспяшаўся ў Кіеў. Там ён сабраў вузкавокіх паплечнікаў і сумленна расказаў пра ўбачанае. Паганцы настолькі напалохаліся непераможнага Бульбаша, што неадкладна кінулі прыгнятаць хахляцкіх земляробаў. Улада над краем натуральна перайшла да Вітаўта; самі ж Басурмане пабеглі ў родныя азіяцкія стэпы.

Па дарозе на ўсход Тахтамыш мімаходзь спаліў на попел Маскву, бо разумеў лепш за іншых: і гарады, і гаспадарчы рыштунак праўдзівым качэўнікам без дай патрэбы.

**Ладдзя роспачы**

На паўночным захадзе ад Маскоўскага федэральнага ўлусу жылі вольныя людзі. Хаця яны і з'яўляліся аддаленым адгалінаваннем роду старэйшага *Homo Slavianikus*'а, але ж ніколі не мяшаліся з вузкавокімі прыхаднямі. Уплыў свежых балтыйскіх ветраў спрыяў дэмакратычным поглядам і здароваму прадпрымальніцтву; вольныя людзі заснавалі дэмакратычныя рэспублікі Ноўгарад і Пскоў.

Наўгародцы і пскавічы першымі са старэйшых *Homo Slavianikus*'аў даўмеліся, што рамёствы і гандль куды больш карысныя за качэўніцтва і пагромніцтва. Тамтэйшыя бізнэсоўцы распаўсюджвалі біржавыя каціроўкі на бяростах, вечаровым звонам абвяшчалі курсы замежных валютаў і нават ладзілі драўляныя трубаправоды. Сумленны бізнэс вымагаў прагрэсіўнай палітычнай мадэлі, і таму гарады-рэспублікі запрашалі князёў з Бульбашыі, Хахляндыі і Скандынавіі. Пры гэтым княская улада моцна абмяжоўвалася Статутам працоўнай дамовы і народным сходам.

Як і мае быць, насельнікі астатняга Кацапстану люта ненавідзелі паўночна-заходніх рэспубліканцаў за багацце, еўрапейскія погляды, любоў да гігіены і асабліва – за схільнасць да дэмакратыі. У калматых галовах качэўнікаў ніяк не ўкладалася, як гэта можна запрашаць уладара на кантракт, а не па-халопску лізаць лапці чарговаму манарху-пераемніку. Гэтая ідэалагічная супярэчнасць дала нечаканы плён: заможныя і разумныя рэспубліканцы хутка скемілі, што называцца "Кацапам" у цывілізаваным свеце не толькі сорамна, але і эканамічна немэтазгодна. З тае прычыны яны сталі самаідэнтыфікавацца, як "Наўгародцы" і "Пскавічы".

Заможны камерсант Садко меў бізнэсовыя інтарэсы ці не па ўсім балтыйскім узбярэжжы. Пры гэтым разумны наўгародзец прынцыпова не вёў справаў з качавымі Кацапамі, бо быў абазнаны пра іх любоў да падману, карупцыі і крадзяжоў.

Неяк гандлёвыя агенты паведамілі Садко: браты-Бульбашы з паўднёвых балотных выспаў моцна церпяць з прычыны гаркоты і

брутальнасці тамтэйшых трункаў. Прадпрымальны наўгародзец неадкладна наладаваў сваю ладдзю каланіяльнымі спецыямі і праз валокі выправіўся ў Бульбашыю.

Мацунак балотнага самагону надзвычай ўразіў гандлёвага госця, але ж сівушны смурод і паскудны колер відавочна не адпавядаў еўрапейскім стандартам. Шляхам эксперыментаў са спецыямі і балотнымі травамі Садко выйнашаў шляхотны напой, які мясцовыя жыхары назвалі “Белавежскім”. Атрыманыя грошы разумны наўгародзец прадбачліва інвеставаў у бульбашоўскія вінакурні, а сам выправіўся на поўдзень.

Хахляцкая гарэлка аказалася куды больш брутальнай за бульбашоўскую. Спрактыкаваны Садко кінуў у вадкаць самы пякучы перац; у выніку новы гатунак “Міцна з перцем” ацанілі нават самыя пераборлівыя гурманы з Хортыцы.

Тым часам гандлёвыя агенты паведамілі наўгародцу, што качавыя Кацапы нібыта навярнуліся да аседлага ладу жыцця і таксама прагнуць далучыцца да праўдзівай культуры ўжывання алкаголю. Хаця інфармацыя і выдавала на падазроную, наўгародзец вырашыў рызыкнуць і скіраваў ладдзю на паўночны ўсход.

Але непасрэдна за мяжой цывілізаванага свету яго чакала прыкрая неспадзяванка. На засмечаным беразе Масквы-ракі ладдзю ўжо сустракаў натоўп тубыльцаў з дрынамі, нагайкамі і сякерамі, што відавочна не сведчыла пра іх міралюбнасць.

-- Што вылупіўся? – прывітаў госця маладзён у ватніку і кірзачах. – Ты хто ваабшчэ па жызні?

-- Бізнесмен з Гаспадзіна Вялікага Ноўгарада, -- са стрыманай годнасцю адказаў Садко.

-- А я, блянах, маскоўскі князь, гаспадар свету і наваколля! – назваўся правадыр тубыльцаў. -- Ёсць што па мелачы?

Садко загадаў весьлярам неадкладна паварочваць на Захад, але ўжо было запозна: натоўп тубыльцаў кінуўся ў раку і гронкамі абляпіў палубу. Гандлёвае судна пад наўгародскім сцягам неадкладна ператварылася ў сапраўдную *ладдзю роспачы*. Пад цяжарам пахмельных маскоўцаў яна чарпанула вады і неўзабаве патанула.

Так Садко апынуўся на дне. Але ж, як казалі ўпаляваныя Кацапамі русалкі, прадпрымальны наўгародзец і тамака зарганізаваў нейкі прыбытковы бізнэс...

Як бы то ні было, але менавіта з тых часоў ліберальны бізнэс-клімат у Кацапстане можа існаваць адно пад вадой.

**Редкая птица**

Тым часам спарахнелая Бізантыйская імперыя, што самаабвесцілася “Другім Рымам”, кацілася да лагічнага скону. Імперыя выжывала адно дзякуючы папулярнаму тагачаснаму энэрганосьбіту, так званаму “грэцкаму агню”. У краіне панавалі суцэльная карупцыя, азіяцкае гультайства і вычварная разбэста. Імператар, ягоныя дэспаты і нават сам Патрыярх захраслі ў пыхлівай раскошы. Нацыянальнай адметнасцю канстанцінопальскай палітычнай эліты была шалёная нянавісць да заходняга хрысціянства, заходняга ладу жыцця і еўраатлантычных каштоўнасцяў. Пры гэтым канстанцінопальскія VIPы аддавалі перавагу выключна міланскай зброі, фларэнтыйскім габеленам і бургундскаму віну, бо бізантыйскае людства традыцыйна ненавідзела

працу і колькі стагоддзяў было ўжо няздатнае да стварэння нават аддаленых аналагаў.

Сярод шматлікіх патрыяршых наложніц, імперскіх еўнухаў, іпадромных заафілаў і заафілічак неспатольнай прагай да распусты вызначалася пляменніца імператара Канстанціна, клышаногая Сафія Фамінічна Палеалог. Нават увесь корпус імперскай гвардзіі разам са сваімі жарабцамі не маглі спатоліць яе сэксуальных вымаганняў ды садаміцкіх фантазій. Пасля ночы з Фамінічнай у гвардзейцаў не заставалася моцы нават узняць чарку, не кажучы ўжо пра шаблі. І таму ісламісты-чучмэкі, якія прыйшлі з Сярэдняй Азіі, захапілі сталіцу "Другога Рыму" без вялікіх намаганняў. Неўзабаве Сафія Фамінічна пераканалася, што прыхадні вызначаюцца прастатой нораваў, немудрагелістым побытам і не маюць ахвоты да навучання распусце.

Незадаволеная чучмэкамі Сафія ўцякла спярша да таты – суворага дэспата ў Грэцыю, а адтуль морам на ненавісны Захад, у Першы Рым, дзе атабарылася ў рэзідэнцыі Пантыфіка. Звыклы да ўсяго папскі двор з жахам назіраў за растленнем біскупаў, спакушэннем хлопчыкаў-міністрантаў і гвалтаваннем папскіх гвардзейцаў. А таму на пазачарговым паседжанні кансісторыі паўстала натуральнае пытанне -- як пазбыцца высокароднай вычварэнкі? Айцы царквы прапаноўвалі і пацiху ўтапіць Фамінічну ў антычнай клаацы, і скінуць з Тарпейскай скалы, і нават падсунуць ёй у спачывальню атручаны фалаімітатар з маржовага біўня... Перамагла, аднак, больш гуманістычная прапанова кардынала Бісарыёна: выдаць Сафію замуж куды падалей -- у адну з краінаў "трэцяга свету". Неўзабаве папскае пасольства са шчодрым пасагам выправілася на Ўсход.

Першай краінай, прыдатнай для задуманага, сталася Бульбашыя. Як толькі Сафія з'явілася ў замку тамтэйшага князя Казіміра, то адразу ж пачала неабачліва дакляраваць нянавісць да Захаду і еўрапейскай цноты:

-- Еўропа мяне не задавальняе!

-- А ў нас тут акурат цэнтр Еўропы, -- знізаў плячыма Казімір і загадаў выгнаць клышаногую Фамінічну.

Тады знерваваны кардынал Бісарыён, які штоноч адбіваўся ад нахабнай распусніцы, скіраваў на поўдзень – да Кіева, дзе ў той час намеснічаў бульбашоўскі князь Гаштольд. Ягоныя пунктуальнасць і любоў да парадку пакуль што стрымлівалі прыродны хахляцкі анархізм. Але з'яўленне Сафіі адразу ўнесла ў кіраванне Хахляндыяй суцэльны хаос.

Бізантыйка неадкладна раскінула на кіеўскім Майдане вялікі намёт-бардэль з дынастычным сымболем Палеалогаў – дзьвюхгаловым арлом. Цэлыя натоўпы Хахлоў збіраліся на Майдане, каб падзівіцца на птушку-мутанта.

-- *Редкая птица долетит до середины Днепра!* – быў агульны прысуд.

Тым часам Фамінішна, абазнаная ў імперскай арнітАлогіі, спакваля пачала навучаць нашчадкаў сярэдняга *Homo Slavianikus*'а ўсялякай бізантыйшчыне. На намёце-бардэлі, акурат пад дзіўнай птушкай, яна расцягнула рэкламны банер: *"В цій хаті своя правда й сила, і воля!.."* Кардынал Бісарыён спрабаваў было пратэставаць, але па мясцовай завядзёнцы яго накармілі і напаілі так, што ён колькі дзён не мог выбрацца з-за стала.

Бізантыйская разбэста пакрысе захоплівала цнатлівых Хахлоў. Ці не ва ўсіх шынках і корчмах сляпыя бандурысты спявалі модны хіт: *«На*

*Майдані коло церкви революція іде...»* І ўсе разумелі, што размова вядзецца пра рэвалюцыю сэксуальную.

Тыя Хахлы, якія ўпадабалі бізантыйскую распусту, атабарыліся пераважна на левабярэжжы Дняпра. Яны і дагэтуль сантыментальна паглядаюць на Ўсход і, пабачыўшы дзьвюхгаловага мутанта, пажадліва чухаюцца. Тыя, хто не паддаўся азіяцкаму вычварэнству, жывуць збольшага на правым беразе. Яны паважаюць цноту, захоўваюць ідэнтычнасць і разумеюць сваю тоеснасць з цывілізаванай Еўропай.

Невядома, чым скончылася б тагачасная рэвалюцыя на Майдане, але ад чарговай "руіны" Хахляндыю, як і мае быць, ўратавалі тамтэйшыя жанчыны. Яны з рагачамі і патаўпешкамі ў руках абклалі намётавы бардэль, разагналі сваіх мужыкоў па хатах і выцягнулі за валасы клышаногую. Пасля чаго выкачалі яе у свіным смальцы і курыных пёрках, ды скацілі з Уладзімірскага ўзвозу.

Кардыналу Бісарыёну засталося адно – кіравацца на Ўсход.

Кацацапстанам на той час уладарыў пыхлівы князь Іван Вялікі. Тоеснасць поглядаў бізантыйскіх і кацапскіх азіятаў неадкладна дала плён. Нянавісць да працы, любоў да хлусні і паталагічная пагарда да ўсяго заходняга (апроч тамтэйшых выгодаў жыцця), адразу ж зблізіла распусную Фамінічну і змрочнага Івана. Так *редкая птица* і атабарылася на Ўсходзе, дзе яшчэ доўга палохала сваім выглядам цывілізаваныя народы.

**Маладыя гады, маладыя жаданні…**

А на тагачасным Захадзе адбываліся незваротныя культурніцкія змены. Штогод еўрапейскія манархі выпраўлялі ў адкрытае мора цэлыя эскадры спісаных каравэлаў, бітма набітыя рыцарамі-рабаўнікамі, місіянерамі-п'янтосамі, педэрастамі-рэцэдывістамі, крымінальнікамі і іншымі асацыяльнымі элементамі. Выкідаць гэтую стракатую хеўру ў акіян было нашмат танней, чым утрымліваць удома. Далёка не ўсе павярталіся, але тыя, каму пашэнціла, распавядалі па партовых шынках і бардэлях пра казачную зямлю, дзе вядуцца фантастычныя хімеры, цякуць рэкі з віна, на дрэвах растуць кляйноты, а прыўкрасныя паўдуркі-тубыльцы з радасцю мяняюць золата на шкляныя пацеркі. Вядома, падобнай публіцы не давалі веры нават прастытуткі-малалеткі. Але неяк у адзін з перынейскіх партоў прыйшла напаўразваленая каравэла з экзатычнымі дзівосткамі: бульбай, сланечнікавымі лузганкамі, тытунём, індыкамі і голымі дзікункамі ў клетках. Матросы, стоячы на палубе, палілі смярдзючыя папіросы і лянотна кідаліся ў партовых мытнікаў залатымі злІткамі.

Так высветлілася, што казачныя землі на захад ад Еўропы існуюць насамрэч. Неўзабаве горы золата абрынуліся на Стары Свет. Як след, еўрапейцы сталі меньш працаваць, займелі магчымасць больш думаць і нарэшце задаліся пытаннем: чаму цяпер яны жывуць па-свінску, хаця за дзядамі-прадзедамі ў Рымскай імперыі вялося па-людску? Шматлікія энтузіясты ўзяліся корпацца ў антычных манускрыптах, павыцягвалі з зямлі мармуровых венераў з бахусамі, прыгадалі, што існавалі Рымскае права і нават нейкія "агульначалавечыя каштоўнасці".

Энтузіястаў, якія спрабавалі адрадзіць антычную культуру, цемрашалы-еўраскептыкі зняважліва абзывалі "адраджэнцамі" і "общчачалавекамі". А тыя наўзамен казалі пра *"сярэднявечча змрочны час"*. Спакваля прагрэсіўнае людства ўжо шморгалася ў насоўкі, а не ў манкеты, спала на прасцінах, а не на калматых скурах, ужывала

відэльцы з нажамі. І калі на чарговых адраджэнцаў плёхалі з вакна фекаліямі, тыя не лезлі біцца, а толькі меланхалійна скардзіліся адзін аднаму: *“паскудства, брат, і не пытайся...”*

Гэтыя працэсы мелі кардынальныя наступствы і для нашчадкаў *Homo Slavianikus*’а. Уладары тагачаснай Еўропы разумелі, што Бульбашы, Хахлы і Кацапы – маладыя нацыі, каторым варта прышчапіць адпаведныя жаданні. Так еўрасупольнасць вырашыла экспартаваць адраджэнскія каштоўнасці на ўсход. Роля эмісаркі Высокага Адраджэння была даручана неапалітанскай каралеўне Боне са Сфорцаў. Дынастычны шлюб з бульбашоўска-хахляцка-жмудзяцкім каралём Жыгімонтам Старым, паводле меркаванняў еўрапейскіх ідэолагаў, і мусіў замацаваць модную адраджэнскую бацылу на новых землях.

Аўгусцейшая неапалітанка прыцягнула з сабой цэлую плойму мастакоў, дойлідаў, музыкаў, ювеліраў ды іншых шалбераў са штукарамі і распачала адраджэнскую дзейнасць. Згаладалыя па культуры Бульбашы пацягнуліся да еўрапейскіх кшталтаў, не раўнуючы, як пахмельны да піва. Праз пэўны час Бульбашыя-Літва была ўладкаваная на цывілізаваны манер. Дзікіх насельнікаў балотных выспаў сілком пазганялі ў каралеўскія эканоміі, збольшага абскублі ім каўтуны і прымусілі заняцца грамадска-карыснымі справамі. Спецыяльнай каралеўскай дырэктывай Бона распарадзілася: маладая бульбашоўская нацыя мусі працаваць ад рана да рана, а выпіваць адно ў шынках і толькі на святы, бо інакш не будзе “парадку”. У вольны ж час паспалітыя падданыя мусілі слухаць адраджэнскую музыку ды вучыць напамяць адраджэнскія вершы.

Хахляндыя ж, населеная збольшага казакамі-п’янтосамі, сляпцамі-бандурыстамі, мніхамі-лайдакамі ды проста анархістамі без пэўных заняткаў, не паддавалася ніякім захадам эмісаркі Адраджэння.

І тут кароль Жыгімонт Стары, добра абазнаны ў хахляцкай ментальнасці, падказаў дасціпнае выйсце. Найбольш здатныя да рабаўніцтва і гвалту казакі былі запісаныя ў ганаровы Рэестр – гэткі казацкі спецназ. “Новыя Хахлы” атрымалі вялікія ільготы: абслугоўвацца ў гандэлках па-за чаргою, на законных падставах рабаваць чучмецкія скарбніцы і гвалціць султанскія гарэмы, а таксама замаўляць бандурыстам праніклёныя лірычныя балады пра гэтыя подзвігі.

Рэестравыя казакі адразу скемілі ўсе выгоды еўрапейскай культуры. Хахляцкія адраджэнцы следам за бульбашоўскай шляхтай навучыліся карыстацца нажамі, відэльцамі і сурвэткамі, і ўсе, як адзін, запалілі люлькі. Кіеўскія адраджэнкі парабілі сабе спакуслівыя дэкальтэ. Іх дзеці касякамі пацягнуліся да еўрапейскіх універсітэтаў, дзе намайстрачыліся мацюкацца выкшталцонай лацінай і нават па-старагрэцку. Павяртаючыся, яны імпэтна вербавалі маладых неафітаў еўрапейскаці па родных куранях, хутарах і шынках.

Так *маладыя жаданні* маладых бульбашоўскіх і хахляцкіх адраджэнцаў спакваля набліжалі іх краіны да цывілізацыі і культуры.

Акрыленыя хуткімі поспехамі, еўрапейскія руплі́ўцы пасунуліся былі і да Кацапстану. Але ж, чарговы кацапскі ўладар Васіль традыцыйна спавядаў шалёную нянавісць да ўсяго заходняга. Ён узяў-такі на часовую працу ў Маскву італійскіх гастарбайтараў: фартыфікатараў, збраяроў і дойлідаў-манументалістаў. Астатніх жа заходнікаў пагнаў выспяткамі *да самой литовской границы под Можайском.* Хцівыя да грошай гадаванцы італійскага вайскова-прамысловага комплексу не праявілі салідарнасці з калегамі па Адраджэнні і распачалі будаваць

Кацапам маскоўскі крэмль, званіцу Івана Вялікага ды шмат іншых карысных і не надта карысных спарудаў.

Але цынічныя гульні еўрасупольнасці з азіяцкім Усходам працягваліся нядоўга. Як толькі гастарбайтары на маскоўскіх будоўлях пабачылі, што кацапскі ўладар традыцыйна пазбаўляе зроку сваіх лепшых дойлідаў, то панічна кінулі кельмы і паўцякалі дахаты.

Уладар Кацапстану, ягоныя баяры, думныя дзякі і нават чэлядзь з жахам назіралі за культурніцкім прагрэсам у суседніх *Homo Slavianikus'*аў і ніяк не маглі ўцяміць, нашто карыстацца сурвэткамі, калі ёсць бароды, і чаму жанчынам трэба спяваць серэнады, а не *"кошмарить"* іх паводле "Дамастроя".

-- У нас, Кацапаў, свой асаблівы гістарычны шлях! – нарэшце скеміла баярская дума.

-- Непаўторны і не падобны ні да каго ў свеце, -- пацвердзіў кацапскі ўладар Васіль, пусціў злыдуха ў футра і загадаў накрыць узведзеныя еўрапейскімі майстрамі крамлёўскія спаруды азіяцкімі церамкамі ды залочынымі цыбулінамі.

Хахлы з Бульбашамі з аднога боку, і Кацапы з другога, усё далей і далей разыходзіліся ў светапоглядах. Глабальны канфлікт цывілізацый рабіўся непазбежным.

**Матчын дар**

Неўзабаве Кацапстан распачаў чарговы акт міжнароднай агрэсіі супраць заходніх суседзяў. Для сусветнай супольнасці было прыдумана PR-прыкрыццё, маўляў, гэта ёсць актам збірання "исконна кацапскіх земляў".

Але бліцкрыг не атрымаўся. Ані хаўрус з крымскімі Басурманамі, ані перацягванне на свой бок дробных мажайскіх і вяземскіх князькоў плёну не далі. Тады капапскія спецслужбы зладзілі прапагандысцкую акцыю па суцэльнай дыскрэдытацыі ідэяў Адраджэння на землях "малодшых братоў".

Здавён у Бульбашыі жыла феадальная сямейка Радзівілаў. Род славіўся хцівасцю, ілжывасцю, прагай да золата і купленых тутулаў. Але ў амаральнасці ўсіх пераўзыйшлі браты па мянушках Руды і Чорны разам са сваёй сястрой Барбарай. Браты бессаромна гандлявалі дзяржаўнымі сакрэтамі, куплялі для сваякоў біскупскія пасады, раскрадалі вайсковую маёмасць і нават схіляліся да ератычнага кальвінізму. На прыўлашчаныя народныя грошы Радзівілы будавалі ў родным Нясвіжы аранжырэі, дзе вырошчвалі каланіяльную садавіну. Капрызлівая Барбара сваімі выбрыкамі, інтрыгамі і сямейнымі здрадамі заўчасна звяла ў магілу першага мужа – высокароднага Віленскага кашталяна. І цяпер бяздетная юрлівіца прыглядалася да іншых мужчынаў. Вярбовачная сітуацыя ўсёй троіцы была навідавоку, і кацапскі амбасадар ў тагачаснай сталіцы Бульбашоў, Хахлоў ды Жмудзякоў – Вільні, неадкладна яе скарыстаў.

Радзівілам паабяцалі столькі золата, колькі заважыць уся іх гнюсная сямейка. Наўзамен браты мусілі падкласці сваю сястру ў ложак да вялікага князя Жыгімонта Аўгуста, апошняга з Ягелонаў. Жаноцкія чары нестарой яшчэ курвы моцна паўплывалі на неабазнанага ў любошчах маладзёна. Наіўны юнак распачаў ці не кожнае ночы лазіць праз агароджу радзівілаўскага палаца. Адзін з такіх візітаў, калі *"ніч яка місячна, зоряна, ясная, видно, хоч голки збірай"*, стаўся для яго

фатальным. Падступныя браты, узброеныя шаблямі, падпільнавалі небараку ў алькове сястры.

-- *Гэй ты князь, гэй, праслаўны на цэлы бел-свет, не такую задумаў ты думу!* – злавесна прашапталі падступныя феадалы, прыставілі да шыі маладзёна клінкі і прапанавалі немудрагелісты выбар: смерць або шлюб.

Зляканы князь неадкладна пабраўся шлюбам з бяздетнай, які і асвяціў загадзя прыпасены ў палацы прадажны ксёндз.

Як і мае быць, маладзён колькі мог, хаваў ад бацькоў кампраментарную сувязь з Барбарай. І толькі пасля смерці таты Жыгімонта Старога пра страшную праўду дазнаўся паспаліты люд. Маладога караля ўгаворвалі кінуць бяздзетную курву ўсе: і маці-каралева Бона, і сенатары, і кардыналы з біскупамі, і вайскоўцы з дыпламатамі. Але браты Радзівілы, якія ўжо атрымалі ад кацапскага пасла чарговы хабар і пагрозу агаласіць іх агентурную справу, па ранейшаму вялі курс на дзяржаўную здраду.

Тады Бона ў адчаі звярнулася да Хахлоў, патрабуючы самых бруталыных і амаральных рэестравых казакаў зрабіць чарговы "*najazd na Litvu*", каб управіць мазгі неразумнаму сыну. Але Хахлы нават не адрэагавалі на спакусліваe запрашэнне. Найбольш агрэсіўныя рэестравыя казакі ў чарговы раз выправіліся ў Крым паліць Чарнаморскі флот тамтэйшых Чучмекаў. Найбольш памяркоўныя, седзячы ў шынках і корчмах, прапівалі зброю і нацельныя крыжыкі ды нядобра мружыліся на гаспадароў-Жыдоў, якія больш не налівалі ў крэдыт.

Айчына апынулася ў смяротнае небяспецы, і каралева-маці разумела гэта лепш за іншых. Выбрыкі і капрызы Барбары давялі гаспадарку ледзьве не да банкруцтва. Да таго ж, няплоднасць нявесткі адназначна ставіла крыж на дынастыі і, магчыма, на самім існаванні бульбашоўска-хахляцка-жмудзякскае дзяржавы. Як сапраўдная каралева і годная дачка роду Сфорцаў, Бона мусіла ўзяць справу ў свае рукі. Белы парашок, абачліва прыхоплены з Мілану, за які тыдзень вызваліў дзяржаву ад шлюбнай аферысткі.

Так разумная маці-каралева павярнула дурнаватаму сыну карону, а паспалітаму людзству – дзяржаўнасць.

Натуральна, кацапскія спецслужбы прадбачылі і такі ход падзеяў. Яны неадкладна запусцілі па дварах еўрапейскіх манархаў плёткі, нібыта "гэтыя адраджэнцы толькі і ўмеюць, што труціць маладых прыгажуняў, кідаць у калодзежы здохлых пацукоў, запускаць у святое прычасце бацылу, і прытым робяць усё гэта выключна на заходнія гранты". У такіх варунках месіянская роля Кацапстану па вызваленню "малодшых братоў" з-пад адраджэнскага прыгнёту і збіранні іх пад дзьвюхгаловым арлом падавалася відавочнай і натуральнай.

Хаця кацапскім спецслужбам і ўдалося ўнесці пэўны разлад ў дзяржаве, але яны пралічыліся і гэтым разам. Узгадаваныя на ідэях Высокага Адраджэння і Рымскага права, Бульбашы з Хахламі вырашылі канчаткова навярнуцца да еўрапейскасці.

### **І в найми душі віддали!..**

Бясконцыя войны з Кацапстанам натуральна спрыялі шчыльнаму яднанню Бульбашоў і Хахлоў. Але ж палітычная эліта братэрскіх народаў змушана пайшла на хаўрус з заходнімі суседзямі – Пшэкамі, якія імкнуліся кантраляваць спадкаемцаў сярэдняга і малодшага *Homo Slavianikus*'а. Такі стан рэчаў не задавальняў ані Вільню, ані Кіеў.

Найбуйнейшым мілітарным блокам тагачаснай Еўропы была Свяшчэнная Рымская Імперыя. Адзін з пунктаў устаноўчага імперскага статуту выглядаў у вачах Хахлоў з Бульбашамі надзвычай прывабным. Паводле яго, у выпадку агрэсіі, здзейсненай супраць адной з краін-удзельніц, на яе абарону мусіў падняцца ўвесь мілітарны блок.

У новай геапалітычнай сітуацыі роля Кракава выглядала б мізэрнай, і пыхлівыя Пшэкі не маглі гэтага дапусціць.

-- *Nie pozwalam!* – рэзюмавалі яны.

Пшэцкія палітыканы склалі падступны план. Пад выглядам сіметрычнага адказу на крамлёўскую ідэалагему "збірання ісконна кацапскіх земляў" яны запрапанавалі Бульбашам і Хахлам аб'яднацца ва ўнітарную дзяржаву са сталіцай у Кракаве.

Але ж бульбашоўскія дэпутаты сойма імгненна разгадалі падман. Непрыстойную прапанову не выпадала заблакаваць простым галасаваннем; віленскія, менскія і берасцейскія патрыёты апынуліся ў меншасці. Колькі ўплывовых дэпутатаў ад эканамічна прасунутых рэгіёнаў Бульбашыі дамагліся абвяшчэння перапынку і падкаціліся да калегаў-Хахлоў з прапановай стварыць пашыраную антыпшэцкую кааліцыю. *"Будь собі суддею, і в ночі тьми і самоти Спинись над власною душею і певний суд вчини над нею,"* – пранікнёна нагадалі Бульбашы. Паўночныя і паўднёвыя дэпутаты выпілі за будучыя поспехі і дамовіліся падчас галасавання разам пакінуць залу паседжанняў, каб тым самым тэхнічна сарваць кворум.

Дысцыплінаваныя Бульбашы хуценька разбегліся па шынках і корчмах вакол Вавеля, дзе нават замовілі для калегаў столікі. Схільныя ж да бязладдзя Хахлы доўга чухуліся ў соймавых кулуарах, высвятляючы, хто з іх самы маладзейшы, і каму бегчы па гарэлку. Гэтым неадкладна скарысталася вялікадзяржаўніцкае лобі. Пшэкі вырашылі падмануць хутарскіх арыстакратаў мішурнымі абяцанкамі-цацанкамі. Спярша яны аператыўна размножылі ў апараце соймавага маршалка фальшывыя гербы ды параздавалі паперкі ўсім прысутным Хахлам. Потым папрысвойвалі ім бутафорскія вайсковыя званні. Пакуль хахляцкія дэпутаты разглядалі гербы і прымервалі новыя жупаны з аксельбантамі, вялікадзяржаўнікі выцягнулі галоўны казыр, паабяцаўшы, што з гэтага моманту кожны народны абраннік набывае ганаровы прывілей -- стаць "кумам каралю".

Натуральна, скарумпаваныя прадстаўнікі Хахляндыі адразу забыліся пра геапалітычныя інтарэсы Радзімы. Каб замацаваць поспех, Пшэкі неадкладна закацілі ў залу паседжанняў бочку гарэлкі, і гэта вырашыла ўсё. Прагныя да дармаўшчыны дэпутаты высадзілі дубовае донца бунчакамі і неадкладна разлілі па келіхах як раз у той момант, калі маршалак паставіў на галасаванне мілітарны саюз са Свяшчэннай Рымскай імперыяй.

-- *Нехай тримтять подлюки з-за кордону!* – загарлалі Хахлы.

-- Прапанова адхіленая, -- рэзюмаваў маршалак, але ягоныя словы былі непачутыя з-за звону келіхаў.

Пшэкі счакалі, пакуль Хахлы дап'юць "па трэцяй" і загарлаюць застольную песню *Наливаймо, браття, кришталеві чаші!..*

Маршалак перазірнуўся з вялікадзяржаўніцкімі лабістамі і падступным шэптам выставіў на галасаванне закон аб пераходзе Хахляндыі пад юрысдыкцую пшэцкай кароны.

-- *Будзма, гей!* – брутальна разлягелася па зале.

-- Прынята адзінагаласна, -- задаволена засведчыў маршалак.

Бульбашоўскія дэпутаты так і не дачакаліся ў кракаўскіх шынках хахляцкіх калег. Але ж нечакана падманутыя Бульбашы займелі з гэтага карысць: хоць ім і давялося пайсці на стварэнне з Пшэкамі канфедэратыўнай Дзяржавы Абодвух народаў -- Рэчы Паспалітай, але фармальную незалежнасць Радзімы яны захавалі.

Чарговая здрада хахляцкага дэпутацкага корпусу спрычынілася да паўзучай акупацыі Хахляндыі. Неўзабаве найплоднейшыя землі краю былі апанаваныя ненажэрнымі пшэцкімі магнатамі. Адстаўным дэпутатам заставалася адно сядзець па хатах і цешыцца сумнеўнымі прывілеямі ды памножанымі пад капірку гербамі.

**Блакіт і золата**

Пасля смерці бяздзетнага караля Жыгімонта Аўгуста перад людствам Рэчы Паспалітай паўстала натуральнае пытанне: а хто наступны? Ад самага пачатку карону прапанавалі тутэйшым магнатам, але тыя не наважыліся ўзяць на сябе адказнасць кіравання дзяржавай. Хахляцкія ўладары катэгарычна адмаўляліся прамяняць любыя сэрцу *Хортицю, Оболонь, Славутич* ды *Немиров* на каменныя джунглі Вільні і Кракава. Найбагацейшы ж бульбашоўскі князь адразу адпрэчыў прапанову словамі: *“Не хачу быць каралём, хачу быць Радзівілам!”* Сярод пшэцкіх і жмудзяцкіх феадалаў вартых кандыдатур увогуле не праглядалася.

І тут у спрэчкі пра лёс Бацькаўшчыны ўблыталіся разбэшчаныя адраджэнствам жанчыны. Саматужным феміністкам крэнціла канчаткова завершыць злучэнне родных земляў з Еўропай – паадкрываць па ўсім краі модныя атэлье, фітнэс-клубы і салоны прыгажосці. Ціск на шляхотных мужоў быў проста шалёны, і тыя неўзабаве здаліся. Так карона Ягелонаў упершыню была ўскладзена на галаву іншаземца – гламурнага французскага каралевіча Генрыха Валуа.

Спярша новы кароль апраўдваў спадзяванні шляхты. Ані ён, ані ягоныя французскія дарадцы не злоўжывалі вінам, штодня карысталіся парфумай і шпацыравалі па вечаровай сталіцы, кранальна ўзяўшыся за рукі. Напамажаныя маладзёны звярталіся адзін да аднога выключна “мон шэр, міньён” і прынцыпова не заляцаліся да жанчын.

Апошняя акалічнасць неўзабаве насцярожыла тутэйшых дзевак. Не мінула і месяца, як паспалітае людства з жахам дазналася гнюсны сэнс мілагучнага слова “міньён” і роспачную праўду пра новага караля з яго намакіяжанымі сябручкамі.

І сам Генрых, і ўсе французскія госці аказаліся спрэс геямі. Зрэшты, новы кароль і не збіраўся хаваць гэтую акалічнасць. Для пачатку ён выдаў так званыя “Генрыхавы артыкулы”, паводле якіх рыцарскую годнасць можна было надаваць не толькі за вайсковыя заслугі, але і за нетрадыцыйную сэксуальную арыентацыю. Спецыяльна для сексуальных меншасцяў была вылучана квота ў сойме, дзе новыя дэпутаты адразу ж падзяліліся на фракцыі “актыўных” і “пасіўных”.

Новы манарх практычна не займаўся справамі дзяржавы, бавячы вольны час у педыкюрных салонах, гей-барах і спецыялізаваных сэкс-шопах. Штовечар каралеўскі ложак абступаў хор хлопчыкаў, спяваючы сюзэрну кранальную калыханку:

-- *Ой, не ходи, Генриху, тай на вечорниці, бо на вечорницях дівки-чарівниці!*

Магнатэрыя, шляхта, дый проста паспалітае людства доўга трывалі парыжскія вычварэнствы. Але калі Генрых разам са сваімі шматлікімі

бой-фрэндамі замест традыцыйнага рыцарскага турніру выграшыў зладзіць у Вільні грандыёзны гей-парад, разʼюшыліся нават самыя талерантныя Бульбашы.

Нетрадыцыйны кароль бессаромна выехаў з Ніжняга Замку ў блакітным кабрыялеце, запрэжаным жарэбчыкамі адпаведнай масці. Следам за ім сунуліся шматлікія пары; пасля гей-параду ўсе яны мерыліся масава засведчыць аднаполыя шлюбы ў Віленскай катэдры. На мосце праз Вяллю салодкагалосыя гамасэкі пранікнёна зацягнулі:

*-- Тече річечка, невеличечка, схочу -- перескочу. Віддайте мене, моя матінко, за кого я хочу!*

Але на Катэдральнай плошчы вычварэнскую працэсію ўжо чакаў натоўп справядліва разʼюшаных гомафобаў. У закалоце ўзялі ўдзел панцырнае гусарства, легкая басурманская кавалерыя, рэестравае казацтва і нават святары галоўных хрысціянскіх канфесій. Генрыху і найбольш радавітым геям цудам удалося прабіцца да гарадской брамы.

За манархам-уцекачом неадкладна была выслана Пагоня, а яе, як вядома, *не разбіць, не спыніць, не стрымаць.*

Мокрага з пераляку Генрыха высакароднае рыцарства адлавіла ажно за аўстрыйскім кардонам. Караля-дэзыртыра ганебна паставілі рачкі, акурат тварам да Францыі. Нехта са шляхцюкоў пафасна прамовіў: *“Ты прабач, ты прымі свайго сына!..”*, пасля чаго даў такога выспятка, што небарака дыхтай паляцеў да Парыжа.

На шчасце, гэтае прыкрае здарэнне не адбіла ў “новых еўрапейцаў” прыхільнасці да адраджэнства, культуры ды цывілізацыі. Каб не дапусціць да ўлады чарговага вычварэнца, лепшыя тагачасныя юрысты выпрацавалі бездакорную дэмакратычную працэдуру выбараў новага манарха.

**Сцяпан – вялікі пан**

Пакуль паспалітыя Бульбашы з Хахламі высакародна абаранялі свае гонар і годнасць, на Ўсходзе зноў адбываліся жахлівыя падзеі. Да ўлады ў Кацапстане дапнуўся чарговы бязглузды Іван, які ўвайшоў у сусветную гісторыю з прыдомкам “Жахлівы”.

З дзяцінства Іван вызначаўся схільнасцю да прымітыўнага садызму і неабгрунтаванай пыхі. Яшчэ жэўжыкам ён рэгулярна вешаў катоў на зубцах Спаскай вежы, падсмальваў бароды думным баярам, падступна сікаў у студні, а падчас прычасця нават пляваўся ў мітрапаліта жаванымі прасфоркамі. Падлеткам Ваня ўпадабаў катаваць палонных на дыбе, гвалціць манашак з манахамі і трынькаць на балалайцы нацягнутымі свежавыцягнутымі чалавечымі жыламі.

Выхаваныя ў натуральным кацапскім халопстве прыдворныя ўбілі яму ў галаву, што ўсё гэта ёсць найвышэйшымі праявамі яго выключнай духоўнасці і праўдзівай богаабранасці. Калі ж малады чалавеканенавіснік насунуў скрадзеную ў Кіеве шапку Манамаха, то натуральна адчуў сябе “царом усяго Кацапстану”, пра што і абвесціў па наваколлі. Пасля чаго распачаў войны з усімі без выключэння суседзямі.

Для пачатку ён бязлітасна вынішчыў Наўгародскую ды Пскоўскую рэспублікі – праўдзівых спадкаемцаў еўрапейска-скандынаўскай традыцыі. Потым бязмэтна спаліў гарады братоў-Басурманаў -- Казань і Астрахань. Бессэнсоўна спустошыў землі ціхамірных Лабусаў. Калі ж Бульбашы паспрабавалі шляхотна заступіцца за апошніх, кацапскае войска вырушыла зруйнаваць Полацк.

Прыхадні спалілі горад на попел, патапілі ў Дзвіне ўсіх тамтэйшых камерсантаў, а знакамітую полацкую бібліятэку пацягнулі ў Маскву, дзе з пергаментных старонак нарэзалі сцелькі ў лапці. Маскоўскія паліттэхнолагі неадкладна абвесцілі чарговы генацыд Бульбашоў "справядлівым актам вызвалення ісконна кацапскіх земляў".

Зрэшты, далёка не ўсім Кацапам падабаліся перманентныя войны з цывілізаванымі суседзямі. Некаторыя разумныя і адукаваныя дысідэнты, кшталту Курбскага, уцякалі ў дэмакратычную Бульбашыю, некаторыя адважныя апазіцыянеры нават ладзілі змовы супраць крывавага дыктатара. Для барацьбы з іншадумствам Іван Жахлівы рэфармаваў тагачасныя спецслужбы ў так званую апрычыну. Смярдзючыя вершнікі з прыладжанымі да сёдлаў мётламі і сабачымі галовамі гойсалі па гарадах і вёсках у пошуках дысідэнтаў, дармавога пітва, закускі і дзевак.

У нячастыя перапынкі паміж закалотамі, катаваннямі, згвалтаваннямі і п'янкамі ўладар Кацапстану палымяна маліўся Богу, мяняў жонак, лячыўся ад пранцоў, а аднаго разу мімаходзь нават забіў роднага сына.

Калі Іван Жахлівы дазнаўся, што ў Рэчы Паспалітай абвешчаны конкурс на пасаду манарха, то неадкладна прыцягнуўся да Кракава на сойм.

Вецер лашчыў геральдычныя харугвы па-над Вавелем, сонейка па-мастацку расквечвала фрэскі ў залі паседжанняў. Бульбашоўскія і хахляцкія шляхцюкі паважна спрачаліся з пшэцкімі калегамі наконт лёсу агульнай дзяржавы і гжэчна спіналіся пра вартасці тых ці іншых трункаў. З'яўленне дзіўнага прыхадня ў азіяцкай футры да пятаў прымусіла ўсіх зніякавець.

-- *Люди холопского звания сущие псы иногда!* – ацаніў пабачанае кацапскі богаабранік, гучна смэркнуўся ў два пальцы і запатрабаваў, каб яго неадкладна абралі каралём.

Зрэшты, Іван Жахлівы моцна пралічыўся: замест таго, каб гукнуць *"Исполоть, детинушка, исполоть!»* і бухнуцца ў ногі, абураныя дэпутаты пахапаліся за шаблі. Але юрысты Рэчы Паспалітай неадкладна асцюдзілі гарачыя галовы: маўляў, паводле працэдуры госць фармальна ўжо лічыцца кандыдатам, падпадае пад імунітэт і з тае прычыны не можа быць пакараны.

Натуральна, кандыдатура правадыра барбараў нават не разглядалася. Пшэцкія дэпутаты з пераляку прапанавалі тут жа пайсці на аншлюс з Аўстрыяй і аддаць карону Габсбургу. Але гэта катэгарычна не задавальняла патрыятычна настроеных Бульбашоў з Хахламі. Ніхто з іх не жадаў ставіць над сабой ані нямытага кацапа, ані пыхлівага фрыца.

І тут нехта з хахляцкіх захадэнцаў прыгадаў, што за Карпатамі жыве знакаміты вупар з універсітэцкай адукацыяй -- трансільванскі князь Сцяпан Батура, праўдзівы нашчадак роду знакамітага графа Дракулы. Перспектыва нацкаваць на кацапскага душагуба Івана адукаванага крывасмока Сцяпана прыйшлася даспадобы ўсім дэпутатам.

Так Батура нечакана для сябе атрымаў каралеўскую карону. Іван Жахлівы смяротна пакрыўдзіўся і даручыў сваім апрычнікам дэталёва распрацаваць "акцыю адплаты". Тактыку выпаленай зямлі, апрабаваную царскімі федэраламі на Полацку, планавалася пашырыць на Вільню, Кіеў ды Кракаў.

Але разумны Сцяпан не спаў у шапку. Кароль адразу скеміў нанесці прэвентыўны ўдар. Удзень трансільванец праводзіў удалыя вайсковыя аперацыі; у хуткім часе ён вызваліў ад дзікуноў Полацк. Уначы ж кароль перакідаўся ў вупара-крывасмока, ляцеў да кацапскага нелюдзя і вынаходліва цкаваў псіхічна хворага Івана. Батура гіганскім кажаном чапляўся за бэлькі званіцы Івана Вялікага ды бомамі выбіваў пахавальныя маршы. Апоўначы залятаў у Александраўскую слабаду і пэцкаў столь крывёю. А аднаго разу да смерці пералякаў нават самаго Малюту Скуратава.

Спалучэнне ўдалых мілітарных стратэгій і перадавых тэхналогій псіхалагічнай вайны неўзабаве дало плён. Здэмаралізаванае кацапскае войска панічна адкацілася на ўсход. Маскоўскія латнікі дэзэртавалі па сваіх занядбаных вёсках, а іх перманентна падпітыя ваяводы пазабівалі адзін аднога ў традыцыйных застольных бойках.

Усмерць запалоханы Іван Васільевіч зачыніўся было ў крамлёўскім бункеры, абчапляўся крыжыкамі, ладанкамі ды гронкамі часныку, але неўзабаве сканаў, бы той сабака. Жахлівы ўладар так страшна смуродзіў, што ацалелая чэлядзь неадкладна сунула яшчэ цёплы труп у герметычны саркафаг і заклала яго каменнай плітой.

Зрэшты, гэты вялікадзяржаўны смурод адчувальны ў Кацапстане і дагэтуль...

**Ogniem i mieczem**

Палітычная эліта Бульбашоў, Хахлоў і Пшэкаў справядліва бачыла сваю гістарычную ролю ў пазбаўленні Еўропы ад усходняга смуроду. Аднак лакальныя захады па экспарце культуры і перадавых тэхналогій катэгарычна блакаваліся не толькі кацапскімі элітамі, але найперш тамтэйшымі халопамі. Бязглуздыя Кацапы разграмілі маскоўскую філію выдавецтва “Іван Федаровіч & Пётра Мсціславец”, выгналі з Масквы славутага бульбашоўска-хахляцкага філолага Лаўрэнція Зізанія. Барадатыя дзякі, якія ледзве ўмелі ставіць крыжыкі замест подпісаў, шалёна цураліся еўрапейцаў з універсітэцкімі дыпломамі, бо лічылі адукацыю “заходняй пошасцю”. Да таго ж, у неталерантным Кацапстане моцна ўціскалася бульбашоўскамоўнае і хахляцкамоўнае насельніцтва.

Сітуацыя вымагала дэталёва прадуманай аперацыі, якую, скарыстаўшы шчаслівы выпадак, выкшталцона распрацаваў тагачасны канцлер Леў Іванавіч Сапега.

Яшчэ ў маладосці гэты выбітны палітычны дзеяч вызначаўся спагадай, гуманізмам і любоўю да бліжняга. На сваіх землях ён наладзіў цэлую сетку сіроцкіх прытулкаў, дзе адукаваныя настаўнікі дбайна выхоўвалі малых байструкоў.

Неяк *падарожныя жыды*, якія ратаваліся ад чарговага кацапскага пагрому, прыцягнулі ў дзіцячы спецінтэрнат зашуганага хлопчыка. Яны і распавялі канцлеру Сапегу жудасную гісторыю, якая надарылася ў вугра-фінскім Вуглічы. Нібыта на падворак, дзе невялічкі кагал падпольна гандляваў забароненымі ў Кацапстане рыцарскімі раманамі, забег зляканы хлопчык – гэты самы. Дзіцё ратавалася ад страшных мужыкоў з даўжэзнымі мясніцкімі нажамі. Чалавекалюбівыя Жыды скемілі схаваць небараку. Дзецюкі ж з п’яных вачэй зарэзалі першага, хто патрапіўся пад нож -- малога папёнка.

Леў Іванавіч быў надзвычай расчулены *слезой ребенка*. Да таго ж разумны канцлер, абазнаны ў азіяцкіх норавах, зразумеў, што перад ім – праўдзівы кацапскі царэвіч Зміцер, цудам уратаваны ад кілераў Барыса

Гадунова. Узорна-паказальная школа-інтэрнат у Ружанах і сталася тым месцам, дзе пад пільным наглядам еўрапейскіх настаўнікаў таемна гадаваўся законны спадкаемца маскоўскага трона.

Звераваты ад нараджэння царэвіч Змітрок скора вылюднеў. Ён перастаў мацюкацца, давіць вошай і нюхаць клей, затое авалодаў асновамі арыфметыкі, вывучыў колькі замежных моваў і нават намайстрачыўся палітэсу.

Леў Іванавіч палюбіў падкідыша, як роднага. З цягам часу канцлер нават прыгледзеў яму нявесту-еўрапейку, гжэчную пшэцкую прыгажуню Марыю Мнішак. Напярэдадні шлюбу высокародны Сапега сумленна паінфармаваў міжнародную супольнасць пра таямніцу паходжання свайго гадаванца і ягоныя справядлівыя прэтэнзіі на царскі трон.

Ідэя спецаперацыі ў Кацапстане прыйшлася даспадобы ўсім.

Бульбашоўская шляхта і паспалітае людства даўно шукала магчымасці не толькі дапамагчы прыгнечаным суродзічам на Смаленшчыне, але і аказаць інтэрнацыянальную дапамогу іншым паняволеным народам.

Дэмакратычнае казацтва адразу ж ухапілася за магчымасць экспартаваць ў Маскву памаранчывую рэвалюцыю. Да таго ж, хахляцкія палітыкі настойліва патрабавалі ад Кацапаў справядлівага падзелу Паволжскай флатыліі, якая бяздарна гніла каля прычалаў Ніжняга Ноўгарада.

Каталіцкія біскупы, кананічныя праваслаўныя і ўніяцкія мітрапаліты выявілі ўхвальную салідарнасць; гучны карупцыйны скандал з купляй маскоўскім схізматыкам Іовам патрыяршай пасады ў прадажнага канстанцінопальскага пастыра Ярэмы Другога прымусіў кансалідавацца нават заўзятых канкурэнтаў.

Віленскія, кракаўскія ды львоўскія бізнэсоўцы шчодра прафінансавалі паспалітую ініцыятыву, бо спадзяваліся на стварэнне агульнай эканамічнай прасторы. Некаторыя прагрэсіўныя геапалітыкі нават марылі пра ўвядзенне супольнай валюты – бульбашоўскага талера. У перспектыве за паўнавартасныя грошы мелася закупляць спрадвечныя кацапскія каштоўнасці: ікру, матрошак і валёнкі.

У хуткім часе добра ўзброенае войска з бульбашоўска-пшэцкай шляхты, рэестравага казацтва і еўрапейскіх валанцёраў вырушыла на Маскву. Па дарозе сумленныя людзі шчыра віталі сапраўднага цара. Да вызвольнага войска далучыліся шматлікія кацапскія апазіцыянеры, якія свята верылі ў славянскае адзінства, баганосную ролю Бульбашоў, Хахлоў і Пшэкаў ды звязвалі будучыню Кацапстана выключна з цывілізаванаю Еўропай. Пераважную большасць апазіцыянераў складала тамтэйшая інтэлігенцыя, якую паспалітыя Кацапы не любілі і зняважліва называлі “батанікамі” і “батанамі” -- за здольнасць “ботаць” на іншаземных мовах.

Масква без ваганняў здалася вызваліцелям ад самадзяржаўнай тыраніі. Граданачальнік уласнаручна паднёс законнаму ўладару ключы ад горада. Неўзабаве цар Дзмітрый распачаў так неабходныя тамтэйшаму грамадству рэформы. Ён катэгарычна забараніў жлукціць брагу на вуліцах, лузгаць семкі ў Думе і сікаць па пад’ездах, затое дазволіў людству пасміхацца ў публічных месцах. Для шматлікіх маскоўскіх юродзівых, блажэнных ды іншых бомжаў была створана адмысловая сетка дармавых санпрапускнікоў. З цягам часу нават планавалася скіраваць Кацапстан да *управляемой демократии.*

Па вечарах манарх з канцлерам абмяркоўвалі ў царскім цераме дзяржаўныя справы, з агідай паглядаючы праз вокны на праваленыя дахі маскоўскіх халабудаў.

-- *Проклятые кацапы даже щи едят с тараканами!* – папярэджваў Леў Іванавіч.

-- Для канчатковай перамогі цывілізацыі над *властью тьмы* тут неабходна зарганізаваць Маскоўскі універсітэт, Публічную бібліятэку і Вялікі Тэатр! – мроіў цар. – *Через четыре года тут будет город-сад!*

-- *Зварушаны нарэшце дух народны, я верую, бясплодна не засне, а ўперад рынецца, маўляў крыніца, каторая магутна, гучна мкне, здалеўшы з глебы на прастор прабіцца!* – натхняў венцаноснага гадаванца бульбашоўскі канцлер.

Але ж летуценнікі пралічыліся: план еўрапейскага ўладукавання *Kresów wshodnih* прыйшоўся даспадобы хіба што нешматлікім "батанам". Астатняе насельніцтва з нянавісцю адрынула рэформы.

Баярскія дзеці, маскоўскія беспрытульнікі ды іншыя *недоросли* страшэнна напалохаліся перспектывы замест гульні ў біткі вучыцца кніжнай грамаце. Схільныя да антысанітарыі халопы з ускраін вельмі некамфортна пачувіліся на нязвыкла чыстых вуліцах. Гандляры кулябякамі з падлай і рассцягаямі з сабачацінай панічна баяліся, што новы манарх увядзе жорсткія санітарна-эпідэмалагічныя нарматывы.

Да таго ж, цар Дзмітры не хаваў ад паспалітага людства прыгожую жонку Марыну; разам з першай ледзі ён рэгулярна выходзіў да падданых, дэманструючы, што таксама ўважае царыцу за чалавека.

Усе гэта і загубіла маладога цара-рэфарматара. І баяры, і халопы, і нават нешматлікія бізнэсоўцы прыйшлі да аднадушнай высновы: Дзмітры жыве *не по понятиям.*

-- *А царь-то, ёпта, не настоящий!* – загукалі Кацапы, павыдзіралі з парканаў *Большой Глиномесной* вуліцы дрыны і рушылі да Крамля.

Так у Кацапстане распачаўся чарговы бунт, *бессмысленный и беспощадный.* Па дарозе пагромнікі спалілі некалькі заходніх амбасадаў, павесілі з сотню іншародцаў і ўшчэнт разнеслі ўсе цэнтравыя кабакі. Невялікая дэпутацыя "батанаў" паспрабавала было прысароміць суайчыннікаў словамі *"Вы же звери, господа!",* але ўсіх іх неадкладна чацвертавалі. У разбітых кабаках аказалася да крыўднага мала гарэлкі, і тады маргіналы скінулі з бліжэйшай званіцы ацалелых "батанікаў". Зрэшты, спіртнога ад гэтага не пабольшала. Гэта канчаткова настроіла басоту-галоту супраць легетымнай улады.

Пагромнікі выжлукцілі ўсе, што было можна, хаўкнулі, уцерліся, нядобра глянулі ў вочы адзін аднаму і дурнавата пасміхнуліся. *Потом пошли плясать в избе, потом дрались не по злобе и все хорошое в себе поистребили.*

Ноч прайшла ў трывожным чаканні. Па ўсёй Маскве разносіўся пераможны рык спадкаемцаў старэйшага *Homo Slavianikus*'а, зляканыя мацюгі іх самачак і жахлівы хрубаст шкла. У тую ноч бульбашоўскія этнографы, хахляцкія заолагі ды іншыя еўрапейскія гуманісты, якія разам з Ільвом Сапегам прыбылі для вывучэння "загадкавай кацапскай душы" і "тыповага кацапскага срачу", канчаткова пазбавіліся недарэчнай і смешнай думкі, нібыта "ўсе жывёлы роўныя".

Наступствы маглі стацца абсалютна трагічнымі. І таму адказнасць за ўвядзенне надзвычайнага становішча ў сталіцы мужна ўсклаў на сябе канцлер. Мушкецёры, казакі і шляхта ўзяліся дбайна наводзць парадак. Бульбашоўскія дудары, стоячы між зубцоў крамлёўскае сцяны, суправаджалі аднаўленне канстытуцыйнага ладу ваяўнічымі мелодыямі

кшталту: *“Эх, скручу я дудку, такое зайграю, што ўсім будзе чутка ад краю да краю!..”*

Не ўсім Кацапам падабалася плясаць пад бульбашоўскую дуду, але ж нацыянальная любоў да бізуноў, таталітарнага бота і асабліва да *твердой руки* неўзабаве далася ў знакі: у хуткім часе пагромнікаў пазаганялі па курных ізбах, стайнях і свінарніках.

Зрэшты, Сапега зрабіў адну памылку, якая сталася фатальнай. Падчас надзвычайнага становішча ва ўсёй Маскве быў уведзены жорсткі сухі закон. Цяжкое пахмелле незваротна сказіла і без таго агрэсіўную псіхіку масквічоў.

Па горадзе папаўзлі ілжывыя чуткі, нібыта ўсё народнае спіртное цар прыўлашчыў сабе. На раніцу жахлівы натоўп з латнікаў-дэзертыраў, адстаўнікоў-апрычнікаў, гандляроў крадзеным, пасцельнічых педэрастаў, кішэнных злодзеяў, смердаў ды іншых асацыяльных элементаў шчыльна абклаў Крэмль.

Бульбашы, Хахлы і Пшэкі мужна баранілі законнага манарха. Пагромнікі падалі тысячамі, але ацалелыя, як згаладалыя клапы, лезлі на сцены па трупах. Неўзабаве ў абаронцаў скончыліся порах, смала і дуст. Тады шляхта павыцягвала шаблі, алебарды ды стылеты. І толькі калі *рука бойцов колоть устала,* пахмельны натоўп уварваўся ў палац, выпіваючы па дарозе ўсё, што гарыць і гвалцячы ўсё, што рухаецца. Выбітнага сына кацапскага народа, Божага памазаніка Дзмітрыя Іванавіча Рурыкава проста выкінулі з вакна. Царыца ж Марына, пераапранутая ў касаваротку, здолела-такі выбрацца з каламесі да сваіх.

Далейшыя падзеі разгортваліся па надзвычай гострасюжэтным сцэнарыі. Настойлівы Сапега не адмовіўся ад задуманага і неўзабаве падшукаў двайніка зверскі забітаму манарху – сціплага настаўніка шклоўскай школы-інтэрната. Выбітны палітык справядліва лічыў, што Кацапы з п’яных вачэй не адразу заўважаць падман.

І сапраўды, па хуткім часе баяры і дваране прымхліва пацягнуліся ў тушынскую рэзідэнцыю фальшаванага Дзмітрыя. Але наіўны шклоўскі самазванец разам са сваімі дурнаватымі прыхільнікамі не ўгледзелі генеальнай задумкі Льва Іванавіча. Ілжэдзмітрыю падступна адводзілася роля пудзіла. Элітныя вайсковыя часткі вызваліцеляў пад камандай бульбаша Яна Караля Хадкевіча і хахла Пятра Канашэвіча-Сагайдачнага здзейснілі ўдалы марш-кідок і занялі Маскву.

-- Я бараню вас ад усялякіх самазванцаў, -- імпэтна патлумачыў Леў Іванавіч барадатым баярам.

Апошнія зразумелі словы канцлера на свой капыл: алігарх Васіль Шуйскі, які цяпер сядзеў на маскоўскім троне, быў зрынуты сваім жа атачэннем. Пасля непрацяглай зачысткі кацапская сталіца канчаткова вызнала воінаў-вызваліцеляў. Паводле прапановы Сапегі на царства быў памазаны малады каралевіч Уладзіслаў.

Магчыма, далейшы гістарычны шлях Кацапстану склаўся б куды больш цывілізавана, калі б у маскоўска-еўрапейскія дачыненні не ўблыталіся рэваншысты: дробны князёк Пажарскі і таўстапузы ніжагародскі купчына Мінін. У нядаўна заваяваным Паволжжы яны навербавалі жахлівую арду з непітушчых татараў, калмыкаў, башкіраў і нагайцаў, з якой рушылі на Маскву.

Пазаконныя бандфармаванні ў чарговы раз скінулі легетымную ўладу. Затэрыразаваная баярская Дума запрасіла на пасаду бажавольнага Міхаіла Раманава, знакамітага тым, што ён шапкай Манамаха лавіў у Гранавітай палаце прусакоў.

По ўсім Кацапстане зноў засвісталі бізуны, запалалі вогнішчы з друкаваных кніг, а неадукаваныя барадатыя схізматыкі з амбонаў не стамляліся прамаўляць вечную анафему Захаду.

Леў Іванавіч Сапега з'ехаў у Вільню, дзе да самой смерці аналізаваў прычыны няўдачнага экспарту культурных каштоўнасцяў. Толькі перад смерцю канцлер-гуманіст нарэшце скеміў, што дэмакратыя прыносіцца дзікунам выключна *ogniem i mieczem.*

**Розпрягайте, хлопці, коней!**

Экспансія адраджэнскіх ідэяў незваротна раскалола і хахляцкае грамадства.

Прагрэсіўныя Хахлы-еўрапейцы нарэшце саскочылі з таннага шмурдзяка і незваротна падселі на вугорскія, рэйнскія ды бургундскія віны. Гэтая акалічнасць паўплывала на іх норавы дужа станоўча. Прыхільнікі еўрапейскага шляху развіцця не лаялі жонак нават па справе, не кідалі свінячыя скуркі пад стол і пасля трэцяй чаркі сціпла зацягвалі адраджэнскі гімн -- *"Я горилкі не пью, бо горилка гірка. А я жинкі не бью, бо йна гарна й молода!"*

Рэгрэсіўныя Хахлы-ізаляцыяністы прынцыпова не вызнавалі заходніх кшталтаў, традыцыйна аддаючы перавагу таннаму хутарскому пойлу. Яны запівалі гарэлку півам, мацюгаліся без дайпатрэбы і брутальна раўлі паміж тостамі *"У Києві на ринку пьюць козаки горилку..."*

Гэткі разыход у гастранамічных упадабаннях, застольных заведзёнках ды ў геапалітычных поглядах меў досыць нечаканыя наступствы для суседніх Бульбашоў...

Гусяцінскі казак Севярын упадабаў найтаннейшы шмурдзяк ад самага дзяцінства. Яшчэ малым хлапчанём ён, стоячы пад шынком з абгрызеным гранчаком, па-хабёльску патрабаваў ад мінакоў, каб яму налівалі задарма. З гэтае прычыны пацан і атрымаў вулічную мянушку "Налівайка", якой надзвычай ганарыўся.

У юнацтве Налівайка прагнуў вайсковай славы і нават паступіў на службу ў асабістую ахову князя Астрожскага. Але ж пратрымаўся там нядоўга. Схільны да анархізму і алкагалізму целаахоўнік штодня парушаў усе магчымыя статуты, спойваў рэкрутаў *"Зосяй",* навучаючы пры гэтым, што праўдзівым Хахлам закуска нібыта без дайпатрэбы. *Бив його Острожські березовим прутом, щоб він не стояв з молодим рекрутом,* але ж дарэмна. Нарэшце, Севярына справядліва выгналі са службы без права на пенсію і ветэранскія ільготы.

Зладзеяваты п'янтос смяротна пакрыўдзіўся на прагрэсіўных Хахлоў, перабраўся на Брацлаўшчыну, дзе і набраў банду паплечнікаў з адпаведнымі мянушкамі -- Нябаба, Галота, Крывашапка і Хвеська.

Маргінальнае таварыства распачало з малога – душылі курэй, кралі з вяровак бялізну і абіралі п'яных пад шынкамі. Неўзабаве банда моцна пашырылася коштам розных здэкласаваных элементаў з усяе Рэчы Паспалітай. Налівайка скеміў: калі дробная дваравая шпана прагне ператварыцца ва ўплывовую групоўку, то мусіць мець не толькі арсенал разматай зброі, але і сур'ёзную крымінальную касу.

Скарб аднаго са славутых сечавых палкоў перахоўваўся ў старажытнай луцкай царкве без усялякай аховы. Таму і падаўся рабаўнікам надзвычайна лёгкай здабычай. Уначы банда падступна напала на бажніцу, падпаліўшы яе з чатырох бакоў. Хахляцкія святары мужна баранілі давераную ім маёмасць, але ўсе загінулі ад куль, шабляў і кісцянёў.

Блюзнерскі напад выклікаў сярод Хахлоў-еўрапейцаў надзвычайнае абурэнне. Сляпыя бандурысты імгненна склалі драматычную думу: *“Доборолась Хохляндия до самого краю. Гірше ляха свої діти її розпинають!”* Рэестравыя казакі працьверазелі, рашуча адкінулі келіхі з рэйнскім і ўзяліся гастрыць шаблі, бо з прычыны жахлівага блюзнерства міжнародны аўтарытэт спадкаемцаў сярэдняга *Homo Slavianikus*’а ўпаў да апошняга градусу. Злачынства вымагала справядлівага пакарання, і за бандай была неадкладна склікана пагоня рэестравых казакаў на чале з палкоўнікам Рыгорам Лабадой.

Рабаўнікі разгубіліся. Шлях праз Карпаты падаваўся стэповым п’янтосам абсалютна непраходным, а для інтэрвенцыі на пшэцкія землі ў групоўкі відавочна не ставала моцы.

І тут знакаміты гвалтаўнік Нябаба, як этнічны Бульбаш, падказаў адзіны прымальны варыянт. На паўночных землях пра подзвігі Налівайкі яшчэ не чулі, і таму перад дурнаватым балотным людам можна было выставіць сябе не гвалтаўнікамі, марадзёрамі і забойцамі, але абаронцамі правоў чалавека, свабоды сумлення і этнічнай талерантнасці.

Паверыць такой нахабнай хлусні маглі адно наіўныя Бульбашы. Люмпен-пралетарыят Гомеля, Мазыра і Рэчыцы неабачліва паддаўся на правакацыю і радасна вітаў ілжэпрарока сацыяльнай роўнасці.

Памяркоўныя бульбашоўскія маргіналы не мелі нічога супраць рабавання шляхецкіх маёнткаў ды жыдоўскіх крамаў. Але калі прыхадні ўзяліся імпэтна гвалціць іх дзевак, козаў і цуцыкаў, ад Налівайкі адвярнуліся нават самыя зацятыя бульбашоўскія прыхільнікі.

Тым часам атрад высокароднага Рыгора Лабады нарэшце дабраўся да Гомельшчыны, але нечакана прыпыніў рух: у тамтэйшых піўніцах аказалася да халеры рэйнскага і бургунскага. З гэтае прычыны справядлівая адплата была адкладзена на нявызначаны тэрмін.

Налівайка ўдала скарыстаў сітуацыю і з вернымі хаўруснікамі пайшоў да Магілёва. Невядома, чым скончыўся б чарговы казацкі наезд, каб да горада не падыйшоў бульбашоўскі атрад Яна Караля Хадкевіча. Невялікі эскадрон панцырных гусараў лёгка раскідаў саслабелых ад рэгулярнага спажывання шмурдзяка прыхадняў. Басота-галота, кідаючы па дарозе прыўлашчаныя скарбы, пляшкі, закуску і дзевак, панічна пабегла да самых Лубноў, дзе на яе чакаў каронны гетман Жалкеўскі. Пасля нядоўгіх, але драматычных ліхтугаў знаны бандыт патрапіў у палон.

Ужо ў Варшаве, стоячы перад выкшталцонай катаўнічай прыладай – медным быком, Налівайка запытаўся ў Жалкеўскага:

-- *А що мене робити?*

-- *Та лягайте спочивать!* -- гжэчна пасміхнуўся каронны гетман і паказаў на меднага быка.

Парушальніку прысягі, рабаўніку і забойцу літасціва дазволілі каўтануць з рыльца ўлюбёнага шмурдзяка *“Портвейн пивденний”* і нават выпаліць смярдзючую цыгарку, пасля чаго запхалі ўсярэдзіну быка і расклалі пад ім вогнішча.

Гэты прыкры эпізод хахляцкай гісторыі меў цалкам лагічны працяг. Неўзабаве вытворчасць таннага пойла ў краіне была значна скарочана. Кіеўскія вінакурні і чарнігаўскія бровары закупілі перадавыя заходнія тэхналогіі і перайшлі на выраб экалагічна чыстага прадукту.

Але ж брутальныя аматары шмурдзяка не зводзяцца ў Хахляндыі і пагэтуль.

**Generation "Г"**

Выгнанне з Масквы бульбашоўска-хахляцка-пшэцкіх цывілізатараў тамтэйшыя гісторыкі-рэвізіяністы цынічна назвалі *окончанием смутного времени.* Спраўдзіліся найгоршыя страхі Льва Іванавіча Сапегі: пакінутыя без пільнага дагляду Кацапы распачалі грандыёзную п'янку, якая доўжылася бесперапынна колькі гадоў.

Як і мае быць, увесь гэты час зверскі п'яныя насельнікі Кацапстану хаатычна ўступалі ў полавыя стасункі з усімі без выключэння самкамі роднай фауны, а таксама адзін з адным. Вялікая таямніца зачацця масава адбывалася на хатах, у лясах, у палях, ў кабаках, у прыдарожных хмызах, пад плотамі і, натуральна, у малінах. Хціўцы былі неабазнаныя ў кантрацэптывах, і таму неўзабаве Кацапстан напаткаў праўдзівы дэмаграфічны выбух; на свет з'явілася цэлае пакаленне байструкоў, зачатых выпадковымі сэкс-партнёрамі выключна ў п'яным стане.

Натуральна, прадстаўнікі пасляваеннага бэбі-бума выглядалі несамавіта, рыхтык, *не мышонок, не лягушка, а неведома зверюшка.* Усе яны пераўзыходзілі папярэднікаў нематываванай агрэсіўнасцю і любоўю да статкавага ладу жыцця, але ж значна саступалі ім у інтэлекце і здольнасці да навучання.

Адметнымі рысамі новага пакалення сталіся імпульсіўнасць мыслення і абсалютная ірацыянальнасць учынкаў. Баярын эпохі Івана Жахлівага краў гранчак з кабака, каб жлукціць з яго ў цераме; "новы кацап" зазвычай біў прыўлашчаны посуд аб сцяну. Сталбавы дваранін часоў Барыса Гадунова паскудзіў на суседскі ганак, каб па-сяброўску пацвяліць гаспадара; наступнае пакаленне серыла адразу за ўласным парогам. Старакацапскія ваяводы ладзілі акты міжнароднай агрэсіі выключна для пашырэння выпасаў царскага быдла; іх жа наступнікі проста бессэнсоўна знішчалі ўсё, што траплялася на вочы.

Бульбашоўска-хахляцкі навуковец Мялеці Смагрыцкі, які наведаў тагачасную Маскву, пакінуў цікавыя нататкі пра побыт і норавы новых маладзёнаў.

"Улюбёным іх заняткам ёсць рабаванне самотных мінакоў у цёмных завулках, на каторых нападаюць выключна зграяй. Адабраныя грошы выдаткоўваюцца пераважна на сланечнікавыя лузганкі, якіх сярэднестатыстычны кацапчык спажывае да пуда ў дзень, і на паскуднае пойла *"пивасик"*, якога ён выпівае да бочкі за вечар".

"Напіваючыся, яны сядаюць у кола на кукішкі і размаўляюць мовай, незразумелай нават старэйшаму пакаленню Кацапаў. Універсальная фраза *"а хули!"* можа азначаць і здзіўленне, і захапленне, і нават пагарду. Зварот *"алё, мужык!"* перакладаецца як "ці можна звярнуцца да вельмішаноўнага спадара?". Вокліч *"ну и шмара, нуёпт!"* ёсць найвышэйшай ацэнкай прыгожай і пекнай паненкі. Пытанне *"чё бухнуць, чтоб не тагонах?"* -- гжэчная просьба да крамніка парэкамендаваць якісь шляхотны напой. Сваіх сябрукоў маладзёны называюць выключна *"земеля"*, *"братэла"*,*"слыш"* і *"эй"*, у залежнасці ад сацыяльнага статусу суразмоўцы".

"Абсалютна ўсе маладыя Кацапы – заўзятыя прыхільнікі мінету і кунілінгусу. Камунікатыўныя сувязі паміж мужчынамі і жанчынамі і нават паміж мужчынамі і мужчынамі яны называюць не мовай, а *"языком"*, прытым саманадзейна ўважаюць, што іх кацапскі *"язык"* – самы *великий и могучий* у цэлым свеце. Некаторыя вычварэнцы нават сцвярджаюць, што іх *язык до Киева доведет.*

“Гэтыя маладзёны вызначаюцца ўхвальнай схільнасцю да выяўленчага мастацтва. Сцены сваіх дамоў яны аздабляюць шматлікімі карцінкамі выключна непрыстойнага зместу, а сваё цела – сінімі татуіжамі, якія выкалваюць пераважна ў стралецкім войску і на шматлікіх зонах”

“Усе яны – надзвычайныя патрыёты сваёй краіны. Па святах, якіх у Кацапстане налічваецца 364 у календарным годзе і якія называюцца там *“праздниками”,* маладыя людзі традыцыйна збіраюцца пад амбасадамі заходніх дзяржаваў і хорам равуць так званыя *кричалки*, у якіх сваеасабліва ацэньваюць заходнюю палітыку і заходні лад жыцця. Найбольш палымяныя патрыёты кідаюцца ў вокны амбасадаў уласнымі фекаліямі”.

“Новае пакаленне вызначаецца надзвычайна кепскай памяццю. Маладзёны не ў змозе засвоіць нават назоў уласнай краіны – Кацапстан. Куды больш папулярны назоў “РАША” (ад абрэвіатуры галоўнай *кричалки* -- “Рабуй, Анэксуй, Шалей, Абражай!”)

“Зранку маладзёны гупаюцца ў дзверы адзін аднаму з просьбаю пахмяліцца. Не знаходзячы ранішняй чаркі, яны ізноў гжэчна просяць грошы у мінакоў, якіх называюць *лохами,* а сам занятак *гоп-стопом.* З усіх гэтых прычынаў яны і самаіндэтэфікуюцца, як *“гопники”*, *“гопы”* і *“гопота”.* Паводле апошняга перапісу, гопнікі складаюць да 99, 98% адсоткаў ад рэпардуктыўнага насельніцтва Кацапстану”.

Разумны Мелецій не ўгледзеў галоўнага: пакаленне гопнікаў, якое выйшла на гістарычную арэну, імкліва набірала вагу. Нашчадкі старэйшага *Homo Slavianikus’*а, якія ўмелі хоць крыху думаць і аналізаваць, сталіся тупіковай галіною гістарычнага развіцця.

Неўзабаве гапаты крытычна пабольшала не толькі на вуліцах і ў кабаках, але і ў Думе, у царкоўных колах і асабліва ў Крамлі. Усе без выключэння, кацапскія манархі спрыялі гэтаму сацыяльна блізкаму элементу.

Цар Аляксей Міхайлавіч, які ўвайшоў у гісторыю, як “Гопнік Цішайшы”, аднавіў стары нацыянальны праект – “Пашырэнне ісконна кацапскіх земляў”. Шматлікія экспедыцыі былі скіраваныя ў Сібір. Так, знаны гопнік Дзяжнёў захапіў незлічоныя тэрыторыі, павыразаў амаль усіх тубыльцаў, а ацалелых прымусіў плаціць даніну футрам, пойлам, воблай і дзеўкамі. На ўсіх шляхах заваёўнікі збудавалі шматлікія блок-пасты, якія назвалі “астрогамі”. Пазнейшыя кацапскія гісторыкі аднадушныя: паняволенне Сібіры прынесла ў край культуру, цывілізацыю, усеагульны росквіт і дабрабыт.

Але ж кацапская гапата множылася ў геаметрычнай прагрэсіі. Яны ладзілі шматлікія “Саляныя”, “Медзяныя”, “разінскія” ды іншыя бунты і станавіліся небяспечнымі нават для кацапскага царызму. І тады Аляксей Міхайлавіч вырашыў нацкаваць п’яную татуіраваную хеўру на ненавісны Захад.

**Ты ж мене підманула, ты ж мене підвела...**

Ідэі гопніцтва аказаліся надзвычай заразнымі для непасрэдных суседзяў Кацапстану. Усходняя бацыла пераносілася вандроўнымі птушкамі, валацужнымі жывёламі і нават паветрана-кропельным шляхам. Кожны, хто паціскаў руку гопніку, сам неадкладна ператвараўся ў гопніка.

Так, сярод паспалітых Бульбашоў катастрафічна пашырылася ранішняе п’янства, мацюганне пры жанчынах і малых дзецях. Менавіта

тады і былі зафіксаваныя першыя выпадкі абсалютнай дэградацыі -- пераходу з мілагучнай *матчынай мовы* на мацюглівы ўсходні дыялект. Бульбашоўскія гопнікі самаідэнтыфікаваліся, як “калдыры” і імкнуліся ва ўсім малпаваць маскоўскіх братоў па розуме.

У Хахляндыі гопніцтва пакрысе набывала рысы праўдзівае пандэміі. Насельніцтва найбольш дэпрэсіўных усходніх рэгіёнаў хутарамі, куранямі, раёнамі і нават цэлымі абласцямі няўхільна выраджаліся. Спадкаемцы славутых кіеўскіх ды чарнігаўскіх князёў, забыўшыся на нажы і відэльцы, зноў пачалі тыцкаць пальцамі ў сала, смактаць з рыльца і нават цягаць за чубы кумоў. Тамтэйшыя гопнікі называлі сябе “кугутами” і рэгулярна кансультаваліся з Масквой наконт бездакорнай, з пункту гледжання Крамля, стылістыкі паводзінаў.

Палітычнай нестабільнасці паспрыялі таксама і падступныя Пшэкі, якія праз разгалінаваную сетку жыдоўскіх фаст-фудаў і ліхвярскіх банкаў неўпрыкмет прыбралі да рук ці не ўсю Хахляндыю. Крызіс крэдытавання, памножаны на пшэцка-жыдоўскую сквапнасць і агульнае падзенне нораваў, пагражаў чарговым сацыяльным выбухам.

Так яно неўзабаве і сталася...

Аднойчы ў кіеўскім шынку нейкі пейсаты нахабна адмовіўся наліваць у крэдыт казаку Тарасу са слыннага рыцарскага роду Немінайкарчмы. Справядліва пакрыўджаны ваяр выхапіў шаблю і адцяў шынкару-злодзею тое, што яму не паспелі адрэзаць ў дзяцінстве. Каб абараніць сумесны з Жыдамі бізнес, Пшэкі-мазурыкі зрабілі жорсткі наезд на мірны казацкі курань.

Тарас Немінайкарчмы ледзьве ўратаваўся ўцёкамі на Хортыцу, дзе неадкладна склікаў усіх кумаў'ёў, якіх толькі ў першы дзень набралося, мо, колькі палкоў.

Кум Слаўко Выпыпыво талерантна прапанаваў адмовіцца плаціць па ўсіх жыдоўскіх пазыках. Кум Сірко Засуньсобідышло традыцыйна параіў *перетопить всех поганцев в Днепре.* Перамагла, аднак, радыкальная прапанова кума Зіновія Багдана Хмяльніцкага: неадкладна распачаць нацыянальна-вызвольны рух.

Наступным днём запарожскае войска рушыла на пшэцкія маёнткі і жыдоўскія крамы. Зляканыя Пшэкі без ваганняў выдалі Хахлам найбольш гнюсных ліхвяроў і сквапных карчмароў, сярод якіх, натуральна аказаўся і пейсаты – арандатар той самай кіеўскай карчмы.

-- *Ну что, сынку, помогли тебе твои ляхи?* – радасна загукалі казакі і пацягнулі небараку да Дняпра.

Магчыма, хахляцкі нацыянальна-вызвольны рух і надалей ішоў бы культурна і сімпатычна, калі б да яго не далучыліся пракацапскія люмпены. Банды данецкіх кугутаў распачалі шматлікія рэйдарскія атакі на маёнткі, дзе вытваралі нялюдскія хабёльствы, аднолькава непрымальныя, як для цывілізаваных Хахлоў, так і Пшэкаў-прыгняытальнікаў. Яны брутальна гвалцілі манашак усіх канфесій, палілі кнігі і нават згрызалі ў жывых племянных парсючкоў вушы і хвасты.

Хмяльніцкі з агідай назіраў за вычварэнствамі гэтых хаўруснікаў і рабіў усё, каб пагалоска пра жахлівыя злачынствы не пайшла па свеце. І ён, і ўсе ягоныя кумаў'я моцна разлічвалі не толькі на афіцыйнае прызнанне самастойнай Хахляндыі, але і на пастаўкі зброі, ільготныя крыдыты ды дыпламатычную падтрымку міжнароднай супольнасці.

Хахляцкія дыпламаты ўжо практычна дамовіўся па ўсіх гэтых пунктах з крымскімі Басурманамі і стамбульскімі Чучмэкамі. Але ж чарговы п'яны выбрык данецкіх паставіў крыж на спадзяваннях Багдана. Падпітае кугуцццё без ведама новаабранага гетмана

Хмяльніцкага напісала і адправіла турэцкаму султану зняважлівы ліст, складзены адно з мудрагелістых кацапскіх мацюгоў. У Стамбуле смяротна пакрыўдзіліся і катэгарычна адмовіліся дапамагаць маладой дзяржаве ў супрацьстаянні з прыхаднямі.

Натуральна, Пшэкі са сваімі сатэлітамі-Жыдамі неадкладна скарысталіся момантам і зладзілі Хахляндыі эканамічную блакаду, абсалютна крытычную для новага рэжыму: усе шляхі з бравароў і вінакурняў да шынкоў і крамаў былі наглуха перакрытыя.

Данецкія, харкаўскія і нават частка кіеўскіх былі гатовыя скінуць легетымнага гетмана і канчаткова патапіць краіну ў анархіі. І тут кацапскі цар Аляксей Міхайлавіч абсалютна нечакана прапанаваў Хмяльніцкаму хаўрус. Маўляў, у яго вялізны досвед не толькі кіравання гапатой, але і змагання з іншародцамі, і таму ён можа даць рады.

Гетман нават у думках не дапускаў, што ўладар Кацапстану амаль адразу яго падмане. Адразу пасля Пераяслаўскай Рады, якая абвесціла стварэнне хахляцка-кацапскай канфедэрацыі, у краіну пасунулася шалёная колькасць маскоўскай шпаны. Іх дзікія норавы і непрыстойныя ўпадабанні жахнулі нават данецкіх з харкаўскімі. Смярдзючыя стральцы-лапатнікі называлі рэестравых казакаў з універсітэцкай адукацыяй выключна *хохлами тупорылыми,* а іх цудоўную краіну – *Хохлосрачем.*

Небарака Багдан запозна зразумеў катастрафічныя наступствы ненатуральнага саюзу з дзікунамі. Орды размаітай гапаты хаатычна расцякаліся па Хахляндыі...

Ад самага пачатку казацка-пшэцкіх войнаў Бульбашы абачліва абвесцілі нейтралітэт і выставілі на паўднёвых межах шчыльныя санітарныя кардоны. Але ж гэта не ўратавала тамтэйшы край ад чарговай навалы.

### ...з пароды рэнегатаў і дэгенератаў

Неўзабаве прыхадні без усялякага абвяшчэння вайны імкліва пакацілася на безабаронныя бульбашоўскія мястэчкі з усходу і поўдню.

Але далёка не ўсе Бульбашы ўспрынялі агрэсію ўсходняй гапаты, як ліха. Асобныя прайдзісветы, аферысты і круцялі пабачылі магчымасць дапнуцца да ўлады ці як мінімум узбагаціцца. Падчас інтэрвенцыі шматлікія бульбашоўскія рэнегаты масава здраджвалі матчынай мове, мянялі кунтушы на целагрэйкі і нават дэкляравалі палымяную любоў да *свинцовых мерзостей кацапской жизни.*

Магілёвец Канстанцін Вацлаў Паклонскі пераўзышоў у рэнегацтве абсалютна ўсіх. Як толькі ў Падняпроўі з’явіўся аб’яднаны авангард кацапскіх гопнікаў і хахляцкіх кугутаў, гэты пазашлюбны сын здрабнелага шляхціча і цыганскай распусніцы прымхліва схаваў у сене высакародную лютню і, дзеручы струны балалайкі, загарлаў апошни маскоўскі хіт: *“Ой ты, сукин сын, комаринский мужик, без штанов-портов по улице бежит!..”*

Віртуознае выкананне непатрэбшчыны расчуліла сантыментальныя сэрцы ідэйна спелых маргіналаў. Бульбашоўскага самародка пасадзілі на калёсы і даставілі ў стаўку гетмана. З павагі да інтэлегенцкага статусу Паклонскага яго паілі ўсю дарогу, і таму ў гетманскім намёце наваспечаны балалаешнік адразу ўзяў няверную ноту.

-- Зіновій Багдан Хмяльніцкі, -- афіцыйна прадставіўся нацыянальна-вызвольчы правадыр.

-- *Ніхто апроч Зені!* – выгукнуў Паклонскі і палез з абдымкамі – маўляў, ён гатовы хоць зараз выкінуць балалайку і стаць бандурыстам, абы толькі гетман прызначыў яго кіраўніком захопленых бульбашоўскіх земляў.

Натуральна, Багдану не спадабаўся непачцівы тон і не вельмі прыстойная прапанова. Каб шляхотна пазбыцца магілёўскага прайдзісвета, Хмяльніцкі паслаў яго куды падалей – да кацапскага манарха.

Хітры рэнегат адразу скеміў, якія песні спадабаюцца маскоўскім баярам. Пранікнёнае выкананне *"Сильный, державный"* імгненна навярнула Аляксея Міхайлавіча на карысць мухляра. Паклонскаму падрылі *клифт* з царскага пляча і поўны самавар гарэлкі. Да таго ж, аферыст атрымаў сапраўды дыктатарскія паўнамоцтвы і званне палкоўніка-палітрука.

Неўзабаве цыганісты палкоўнік навербаваў атрад з элітных магілёўскіх калдыроў, але не на тое, каб ваяваць. Агітбрыгада спецыялізавалася выключна на хлуслівай прапагандзе: маніла месцічам абкладзеных гарадоў пра баганосную ролю кацапскай *армии-освободительницы,* нахабна хлусіла пра гістарычную тоеснасць двух нібыта братэрскіх народаў і падступна падбівала ваяроў-абаронцаў здраджваць прысязе і пераходзіць да інтэрвентаў.

Неабазнаны ў традыцыях класічнага кацапскага *кидалова,* Паклонскі не атрымаў нават першага траншу маскоўскага крэдыту за здадзеныя гарады. Пакрыўджанаму цыганскаму байструку заставалася выцягнуць з сена еўрапейскую лютню і зноў павярнуцца тварам да Захаду. Самазваны палкоўнік нечакана прыцягнуўся ў лагер да высакароднага бульбашоўскага гетмана Януша Радзівіла, дзе надта расчулена праспяваў: *"Мой родны кут, як ты мне мілы!.."* – і знянацку згадаў пра "заходні вектар".

Размілаваны гетман-патрыёт не толькі дараваў здраду пярэваратню ў кліфце, але і ўзяў яго на службу антыкрызісным менэджэрам. Цяпер Канстанцін Вацлаў з ранейшым імпэтам і нязменным прафесіяналізмам агітаваў Кацапаў здавацца ў палон, каб далучыцца да еўрапейскіх каштоўнасцяў, сапраўднай дэмакратыі і свабоднага рынку.

-- Кацапы – гэта тыя ж Бульбашы, толькі без знаку якасці. Перакідайцеся ў нас і станавіцеся суперкацапамі! -- салодкагалоса спяваў ён перад абложанымі гарнізонамі.

Мухлярскія таленты Паклонскага набылі розгалас па ўсёй Еўропе. Неўзабаве брандэнбургскі фюрэр Фрыдрых Вільгельм даслаў прафесійнаму агітатару-ашуканцу запрашэнне адпрацаваць адзін палявы сезон легіянерам. Натуральна, Паклонскі прыняў запрашэнне без усялякіх ваганняў. Напяваючы: *"так вперед, за цыганской звездой кочевой... "* -- ён выправіўся ў Брандэнбург. Апрануты ў чорны кіцель, перацягнуты мілітарнымі скуранымі раменчыкамі, магілевец яшчэ ў парозе Рэйхсканцэлярыі шчоўкнуў абцасамі, выгукнуў: "Зіг хайль!" -- і сыграў на губным гармоніку *"Deutschland, Deutschland über alles",* чым прыемна ўразіў новага працадаўцу.

Па заканчэнні кантракту Паклонскі накіраваўся ў чарговую "гарачую кропку" -- на шведскі фронт. Але Карл Дзесяты ужо быў паінфармаваны пра гіпнатычныя здольнасці ашуканца-харызматыка. Каралеўскія камандас правялі паспяховаю аперацыю па нейтралізацыі ідэалагічнага шкодніка. Паклонскага захапілі ў палон і абачліва пасадзілі ў гуканепранікальную камеру, каб ён не спакушаў ахову падступнымі

спевамі пра любоў да шведскага стала і абяцанкамі далучыць Бульбашыю да шведскай сям'і.

Пасля вайны прафесійнага мухляра дэпартавалі на Радзіму. Бульбашы нарэшце скемілі накласці Паклонскаму забарону на прафесію і ўзяць падпіску пра няўдзел у палітычным жыцці краю.

Але менавіта з тае пары бульбашоўскія рэнегаты выкшталцона падманваюць разнастайных дэгенератаў як з Усходу, так і з Захаду.

**Окно в Европу**

Чарговы кацапскі цар Пётр Першы быў запойным алкаголікам, дэпрэсіўным псіхапатам і спрактыкаваным садыстам. Ён тысячамі сёк галовы эліце ўласнага войска, паліў безабаронныя скіты стараверaў разам з усімі насельнікамі і, шкодніцкі псуючы кацапскі генафонд, прымушаў баяраў з дваранамі курыць махорку.

Нялюдскасць учынкаў маладога манарха абуджала ў кацапскага народа пачцівасць, жах і любоў.

Яшчэ ў дзяцінстве царэвіча Пятрушу ўпадабалі Фрыцы-гамасекі з Нямецкай Слабады. Зрэшты, некаторыя паплечнікі маладога манарха аўтарытэтна сцвярджаюць, што ў псаванні царэвіча бралі чынны ўдзел не толькі берлінскія гастарбайтары, а і каўказскія гандляры з Сытнага рада. Як бы то ні было, але гэтая акалічнасць незваротна паўплывала на менталітэт палітычнай эліты Кацапстану. Менавіта з тых часоў выразы *"поставить раком", "вставить фитиль"* і *"вызвать на ковер"* сталіся ва ўсходніх суседзяў не проста фігуральнымі...

Ледзьве ўзбіўшыся на трон, малады педэраст неадкладна загадаў усім прыдворным згаліць бароды, якія заміналі аральнаму сэксу, і нацягнуць эратычна аблягальныя панталоны. Непакорных натуралаў-баяраў бязлітасна выпраўлялі на дыбу, якую абслугоўвалі дасведчаныя каты-гамасэкі.

Традыцыйнай арыентацыі паступова выракаліся нават прасунутыя маскоўскія "батанікі". Зраніцы яны прыходзілі ў Крэмль, скідалі порткі і прынізліва шнураваліся ў трона рачкі, чакаючы, што сюзэрн нарэшце адорыць іх манаршай ласкай праз задні праход і, у знак павагі, дазволіць мець аналагічныя стасункі з Радзімай. Увечары неўпадабаная манархам інтэлігенцыя жлукціла на кухнях гарэлку, шэптам скардзячыся адзін аднаму – маўляў, *мы живем, под собою не зная страны!..* Праўда, артадаксальныя прыхільнікі натуральнасці ўсё ж такі не цягаліся да цара; яны зашыліся глыбока ў падполлі, дзе неўзабаве зусім здрабнелі на мышы. Менавіта з тых часоў у кацапскай літаратуры так папулярная тэма *трагедии маленького человека.*

Бліжэйшым паплечнікам і кампан'ёнам цара-збачэнца стаўся беспрытульнік Аляксей Меншыкаў – былы вулічны гандляр чэбурэкамі. Цар Пётр не толькі надаў сацыяльна блізкаму элементу дваранскую годнасць, але і ўзнагародзіў яго красамоўным тытулам -- "мін хер". Гэты фаварыт і зрабіўся правадніком інтарэсаў чарговага пакалення маскоўскага гопніцтва; менавіта праз яго сталічная шпана і падала цару чалабітную, у якой слёзна прасіла экспартаваць на гнілы Захад маргінальную духоўнасць і кабацкую саборнасць.

-- *В Европу прорубить окно!* – узрадваўся Пётр.

-- Праўдзівы гопнік ніколі не ходзіць праз дзверы! – аўтарытэтна пагадзіўся мін хер.

Але першая экспедыцыя па прасячэнні вакна скончылася няўдала. Еўрапейцы-шведы без асаблівых высілкаў раскалашмацілі лапатнае

воінства пад Нарвай; цар з улюбёным фаварытам ледзьве ўратаваліся ўцёкамі.

Пётр быў змушаны абвесціць татальную мабілізацыю і перавесці Кацапстан на мілітарныя рэйкі. У войска пацягнулі ўсіх запар: юродзівых, карабейнікаў, скамарохаў і *калик перехожих*, якія нават не ведалі, дзе ў іх правая рука, а дзе левая. Наймакі-Фрыцы бязлітасна муштравалі аморфную біямасу камандамі:

-- *Halt! Zurük! Hende choch!* – убіваючы дысцыпліну бізунамі і прыкладамі.

Сам жа цар разам з мін херам і цэлай плоймай каханкаў пад выглядам будаўнічай брыгады падаліся на галандскія верфі – красці перадавыя прамысловыя тэхналогіі. Еўрапейцы занадта паблажліва паставіліся да сумнеўных наймакоў, і таму падступны план лёгка ўдаўся. Неўзабаве Кацапы збудавалі ўласны флот і вымуштравалі войскі на заходні капыл.

У хуткім часе Пятру коштам шалёных стратаў удалося захапіць кавалак дрыгвы ў вусці Нявы – *приют убогого чухонца.* Усцешаны манарх загадаў неадкладна будаваць на багне Паўночную Пальміру:

-- *Тут будет город заложен назло надменному соседу!*

-- Каб ставіць у ім мануфактуры, наладжваць гандаль і развіваць культуру? – ажывіліся гаспадарлівыя Фрыцы-дарадцы.

-- *Отсюль грозить мы будем шведу!* – сказаў, як абсёк, цар "Вялікія, Малыя і Белыя", сцягнуў з сябе порткі і неадкладна пагразіў праз вакно голай дупай.

Шведскі кароль Карл Дванаццаты да часу мусіў цярпець хабёльскія выбрыкі, бо меў да халеры клопатаў у Бульбашыі і Хахляндыі, куды ўжо ўвёў свае войскі. Гэты адважны, але не надта разумны маладзён даўно змагаўся за сімпатыі цывілізаваных *Homo Slavianikus'*аў у барацьбе з такім жа дурнем, як і сам – пшэцкім каралём Аўгустам Другім. Апошні не толькі не вызнаваў бульбашоўскую і хахляцкую мовы, але і нават адмаўляў гэтым народам у чалавецкае годнасці. Менавіта таму ацалелыя віленскія ды кіеўскія адраджэнцы зрабілі стаўку на больш талерантнага Карла Дванаццатага, які абяцаўся даць рады.

Аўгуст Другі, зляканы разгулам сепаратызму, легкадумна прапанаваў хаўрус цару гопнікаў. Прапанова была неадкладна прынятая: Пятру так спадабалася палохаць Захад з санкт-пецярбургскага вакна, што ён вырашыў прасекчы яшчэ два – праз Бульбашыю і Хахляндыю. Неўзабаве кацапскае войска, вымуштраванае беспрынцыпнымі еўрапейцамі, рушыла на суседнія землі.

Тагачасная Бульбашыя пасля апошняе вайны і без таго ляжала ў руіне. Здэградаваныя, апухлыя шляхцюкі сядзелі па закладзеных маёнтках, прыкідаючы, што б яшчэ такога прапіць. Паспалітае людства не ўважала гэтую п'янь нацыянальнай элітай і таму не збіралася яе бараніць. З гэтых прычынаў акупацыйны корпус з ходу захапіў слынны горад Полацк -- старажытную сталіцу Бульбашыі.

У першы ж дзень Петр са сваім мін херам дабрача насвінячыліся ў шынку. Пасля пятай пляшкі мясцовага бімберу палюбоўнікі нарэшце згадалі пра мэту паходу, убіліся на заходняе падваконне і сінхронна загалілі дупы. Але ж старажытны Сафійскі сабор недарэчна закрываў ім аператыўную прастору. Раз'юшаны Пётр загадаў неадкладна знішчыць храм парахавым зарадам, а манахаў і святароў прылюдна згвалціць.

Гэтае жахлівае блюзнерства нарэшце абудзіла Бульбашоў ад спрадвечнай млявасці і абыякавасці: на завашыўленыя парыкі акупантаў абрынулася *дубина народнай войны.* Народныя мсціўцы

бязлітасна тапілі нелюдзяў у дрыгве, пускалі пад адхон вайсковыя абозы, масава труцілі акупацыйную адміністрацыю і шматлікіх калабарантаў падробнай гарэлкай.

Імперскія орды пацяклі ў Хахляндыю, але тамтэйшая палітычная эліта ўжо як след падрыхтавалася да навалы. Хітрыя Хахлы адразу скемілі, што разваліць акупацыйны рэжым можна адно з сярэдзіны. Менавіта таму тагачасны гетман Іван Мазэпа напачатку ўдаваў, што выконвае антыгуманныя царскія загады – насамрэч ён разам з аднадумцамі рыхтаваўся да чарговай нацыянальна-вызвольнай вайны.

Кацапскія войскі, якія апанавалі край амаль што *від Сяну до Дону*, надта ўжо аддаліся п’янкам, гвалтаванням, рабаўніцтвам і паскудствам, і з тае прычыны часткова страцілі пільнасць. Мазэпа нечакана для ўсіх пасунуўся ў стаўку Карла Дванаццага і прапанаваў хаўрус супраць прыхадняў.

-- *Разом нас богато, нас не подолати!* – дэкляраваў ён відавочнае.

Пакуль Мазэпа гандляваўся з паўночным прыхаднем наконт будучыні Хахляндыі, да тагачаснай гетманскай рэзыдэнцыі Батурына падыйшло колькі палкоў усходніх акупантаў. Але ж мястэчка было добра ўмацаванае. Каб задурыць абаронцам галовы, лепшыя гопніцкія інтэлектуалы прапанавалі адукаванай казацкай шляхце братэрскі дыспут на тэму *“Почему все хохлы такие тупые?”*

-- *Amicus Kacap, sed magis amica veritas!* – гжэчна адказалі Хахлы – маўляў, хаця прадстаўнікі старэйшага *Homo Slavianikus*’а нам і сябры, але мы не тупыя, і гэтая праўда нам даражэй.

Цар Пётр, раз’юшаны звышнахабным адказам, неадкладна напісаў маніфест *«Как нам обустроить Хохлосрач?»* Згодна з ім, Меншыкаў спаліў Батурын на попел, а месцічаў, якім удалося выбрацца з агню, чацвертаваў без жалю і літасці. Пасечаных людзей святлейшы гопнік папрыбіваў цвікамі да плытоў, якія пусціў па Дысне.

Батурынская разня і сталася тым акном, праз якое цывілізаваныя еўрапейцы нарэшце пабачылі не толькі кацапскія дупы, але і нашмат страшнейшае мурло маскоўскай гапаты.

Карл Дванаццаты так і не змог даць рады. Яго добра ўзброенае, але ж невялікае войска было разбіта Кацапамі пад Палтавай. Частка казацкіх рэнегатаў традыцыйна здрадзіла законнаму гетману і перакінулася да прыхадняў. Стары, хворы і зняважаны Мазэпа ўцёк у Малдову, дзе неўзабаве памёр.

Хаця рэформы цара-педэраста і прыўнеслі ў жыццё Кацапстану знешнія змены, пераважная большасць яго насельнікаў засталася ў душы той самай *бесовской толщей,* якой і дагэтуль справядліва грэбуюць культурныя нацыі. Затое маскоўска-пецярбургскае гопніцтва, узброенае перадавымі тэхналогіямі, сталася найстрашнейшай пагрозай для еўрапейскай цывілізацыі. Зрэшты, беспрынцыпныя французы, аўстрыякі, галандцы ды іншыя шведы так і не зрабілі для сябе ніякіх высноваў, прадаючы дзікунам найноўшыя распрацоўкі адно за танную сыравіну.

### Za wolność naszą i waszą!

Анархічныя выбрыкі левабярэжных даводзілі кіеўскіх і львоўскіх інтэлігентаў да праўдзівай роспачы. Але ж шматлікія захады прышчапіць кугутам палітычную культуру штораз размываліся ўсходнімі скразнякамі. Хахляцкая эліта разумела: патрэбны новы чалавек з

нестандартным мысленнем, да таго ж, не абазнаны ў мясцовых завядзёнках і не павязаны кумаўскімі адносінамі.

З тае прычыны Хахлы-еўрапейцы звярнуліся да паўночных братоў-Бульбашоў – маўляў, можа вы каго параіце?

-- Што, парадку няма? – паспачувалі законапаслухмяныя насельнікі балотных выспаў і неадкладна адкамандзіравалі да Кіева найлепшага знаўцу Статута Вялікага Княства – адукаванага шляхцюка Піліпа Орліка з-пад Вілейкі.

Малады, але дасведчаны юрыст адразу спадабаўся Мазэпу. Піліп не жлукціў зраніцы гарэлку, не ўжываў брыдкай кацапскае лаянкі і нават не цягаў Жыдоў за пейсы. Як і ўсе бульбашы, Орлік вызначаўся памяркоўнай павагай да культуры суседзяў і здольнасцю да вывучэння моваў праўдзівых *Homo Slavianikus*'аў. У хуткім часе ён стаўся найблішэйшым дарадцам кіраўніка Хахляндыі. Пасля змушаных уцёкаў Мазэпы ў Малдову малады Бульбаш не здрадзіў легетымнае ўладзе, і таму справядліва быў абраны чарговым гетманам.

Перад новаабраным кіраўнікм стаялі задачы, якія падаліся амаль невыканальнымі. Трэба было зламіць супраціў прамаскоўскай алігархіі, распрацаваць прывабную для казацтва эканамічную праграму і здабыць міжнародную падтрымку ў справе вызвалення ўсяго краю ад кацапскай гапаты. Датаго ж, маскоўскія хаўруснікі з левабярэжных кугутаў не толькі выйшлі з падполля, алі і памнажаліся ў геаметрычнай прагрэсіі.

Орлік хутка скеміў, што закон мусі быць адзін для ўсіх – для выкшталцоных інтэлігентаў і прафесійных рабаўнікоў, для усходнікаў і захадэнцаў, для пітушчых і хворых на страўнік. Каб упарадкаваць хахляцкі жыццялад, Орлік распрацаваў адмысловую канстытуцыю, *радок бяззбройны і бясспрэчны, слабым — адзіна верны шчыт.*

Згодна новага закону, кожная праява хабёльства і гопніцтва мусіла няўхільна карацца па прагрэсіўнай шкале.

Грашовы штраф накладаўся за прылюднае калупанне ў носе, п'янку зраніцы і нематываванае вырыванне пейсаў.

Цялесныя пакаранні прызначаліся за знявагу кумаўёў, пераход у некананічнае праваслаўе і беспадстаўны пагром у жыдоўскім шынку.

Смяротная кара перадугледжвалася здраднікам Хахляндыі, душагубцам, гвалтаўнікам, вытворцам фальшаванай гарэлкі і разношчыкам мярзотнай кацапскай лаянкі.

І хаця кугуты-мацяршчыннікі масава наракалі Орліку за апошні пункт, дасведчаны заканадаўца слушна нагадаў ім, *што помиляється й народ, коли немає ще держави.*

Эканамічная праграма новага гетмана адразу прывабіла паспалітае людства. Пад лозунг канфіскацыі маёмасці, незаконна нажытай прамаскоўскімі алігархамі, сабраліся ці не ўсе палымяныя патрыёты Хахляндыі. Да кааліцыі прыяднаtotal бахчысарайскія Басурмане і стамбульскія Чучмекі, бо пагалоска пра вычварэнскія ўпадабанні Пятра Першага дайшла нават да абазнаных у гомасэксуалізме янычараў. Міжнародная вайсковая кааліцыя раскалаціла маскоўскіх акупантаў і іх левабярэжных марыянетак у Пруцкім закалоце. Педэрастычны кацапскі манарх ледзьве ўцёк ад хцівых Чучмекаў. Каб ураваць сваю дупу, ён пісьмова пабажыўся ніколі не ўблытвацца ў сувярэнныя справы Хахляндыі.

Пераможцы распачалі энергічныя рэформы краю. Прамаскоўскія алігархі былі пазбаўленыя нарабаванага майна і пабіраліся ў падземных пераходах Кіева-Пячорскай лаўры. Парэшткі кугуцця злякана прысягнулі еўраатлантычным каштоўнасцям; толькі мізэрная частка

аматараў ранішняй п’янкі і кацапскай лаянкі перашла на нелегальнае становішча.

Але ж дзейнасць Орліка сталася празмерна прагрэсіўнай. Тыя Хахлы, якія прыўлашчылі маёмасць прамаскоўскіх магнатаў, неўзабаве прыйшлі да высновы, што рэформы – вельмі зручны спосаб для набыцця земляў, але ж нязручныя для захавання. Неўзабаве новыя ўласнікі з кааліцыі захацелі той улады, якая б на сто адсоткаў гарантавала прыўлашчанае. Іх погляды зноў скіраваліся на ўсход... Да таго ж, цар Пётр правярнуў тыпова маскоўскую аферу: ён даў стамбульскім Чучмекам шалёны хабар, і тыя дэнансавалі вайсковую кааліцыю з Хахламі.

Нядаўнія хаўруснікі, якія кляліся Піліпу ў палымянай любові да Радзімы і ў прыхільнасці да еўрапейскіх кшталтаў, здрадзілі гетману. Чарговая навала азіяцкай гапаты не толькі зліквідавала палітычнае адраджэнне Хахляндыі, але і паспрыяла ганебнаму падзелу краю між новымі прамаскоўскімі кланамі і нехрысцямі-Басурманамі.

Орлік з нешматлікімі аднадумцамі падаўся на чужыну, дзе да апошніх дзён узначальваў урад ў эміграцыі, песцячы думку і пра самастойнасць Хахляндыі, і пра волю і долю роднай Бульбашыі.

**Кохайтеся, чорнобриві, та не з москолями...**

Хаця палітычныя эліты Кацапскай імперыі і дэкляравалі рытуальную нянавісць да Захаду, але ж абыйсціся без яго не маглі. Гэтая залежнасць тычылася не толькі тэхналагічных здабыткаў і прагрэсіўных ноу-хау. Няздольнасць Кацапаў да дзяржаўнага кіравання вымагала рэгулярнага імпарту ў імперыю іншаземцаў і іншаземак. Усе без выключэння імператары і імператрыцы мелі трывалыя фрыцаўскія карані; адсотак “багаабранай кацапскай крыві” ў іх жылах быў абсалютна мізэрным.

Але ж некаторыя Фрыцы, запрошаныя для кіравання Кацапстанам, моцна палохалі тамтэйшую гапату еўрапейскім радыкалізмам і надмернай цывілізаванасцю. Так, Карл Пітэр Ульрых Гальштэйн-Гаторпскі, які каранаваўся імператарам Пётрам Трэцім, адразу зліквідаваў тагачасныя спецслужбы, правёў банкаўскую рэформу, спыніў пераслед старавераў і нават вызваліў з прыгону сялянаў, якія належылі праваслаўным манастырам. Але ж калі высокамаральны фрыц катэгарычна забараніў афіцэрам збіваць падначаленых і піць на службе, трыванне санкт-пецярбургскіх элітаў скончылася. У выніку вайсковага перавароту -- традыцыйнага кацапскага спосаба змены ўлады, -- на трон была пасаджаная ягоная жонка Кацярына.

Гэтая этнічная фрыцаўка, народжаная як Сафія Фрэдэрыка Аўгуста Ангальт-Цэрбская, у дзяцінстве вызначалася ўхвальнай бюргерскай маральнасцю і краналынай любоўю да цноты. *Дівка проста, не красива, з добрим серцем, не спесива,* выхоўвалася на прынцыпах *“Drei K – “Kinder, Küchen, Kirchen”*. У сваім Фатэрляндзе яна вышывала крыжыкам, спявала лютаранскія гімны і нават даглядала валацужных жывёлаў.

Патрапіўшы ў Кацапстан, сціплая Софачка прыйшла ў жах ад тамтэйшага падзення нораваў. Але ж падступныя кацапскія паліттэхнолагі здолелі задурыць ёй голаў – маўляў, будучай імператрыцы абавязкова трэба разбэсціцца, інакш Кацапы проста не будуць успрымаць яе тоеснай.

Слабавольная фрыцаўка нядоўга працівілася азіятчыне. Выкшталцоныя жарабцы, адмыслова падабраныя дарадцамі на

гвардзейскіх стайнях, хуценька растлумачылі іншаземцы, “як у нашых эскадронах кабылаў абʼяжджаюць”. Не прайшло і колькі месяцаў, як сціплая дзеўка незваротна ператварылася ў гламурную курву.

Адразу пасля каранацыі Кацярына ўрачыста дэклявала сваім выхавацелям, што кідаецца ў бяздонны вір разбэсты – маўляў, *піду втоплюся у річці глибокій, шукати стануть -- не скоро знайдуть*. Але ж шматлікія каханкі вымагалі вялікіх грашовых выдаткаў, і гэта справакавала чарговую хвалю агрэсіі супраць суседзяў.

Першай ахвярай стала Рэч Паспалітая. На той час Супольная дзяржава Абодвух народаў канчаткова загрузла ў анархіі. Магнатэрыя, шляхта і нават дробныя засцянкоўцы цэлай Бульбашыі дэградавалі найперш ментальна, масава запісваючыся ў Пшэкаў. У Сойме панавалі татальнае бязладдзе, шалёная пыха і фантастычнае пʼянства. Кароль і Вялікі Князь Станіслаў Панятоўскі быў стацыянарным каханкам Кацярыны і таму прытрымліваўся вычварэнскіх пракацапскіх поглядаў. Як і мае быць, паспалітае людства краю не хацела бараніць пярэваратняў, што і спрычынілася да суадносна лёгкай перамогі азіятаў. Землі, захопленыя ў Бульбашоў, Жмудзякоў і Пшэкаў, юрлівая імператрыца бессаромна дарыла сваім незлічоным сэкс-партнёрам: так, спрактыкаваны прайдзісвет, картачны шаблер, фальшываманетчык і педэраст Зорыч атрымаў ад венцаноснай каханкі цэлы горад Шклоў. І Зорыч, і іншыя прыхадні не толькі высмоктвалі з краю ўсе сокі, але і ставілі за мэту дарэшты панішчыць тое, што было створана да іх.

Наступнай ахвярай азіятаў стала Хахляндыя: шматлікіх царскіх фаварытаў даўно вабілі плодныя чарназёмы Палтаўшчыны і свінагадоўчыя фермы Валыні. Але ж Запарожская Сеч магла стацца сурʼёзным чыннікам нацыянальнага супраціву. Чарговы кацярыненскі фаварыт Пацёмкін разам са сваім генералам Цякеліяй не толькі дарэшты знішчылі Сеч, але і ператварылі вольных казакаў у кацапскіх прыгонных. Зрэшты, далёка не ўсе прынялі новы парадак; кашавы атаман Пятро Калнышэўскі катэгарычна адмовіўся вызнаваць легетымнасць кацапскай акупацыі, за што і быў пасаджаны ў казамат, дзе праседзіў ажно да ста дзесяці гадоў.

Нарабаваныя грошы распусная Кацярына выдавала на шматлікія балі, гламурныя сукенкі, безгустоўную біжутэрыю і новых каханкаў, якія цяпер рахавала не штукамі, а цэлымі эскадронамі, палкамі і нават дывізіямі. У перапынках між любошчамі яна ліставалася з французскімі асветнікамі і нават чытала ілюстраваныя гламурныя часопісы, дзе пераважна цікавілася апошняй парыжскай модай і новымі спосабамі мінету. За прагу да ведаў прыдворныя халопы неадкладна прысвоілі Кацярыне тытул “самай адукаванай царыцы”.

Нечакана Бульбашы, якіх у Санкт-Пецярбургу даўно ўжо ўважалі прымітыўнымі *панамі сахі і касы*, гэткімі “кацапамі другога гатунку”, у хаўрусе з Пшэкамі паднялі паўстанне супраць акупантаў. Дасведчаны ліцьвінскі вайсковец Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка хутка зарганізаваў рух супраціву. Інсургенты, узброеныя пераважна косамі-літоўкамі і дзедаўскімі шаблямі, разбілі некалькі атрадаў азіяцкіх прыхадняў.

Спярша Кацярына не зважала на нацыянальна-вызвольны рух на балотных выспах; увесь вольны час яна бавіла на стайнях з чарговымі жарэбчыкамі. І толькі калі зразумела, што стане *пасцеллю ёй плаха*, выслала на задушку паўстання свайго самага крыважэрнага генерала Суворава. Гэты кацап праславіўся не толькі надзвычайна брутальным норавам, але і відавочна шызафрэнічным псіхаскладам. Ён панічна

баяўся люстэрак і паталагічна не зносіў свежага паветра. Штораніцы Сувораў бег у бліжэйшы куратнік, сядаў на жардзіну і голасна спяваў пеўнем. Вычварэнскі *"петушила"* бязлітасна патапіў у крыві нацыянальна-вызвольны рух, за што і атрымаў ад удзячнай Кацярыны цэлую плойму прыгонных Бульбашоў пад Кобрыным.

Рэчы Паспалітай, як Дзяржавы Абодвух народаў, больш не існавала. Сувярэннасць Бульбашыі, хай і фармальная, была знішчаная. Хахляндыя страціла нават цень аўтаноміі. Але ж сама Кацярына нядоўга цешылася тытулам уладаркі "Вялікія, Малыя і Белыя". Смерць яе была надзвычай ганебнай: царыцу смяротна паранілі дзідай ў дупу праз дзюрку палацавай прыбіральні…

Лёс гэтай некалі сціплай фрыцаўкі, недарэчна разбэшчанай азіяцкімі любошчамі, яскрава засведчыў: стасункі з барбарамі, хай нават адно сэксуальныя, спрычыняюцца не толькі да маральнай дэградацыі гістарычных асобаў, але і да знішчэння цэлых дзяржаваў.

**Pan Tadewusz**

Насельнікі балотных выспаў не маглі супрацьстаяць шматлікім хваробам, прынесеным усходнімі каланізатарамі. Сярод Бульбашоў катастрафічна пашыралася халопства, хабёльства, п'янства і інфантыльнасць. Амаль ніхто больш не цікавіўся ані спадчынай продкаў, ані нацыянальнай культурай, ані нават будучыняй уласнага краю. Бульбашоўскую дрыгву канчаткова апанавала млявасць і абыякавасць.

Адзінай дзейснай вакцынай ад усходніх бацылаў былі ідэі Свабоды, Роўнасці і Братэрства, што надыходзілі з рэвалюцыйнай Францыі. Бульбашоўскі шляхцюк Тадэвуш Булгарын не толькі ўпадабаў гэтыя прагрэсіўныя ўплывы, але і нават завербаваўся служыць да Напалеона.

Падчас сустрэчы з палітычным лідарам французаў пан Тадэвуш аргументавана давёў мэтазгоднасць адраджэння Вялікага Княства. Малады Бульбаш выдатна разумеў, адкуль сыходзіць небяспека не толькі яго Радзіме, але і ўсяму цывілізаванаму свету, і таму напалягаў на татальнай перабудове Масквы, гэтага сусветнага цэнтру агрэсіі, гандлю рабамі і рассадніку невылечных азіяцкіх хваробаў.

Прамова Булгарына прагучала надзіва пераканаўча; неўзабаве войскі аб'яднанай Еўропы рушылі на Ўсход. Французскі імператар стрымаў слова -- першым жа яго крокам стала аднаўленне Вялікага Княства са сталіцай у Вільні. Бульбашы – як шляхта, так і паспалітае людства, -- нарэшце абудзіліся ад летаргічнага сну. Юнакі тысячамі запісваліся ў еўрпейскае войска. Банапарт планаваў і аднаўленне Хахляцкае дзяржавы, якая мусіла атрымаць неафіцыйны назоў "Напалеаніда". На маскоўскі ж трон мелася пасадзіць не чарговага фрыца, а этнічнага нашчадка *Homo Slavianikus*'а.

Кацапы панічна пабеглі ад еўрапейцаў у свае азіяцкія стэпы. Пасля перамогі над царскімі войскамі пад Барадзіном кааліцыя аб'яднанай Еўропы падыйшлі да Масквы.

Азіяцкая сталіца надзвычай уразіла Банапарта. З засмечаных вуліц цягнула ядучым смуродам, за пархатымі валацужнымі сабакамі бегалі кухары з даўжэзнымі нажамі, а ці не кожны другі дом упрыгожвала шыльда "КАБАКЪ". Спаліць гэты рассаднік анысанітарыі было значна танней, чым дэзынфекаваць. Дасведчаныя еўрапейскія санітары павыганялі з Масквы заўшыўленых мешканцаў, абнеслі горад дротам і падпалілі з чатырох канцоў; на котлішчы планавалася збудаваць нармалёвую сталіцу.

Капітан еўрапейскіх войскаў Булгарын зачаравана назіраў, як гарачае полымя нішчыць смярдючыя кварталы; *заметался огонь голубой, позабылись родимые дали.*

Банапарт выдатна разумеў пачуцці бульбашоўскага хаўрусніка.

-- *Твой народ дачакаецца залацістага яснага дня!* – падбадзёрваў француз пана Тадэвуша. -- *Паглядзі, як усход разгараецца, колькі ў хмарках залётных агня!*

У хуткім часе еўрапейскія інжынеры ўжо планавалі на месцы спаленых халабудаў шырокія праспекты з бібліятэкамі, школамі, тэатрамі і вошабойкамі. Сам жа Банапарт выдаў маніфест, у якім запрапанаваў Кацапам на ўсеагульных, прамых і роўных выбарах самастойна абраць кіраўніка-супляменніка.

Але ж наіўныя еўрапейцы ў каторы раз пралічыліся. Кацапскія гопнікі паталагічна не зносілі чысціні, культуры і цывілізацыі; хранічны педыкулёз, закарэлы бруд і кабацкі куродым былі іх роднай стыхіяй. Многія спадкаемцы старэйшага *Homo Slavianikus*'а, пазбаўленыя звыклага асяродку, хаатычна збіваліся ў сапраўдныя *воўчыя зграі.* Тэрарысты, узначаленыя палявымі камандзірамі, ладзілі падступныя напады на еўрапейцаў, прытым цырульнікі і дактары вынішчаліся ці не першымі.

Лютая зіма змусіла Банапарта да тактычнага адыходу на захад. Кепскія дарогі і дурнаватае насельніцтва не спрыялі гэтаму адступленню; дзве традыцыйныя кацапскія праблемы спрычыніліся да знішчэння экспедыцыйнага корпуса не менш за кулі, шаблі і гарматныя ядры. Неўзабаве змерзлыя, што тыя цуцыкі, еўрапейцы падыйшлі да Бярэзіны.

Банапарт галадаў і змярзаў разам з усімі. Гледзячы на бясконцыя снягі, ён штораз цешыўся ўспамінамі пра пажар Масквы.

-- *Пригадуєш той смак жаркої ночі?* – штораз пытаўся ён пана Тадэвуша.

-- *Займався захід – і згорали сни!* – звыкла адказваў той.

Пры пераправе ці не большасць еўрапейскага войска патанула, толькі нямногія здолелі дабрацца да сваіх земляў.

Пан Тадэвуш мужна змагаўся за высокія ідэалы Свабоды, Роўнасці і Братэрства, пакуль не патрапіў у палон да Фрыцаў, традыцыйных хаўруснікаў кацапскага цара. Неўзабаве Булгарын зноў павярнуўся ў Кацапстан у звыклай для сябе ролі цывілізатара: ён стварыў для неабазнаных усходніх суседзяў жанр прыгодніцкага рамана і навучыў іх камерцыйнаму кнігавыдавецтву.

Сам жа Банапарт пасля доўгіх ліхтугаў быў сасланы на далёкую выспу.

Толькі перад смерцю былы правадыр французаў нарэшце скеміў прычыну зімовай паразкі. Ані Француз, ані Кацап проста па вызначэнні не маглі займаць маскоўскі трон. Праўдзівым кацапскім манархам мог быць толькі этнічны Фрыц...

**Наука ненависти**

Пасля бліскучай перамогі Кацапаў над ідэямі Свабоды, Роўнасці і Братэрства жахлівая імперыя распрастала свае чорныя крылы над усёй Еўропай.

Агенты кацапскай выведкі снoўдаліся па заходніх краінах у пошуках уцекачоў-апазіцыянераў, якіх стралялі, душылі і труцілі. Барадатыя папы-сексоты, парушаючы таямніцу споведзі, навыперадкі

пісалі даносы на дысідэнтаў. У акупаваных землях Хахлоў і Бульбашоў была створаная адмысловая сетка “вайсковых селішчаў”, дзе звераватыя камандзіры шпіцрутэнамі рабілі з тубыльцаў паслухмяных імперскіх зомбі. Гэтую палітычную мадэль, названую тагачаснымі ідэолагамі *“самодержавие, православие, спецслужбы”*, мелася распаўсюдзіць на ўвесь свет.

Сціплыя пратэсты еўрапейскіх праваабаронцаў нязменна сутыкаліся з пагрозай: маўляў, у нас сувярэнная дэмакратыя, а каму яна не падабаецца, мы нашай пшаніцы не дамо! І сапраўды: надзвычайная плоднасць хахляцкіх чарназёмаў, прыўлашчаных кацапскімі лаціфундыстамі, давала выдатную магчымасць шантажаваць цывілізаваны свет.

Але ж канчаткова псаваць адносіны з Захадам нікому не хацелася.

Кацапскія памешчыкі рэгулярна прасаджвалі родныя маёнткі, родныя лясы, родныя палі і нават прыгонных суайчыннікаў ў бадэн-бадэнскіх казіно і гамбургскіх бардэлях. Іх жонкі круцілі раманы на курортах Маравіі і лекаваліся ад трыпака ў клініках Швейцарыі. Іх каханкі замаўлялі парыжскія капелюхі і венскія пальчаткі. Перспектыва стаць пажыццёва невыязнымі вельмі палохала VIP-аў імперыі.

Аляксандр Бенкендорф, кіраўнік тагачаснай дзяржаўнай бяспекі, разумеў лепш за іншых: для маральнага апраўдання імперскага гопніцтва трэба тэрмінова стварыць чарговы міф пра “духоўную перавагу Кацапстана над усім астатнім светам”. Гнілому Захаду мелася давесці, што палітычныя эліты дзікіх стэпаў не толькі ідэйныя гандляры рабамі, паталагічныя садысты, перакананыя цемрашалы, скончаныя лайдакі і хранічныя алкаголікі, але ж *может собственных Платонов и быстрых разумом Невтонов кацапская земля рождать.*

Цару Мікалаю ініцыятыва спецслужбоўцы прыйшлася даспадобы.

-- *Из всех искусств для нас важнейшим является литеретура!* – нагадаў ён і выправіўся ў Вышэйшы цэнзурны камітэт, паліць забароненыя заходнія кнігі.

Бенкендорф неадкладна даручыў сваім лепшым філолагам у цывільным прааналізаваць, што ж з тагачаснай кацапскай літаратуры можна рэпрэзентаваць на Захадзе, як “праявы высокай духоўнасці”. І тут спецслужбоўцаў чакала прыкрая неспадзяванка. Высветлілася, што тамтэйшыя шрайбікусы намайстрачыліся працаваць толькі ў трох традыцыйных для Кацапстана жанрах. Увагу аналітыкаў прывабілі ўзнёсла-халуйскія гімны Дзяржавіна, бессэнсоўна-трагічныя енкі Радзішчава і парнаграфічна-мацюглівыя паэмы Баркова. Падобная эрзац-літаратура магла зацікавіць хіба што эрзац-інтэлігентаў, нешматлікіх “батанікаў” з Маскоўскага і Санкт-Пецярбургскага універсітэтаў. Прапаноўваць гэтыя сумнеўныя творы прасунутаму Захаду відавочна не выпадала.

Зрэшты, у тагачасным Кацапстане быў сапраўды варты літаратар і філосаф Пятро Чаадаеў. Але ж ягоны талент выглядаў настолькі яскравым, а думкі такімі радыкальнымі, што яго неадкладна абвесцілі вар'ятам…

Кіраўнік спецслужбаў быў на мяжы правалу; час ішоў, а вартых выканаўцаў царскага загаду так і не знаходзілася.

І тут, начакана для многіх, свае літаратурныя паслугі імперыі запрапанавалі іншародцы: хахол Гогаль, бульбаш Дастаеўскі, шатландзец Лермантаў і нават эфіоп Пушкін.

-- *Покажете нам красивых живчиков на красивых ландшафтах?* – не паверыў Бенкендорф.

-- *Красота спасёт мир!* – аднагалосна запэўнілі іншародцы.

Натуральна, спецслужбы доўга марудзілі з адказам: даручаць дзяржаўную замову такім падазроным асобам не надта і хацелася. Але ж цар Мікалай паклаў канец усім ваганням

-- *У меня нет для вас других писателей, товарищ Бенкендорф!* – канстатаваў ён.

-- *Кадры решают все!* – аддана пагадзіўся шэф таемнай паліцыі.

Па хуткім часе чацьвёрка іншародцаў бліскуча здзейсніла нацыянальны праект пад назовам "Вялікая Кацапская Літаратура". Але нават самыя прасунутыя цэнзары не ўгледзілі галоўнага: плён літаратурнай працы стаўся сапраўднай ідэалагічнай дыверсіяй. Відавочна, што і Пушкін, і Лермантаў, і Гогаль, і Дастаеўскі люта ненавідзелі імперскі Кацапстан, а таму свядома стваралі антыгуманныя творы, ставячы за мэту канчатковую духоўную дэградацыю насельнікаў імперыі. Перад чытачом паўстала цэлая галерэя маральных уродаў, якіх пісьменнікі-шкоднікі адмыслова пазіцыянавалі ў якасці станоўчых персанажаў: душагубы ў вавёркавых тулупах, цынічныя афіцэры-вычварэнцы з Каўказскага фронту і нават брутальныя губіцелі ўласных сыноў. Але ж усіх іх пераўзышоў студэнт-неўрасценік, спрактыкаваны серыйны забойца...

Менавіта этнічны бульбаш Дастаеўскі заразіў і без таго агрэсіўную кацапскую свядомасць літаратурна-тэрарыстычнай бацылай: усе жыццёвыя праблемы варта вырашаць адно пры дапамозе сякеры. Гэтая *наука ненависти* ў канчатковым выніку і сталася той матэрыяльная сілай, якая перадвызначыла і развал імперыі, і яе канчатковы скон.

Але ўсе гэтыя антыгуманныя творы яшчэ доўга ўважалася ў Кацапстане самымі вялікімі, светлымі і духоўнымі. Што вельмі дзіўным чынам характэрызуе тамтэйшае грамадзства.

### ...кровавую пищу клюет под окном!

Неўзабаве моднае бульбашоўскае пытанне *"тварь я дрожащая или право имею?"* загучала паўсюдна: у свецкіх салонах і ў смярдзючых кабаках, у бардэлях і на вайсковых плацах, у шахтах, у лясах, у стэпах, у палях, у тундрах і лесатундрах. Натуральна, амаль усе насельнікі Кацапстану адразу прыгадалі, што маюць нейкія "правы". Але ж вытлумачэнне гэтых правоў дыяметральна рознілася – у залежнасці ад светапоглядаў контрагентаў, а таксама іх паходжання, выхавання, тэмпераменту і ступені дэбільнасці.

Правапераемнікі старэйшага *Homo Slavianikus*'а ведалі ці не з пялюшак: кожны, хто не ўважае Кацапаў за самую богаабраную, культурную, прыгожую, разумную, высокародную, працалюбную і добрую нацыю, ёсць безумоўным ворагам. Але ж абсалютная большасць богаабраных, разумных і працалюбных жыло ў жахлівай галечы, сярод занядбаных палёў і запаскуджаных пашаў. Суцэльная няшчымніца рэгулярна чаргавалася з праўдзівым галадаморам. Згаладалыя Кацапы паціху пачалі жэрці ўсіх, каго лічылі вінаватым у сваім паганым жыцці – іншаверцаў, іншародцаў і іншадумцаў. Менавіта ў гэтым яны і бачылі сваё натуральнае права...

Так традыцыйная кацапская неталерантнасць, памножаная на рэгулярную галадуху, спарадзіла абсалютна новую грамадска-палітычную плынь – людажэрства. Прыхаваныя і не надта прыхаваныя людажэры сустракаліся сярод манархістаў і педэрастаў, дэмакратаў і натуралаў, народнікаў і заходнікаў. Прынцып паядання ідэйнага ворага

заставаўся нязменным, але гастранамічныя ўпадабанні розніліся: калі ў Зімовым палацы чалавечыну падавалі пад вытанчаным еўрапейскім соусам, дык у кабаках для славянафілаў мяса запякалі з цыбуляй і хрэнам. У шматлікіх кухмайстарскіх кнігах, распрацаванымі санкт-пецярбургскімі паліткулінарамі, даводзілася, што людажэрства ёсць найвышэйшай праявай існіна кацапскай духоўнасці.

Нашчадкі сярэдняга *Homo Slavianikus*'а вырашылі рэалізаваць свае права на родныя звычаі, родную мову і родную культуру. На той час

лепшыя сыны Хахляндыі нарэшце пазбавілася нематываванай казацкай брутальнасці і прагі да рабавання. Тыповым прадстаўніком тамтэйшай эліты быў ужо не падпіты крымінальнік у прапаленых шараварах, а сціплы інтэлігент з моцным комплексам вінаватасці за зладзеяватых продкаў.

Лідарам сціплай хахляцкай інтэлігенцыі стаўся знаны кіеўскі прафесар Антановіч. Зарганізаваная ім грамада хахлафілаў кансператыўна збіралася ў этнаграфічных дэкарацыях, каб пакрасавацца ў палтаўскіх вышыванках, выпіць вішнёвай наліўкі і шэптам праспяваць *“Ще не вмерла”*.

Але нават такая бясшкодная павага да сваіх правоў выклікала ў Кацапстане шалёную нянавісць. Тагачасны цар Александр Другі, хаця і меў мянушку “Вызваліцель”, насамрэч быў ідэйна перакананым людажэрам. Дазнаўшыся пра кіеўскіх інтэлігентаў, ён неадкладна выклікаў Антановіча ў Зімовы палац, дзе катэгарычна запэўніў, што *никакого хохляцкого наречия не было, нет, и быть не может.* Але ж у палац маглі завітаць еўрапейскія назіральнікі, і таму цар літасліва дазволіў Антановічу выказацца: маўляў, у нас самая дэмакратычная імперыя ў свеце, дзе нават ідэйныя ворагі маюць права на пэўнае іншадумства.

-- Ну ты, свядомы, у цябе ёсць хоць якія думкі? – запытаўся венцаносны канібал.

Прафесар стрымана адкашляўся.

-- *Думи мої, думи мої, лихо мені з вами!* -- толькі і паспеў прамовіць ён, як быў імгненна абвінавачаны ў дзяржаўнае здрадзе, пашматаваны і засунуты ў лядоўню.

Наступным днём кацапскі манарх выдаў цыркуляр, у якім катэгарычна забараніў хахляцкім інтэлігентам гатаваць боршч, есці сала, куміцца з сябрамі, чытаць кніжкі роднай мовай і, вядома ж, карыстацца рушнікамі.

-- *Когда придет и вам помирать, бугаи, будете вы хрипеть, царапая край матраса, строчки из Александра, а не брехню Тараса!* – пыхліва падсумаваў напрыканцы цыркуляра цар Александр.

На гэтым усе хахляцкія правы і скончыліся…

Спадкаемцы малодшага *Homo Slavianikus*'а задаліся больш матэрыялістычным пытаннем: ці маюць яны права *на лусту хлеба, на родны край?* Сімпатычны бульбашоўскі дыктатар Кастусь Каліноўскі не толькі даў адказ на гэтае пытанне, але і выдаў праграмму, як яго дасягнуць: маўляў, толькі тады Бульбашы зажывуць шчасліва, калі над імі кацапскага людажэра не будзе.

Каліноўскі заручыўся падтрымкай пшэцкіх калегаў і распачаў змаганне *за волю і долю.*

Напачатку ўсё ішло някепска: *партызаны, бульбашоўскія сыны* разбілі некалькі атрадаў прыхадняў. Да паўстання далучыліся і сяляне, бо пецярбургска-маскоўскае людажэрства прынцыпова супярэчыла народнай маральнасці і балотнай ментальнасці. Кацапскія памешчыкі

панічна пабеглі ў свае еўразійскія стэпы. У пакінутых маёнтках інсургенты пазнаходзілі горы чалавечых костак са свежымі лахманамі мяса.

Магчыма, нацыянальна-вызвольны рух меў бы больш удалы працяг, каб не пыхлівыя Пшэкі, якія найперш марылі пра аднаўленне унітарнай Рэчы Паспалітай. Лозунг *"Jeszcze Pszecka nie zginęła, kiedy my żyjemy"*, можа і натхняў галодных кацапскіх генералаў гастрыць нажы і відэльцы, але ж нічога не абяцаў Бульбашам. Да таго ж, нездароўчая амбітнасць варшаўскіх кіраўнікоў паўстання прыўносіла ў супрацю суцэльны разлад.

Гэтым неадкладна скарысталіся ў Санкт-Пецярбургу. Галоўным душыцелем інсургентаў стаўся генерал Мураўеў, спрактыкаваны мяснік з санкт-пецярбургскай палітычнай кухні. Яшчэ малым кухаронкам Мураўеў жыўцом падвешваў людзей на гачыкі і згрызаў мяса з лытак, за што і атрымаў мянушку "Вешальнік". Гэтага вечна галоднага канібала баяліся нават кацапскія чалавекалюбівыя ліберады.

Мураўеў скеміў адразу: задушыць паўстанцаў сіламі адно Бульбашоўскай вайсковай акругі не выпадае. Для дасканалага выканання царскага загаду Вешальнік выпісаў колькі дывізій дасведчаных антрапафагаў з Каўкаўскага фронту. Аднак перамагчы каліноўцаў атрымалася адно пры дапамозе здрады: чарговы бульбашоўскі юда запрадаў нацыянальнага лідара ці не за шэляг медны.

Але ж нават страта дыктатара не спыніла вызвольнага руху. Разумеючы, што зацятых Бульбашоў не выпадае перадолець адно сілай, Мураўеў са сваімі прыхільнікамі практыкавалі бязглуздыя правакацыі і прымітыўныя падлогі. У кватэры і хаты змагароў падкідалася лубочная парнаграфія і наркотыкі, якія, са словаў мураўёўскіх піаршчыкаў, нібыта дасылаліся з Захаду. Універсітэцкія сталовыя ладзілі масавыя канібальскія вячэры; прагрэсіўных студэнтаў, якія адмаўляліся брацць у іх удзел, неадкладна выганялі з навучальных установаў. Аднак *"Праграма Каліноўскага"* аказалася надзіва жыццяздольнай: перманентнае паўстанне доўжылася ў Бульбашыі ажно да канчатковага яе вызвалення ад прыхадняў у XXI стагоддзі…

Тым часам людажэрскія ідэі авалодалі шырокімі народнымі масамі Кацапстану. Чалавекалюбцы-разначынцы выяўляліся куды галаднейшымі за палітычныя і гаспадарчыя эліты імперыі. Неўзабаве лядашчыя дэмакраты нават стварылі свае палітычныя рухі і партыі. Так, канібальскі саюз "Народная воля" ставіў за мэту усталяванне справядлівага дзяржаўнага ладу, дзе кожны людажэр будзе забіваць толькі тых, каго зможа рэальна з'есці. Народавольцы меркавалі, што для пабудовы такой дзяржавы спярша неабходна забіць і зжэрці галоўнага імперскага канібала, і тады, маўляў, на зямлі настане праўдзівы рай.

Але ж толькі Кацапы маглі даручыць забойства цара чалавеку з прозвішчам Халтурын. Страта, як і мае быць, праваліўся; людажэры-рэакцыянеры заарыштавалі канібалаў-дэмакратаў і пажэрлі амаль усіх дарэшты. І толькі бульбашоўскі народны мсцівец Ігнацій Грынявіцкі здолеў справядліва адпомсціць цару *за няволю, за кайданы.*

Неўзабаве прывід чалавекаедства апанаваў усю Еўропу. Адпаведныя партыі былі створаны ў Лондане, Парыжы, Вене, Рыме і Берліне. Прыўладныя людажэры імкнуліся сілкавацца коштам заморскіх калоній. Іх ідэйныя апаненты меркавалі, што, калі ўлада насмокчацца чужое крыві, яе трэба забіваць, рыхтык кабана. Пры гэтым санкт-пецярбургскія канібалы люта ненавідзелі берлінскіх калегаў, а венскія – рымскіх.

Ідэйныя спрэчкі паміж еўраатлантычнымі і еўразійскімі людажэрамі сталіся прычынай жудаснай Сусветнай вайны, якая не толькі спрычынілася да жахлівай загібелі мільёнаў людзей, але і цалкам перакроіла мапу свету…

**Коли потяг у даль загуркоче…**

Пасля адрачэння імператара-людажэра Мікалая Крывавага і развалу Кацапскай імперыі да верху пнуліся сотні партый і тысячы лідараў. Перамагла, аднак, жменька крывасмокаў-радыкалістаў, якая і захапіла ўладу дзякуючы берлінскім грантам.

Тым часам мешканцы былой імперыі радасна разбягаліся ад пецярбургска-маскоўскіх канібалаў па сваіх хутарах, балотных выспах, юртах, саклях, кішлаках і нават пячорах. Але крывасмокі новай фармацыі здолелі адлавіць ці не большасць уцекачоў. Каго падманам, а каго і з мусу пасадзілі ў даўжэзны цягнік, які нібыта ішоў па маршруце "Сённяшні дзень – Светлая будучыня" і шчыльна пазачынялі ўсе дзверы. *Свіснуў раз, свіснуў два шустры паравозік, і павёз, і павёз за возікам возік.*

Жахлівы чорны лакаматыў, аздоблены чырвонай зоркай і кумачовым лозунгам "Людажэры ўсіх краін, яднайцеся!", цягнуў за сабой безліч вагонаў. Непасрэдна да паравоза чапляўся агромністы вагон-зак, куды ахова зганяла ўсіх нязгодных з раскладам і накірункам. Наступным каціўся вагон-рэстарацыя, у якім чыгуначная эліта жэрла найбольш апетытны кантынгент з вагон-зака; неўпадабаных проста кідалі ў паравозную топку. Каб водар смажанага мяса з рэстарацыі і смурод перапаленых костак з топкі не сягаў чыгуначных станцый, крывасмокі-адмыслоўцы скляпалі шчыльныя сталёвыя фіранкі, якія назвалі "жалезнай заслонай" і насунулі на вокны.

Кіраўніцтва з машыністаў, качагараў і ахоўнікаў вагон-зака жыло ў штабным СВ, наведваць каторы ўсім астатнім пасажырам катэгарычна забаранялася. Наступныя вагоны фармаваліся паводле нацыянальнага прынцыпу: вагон Кацапаў, вагон Хахлоў, вагон Бульбашоў, вагоны Чурак, Хачаў, Урукаў… Кожны такі вагон узначальваў дасведчаны праваднік, прызначаны непасрэдна з СВ; менавіта ён і размяркоўваў баланду з буфета. Усім без выключэння пасажырам штовечар налівалі па шклянцы гарэлкі -- падпітыя амаль не аказвалі супраціву, калі іх цягнулі ў топку. Але ж і саміх праваднікоў пільнавалі суворыя ахоўнікі з касцетамі, фінкамі, пісталетамі і аўтаматамі. Каб шлях да Светлай будучыні не падаўся сумным, у штабным вагоне прыдумалі захапляльную гульню: "настучы на падарожніка раней, чым ён настучыць на цябе". Да купэ праваднікоў адразу пашнураваліся шалёныя чэргі.

Уцячы з цягніка ці нават праветрыць вагон было амаль немагчыма: ахова страляла без папярэджання нават пры сціплай спробе апусціць шкло. Сам жа цягнік замыкала вялізная бронеплатформа з кулямётамі, самалётамі і танкамі.

*Вагоны шли привычной линией, подрагивали и скрипели.* Грукалі нажы на кухні, у паравозную топку валіліся ўсё новыя і новыя насельнікі вагон-зака. Праўда, некаторыя маральныя ахвяры кшталту кацапа Шаламава гучна абураліся – маўляў, людажэрства супярэчыць нашым нацыянальным трыдыцыям, і таму мы не жадаем лезці ані ў паравозную топку, ані на патэльню вагона-рэстарацыі. Самыя адважныя нават дэкларавалі, што чыгуначны састаў ім абсалютна чужы, а іх родны край

зараз далёка, бы тыя *бацькаўскія гоні.* Для падобных скептыкаў чытаўся выхаваўчы спецкурс – маўляў, *можеш вибирати друзів і дружину, вибрати не можна тільки Батьківщину,* ваша сапраўдная Радзіма -- паравозная топка і кухарскі стол, так што пра іншы выбар і не думайце. Нарэшце ў СВ скемілі: каб пазбегнуць форс-мажораў і надалей, усе нацыянальныя адметнасці трэба бязлітасна вынішчыць, а саміх пасажыраў уніфікаваць. Так была прыдуманая новая нацыянальнасць *Bydlarus Vulgarus,* якая ставіла за мэту татальнае адмаўленне ад уласных традыцый, спадчыны продкаў і нават уласнае мовы. Першымі ў гэтую чыгуначная супольнасць запісаліся былыя Бульбашы, бо многім з іх надта хацелася наблізіцца да вагона-рэстарацыі.

Машыністы некаторых сустэчных цягнікоў выклікалі ў СВ суцэльную агіду, а некаторыя -- наадварот, шчырую ідэйную павагу.

Галоўным ворагам цягніка з чырвонай зоркай былі абвешчаныя амерыканскія і еўрапейскія лакаматывы. І хаця абсалютная большасць *Bydlarus Vulgarus* ніколі не выходзіла са сваіх купэ, па ўсім цягніку ад рана да рана лаялі амерыканцаў і еўрапейцаў за антысанітарыю ў іх занядбаных вагонах і няправільны накірунак.

А вось лакаматыў па маршруце “Сённяшні дзень – Тысячагадовы Райх”, аздоблены тэўтонскім крыжам, выглядаў у вачах чырвоназорных машыністаў надта ўжо сімпатычным. Сяброўства з тэўтонскімі качагарамі-машыністамі спрычынілася да падзелу сціплага пшэцкага цягніка, які, стоячы на запасным шляху, нават нікуды і не рухаўся. У той жа час чырвоназорны цягнік падоўжыўся і на тры балтыйскія вагоны. Каб улагодзіць новых пасажыраў-Жмудзякоў, крывасмокі з СВ вырашылі падарыць ім ці не лепшае бульбашоўскае купэ “Вільня”; якое Жмудзякі неадкладна пераназвалі на “Вільнюс”.

Невядома, якія яшчэ падзелы маглі напаткаць сусветныя лакаматыўныя дэпо, але ж раптам машыніст тэўтонскага паравоза скіраваў свой цягнік акурат насустрач лакаматыву з чырвонай зоркай. Пасля доўгага і крывавага супрацьстаяння цягнік *Bydlarus Vulgarus* пусціў пад адхон ідэалагічна блізкі тэўтонскі састаў. Да паравоза з чырвонай зоркай далучылася процьма новых вагонаў з Цэнтральнай Еўропы...

Час ляцеў, за вокнамі праплывалі абрыдлыя дзесяцігоддзямі краявіды. Састарэлыя кулямёты і танкі на бронепляцоўцы змянілі атамныя бомбы з балістычнымі ракетамі. Радыёкропка са штабнога вагона паведамляла штораніцы: Светлая будучыня зусім блізка, яе ўжо відно з паравознай кабіны. Але ж пасажыры моцна засумняваліся: маўляў, гэтую перадачу мы чуем шмат гадоў, але жыццё тым часам толькі пагаршаецца: з вагонных буфетаў пакрысе знікае каўбаса, а гарэлка становіцца зусім нясмачнай. Некаторыя радыкалы нават уважалі, што цягнік насамрэч даўно загнаны ў тупік, а рух адно ўдаюць прапагандысты і агітатары, якія стаяць на пероне за вокнамі і сінхронна махаюць галінкамі. Большасць жа была перакананай, што цягнік проста ідзе па коле.

У канчатковую мэту вандроўкі пераставалі верыць нават самыя дурныя пасажыры з былых Бульбашоў. Эліта з СВ – і тое нападпітку зацягвала трагічнае: *“Товарищ, я вахты не в силах стоять, -- сказал кочегар кочегару, -- огни в моей топке совсем не горят, в котлах не сдержать больше пару...”* Узброеная ахова загрузла ў маральна-побытавай распусце і таму выглядала больш памяркоўнай. Скарыстаўшы гэта, некаторыя чыгуначнікі саскоквалі на станцыях, каб

перасесці ў камфортныя еўрапейскія электравозы і хуткасныя амерыканскія экспрэсы.

Нарэшце, чарговая змена машыністаў адкрыта заявіла, што расклад няправільны, але ва ўсім вінаватыя не яны, а стрэлачнікі, якія пусцілі цягнік у адваротным накірунку. Ахова канчаткова запіла, вагоны захісталіся, самыя адважныя пасажыры паапускалі вокны з каламутным шклом і нават паскідалі сталёвыя фіранкі. Дзівосныя краявіды і свежае паветра назаўсёды агламошыла вагонных сядзельцаў...

Але ж апошняй кропкай сталася закрыццё буфетаў. Аднойчы ўвечары падарожнікаў агламошыла радыяграма са штабнога вагона: у цягніку ўводзіцца "сухі закон". Зляканае людства кінулася да праваднікоў, і тыя пацьвердзілі жахлівую навіну. Зрэшты, прычынай антыалкагольнай кампаніі стаўся не клопат пра здароўе пасажыраў; проста ў бойлерах СВ скончылася сырая нафта, з якой традыцыйна выраблялі гарэлку для людства.

Як і мае быць, праз колькі гадзінаў пасажыры працверазелі і адразу згадалі, што яны ніякія не *Bydlarus Vulgarus,* а Кацапы, Хахлы, Чэбурэкі, Хачы, Чуркі і нават Бульбашы. Стомленыя доўгай дарогай падарожнікі хуценька паадчаплялі свае вагоны і перасунулі іх на нацыянальныя рэйкі.

Аднак раптоўную свабоду атрымалі не толькі паспалітыя пасажыры, але і шматлікія ахоўнікі спецвагонаў. Спрактыкаваныя забойцы, маньякі, садысты, людажэры і крывасмокі, абвешаныя размаітай зброяй, прычапіліся да нацыянальных вагонаў і нават сталіся ў некаторых пажыццёвымі праваднікамі.

**Пайсці і не вярнуцца**

Каб юрыдычна засведчыць катастрофу чырвоназорнага цягніка, лідары Кацапаў, Хахлоў і Бульбашоў з'ехаліся ў Белавежу. Было сказана шмат цёплых словаў і выпіта да халеры розных напояў. Напрыканцы братэрскай сустрэчы расчуленыя палітыкі паабяцалі пазабыцца на ўсе крыўды і распачаць добрасуседзскія адносіны з чыстай старонкі.

Але ж гэтыя абяцанкі сталіся марнымі...

Найбольш радавітыя машыністы, качагары і ахоўнікі, якія таксама паразбягаліся са спецвагонаў, вырашылі ўзнагародзіць сябе за марудны і доўгі шлях. Эліта з СВ хуценька прыватызавала нацыянальныя бізнэсы, папрадавала ўсе, што было магчыма, і папераводзіла капіталы за мяжу, пасля чаго ўцякла туды і сама. Дробныя вертухаі вагон-зака, усе гэтыя *дети бывших старшин и майоров,* папрысвойвалі адзін аднаму генеральскія званні і распачалі дзяльбу таго, што не паспелі скрасці іх папярэднікі.

Зрэшты, дэталёвы аналіз прыўлашчанага даў досыць сумны плён: за ўвесь час свайго існавання Кацапстан так і не навучыўся выпускаць аніводнага канкурэнтнага прадукта -- за выключэннем хіба што аўтамата Калашнікава, да і той быў спісаны з фрыцаўскай штурмавой вінтоўкі "Штурмгевер".

Аднак у Кацапстане яшчэ заставалася да халеры энэрганосьбітаў. З тае прычыны нафтагазавая труба стала новым сымболем новай імперыі. У заходнім кірунку труба пампавала нафту і газ, а ва ўсходнім – даляры, якія выдаваліся пераважна на брытанскія лімузіны, швэйцарскія гадзіннікі, французскі парфум, калумбійскі какаін і амерыканскі віскі. Пры гэтым Кацапы традыцыйна лаялі Захад і Амерыку за амаральнасць і бездухоўнасць. Энерганосьбіты і грошы транзітаваліся пераважна праз

землі Бульбашоў і Хахлоў, і гэтая акалічнасць передвызначыла далейшыя адносіны ўсіх трох народаў.

Палітычныя лідары Кацапстану рэгулярна запрашалі хахляцкіх і бульбашоўскіх калегаў у Маскву, каб атрымаць справаздачу пра тэхнічны стан трубаў. Сустрэчы зазвычай праходзілі ў адмысловай рэстарацыі на апошнім паверсе Спаскае вежы; з такой вышыні ўладары трубы заўсёды маглі паглядзець наўсцяж, каб спраўдзіць атрыманую інфармацыю. Напіваючыся, чарговы лідар Кацапаў біў кулаком па сталу, даводзячы гасцям сваю найгалоўную ідэйную дактрыну: усе, што спрыяе нафтава-грашовай гідраўліцы, ёсць праявай высокай духоўнасці і праўдзівай богаабранасці, а ўсё, што замінае – махровая кацапафобія. Кацапскія прэзыдэнты яшчэ не забыліся на традыцыі тоесных ім басурманскіх ханаў, і таму патрабавалі ад еўрапейскіх гасцей не толькі фармальнай лаяльнасці, але і шчырай халопскай адданасці.

І вось адночый падчас братэрскай п'янкі палітычны лідар Хахлоў падняўся з-за стала, шляхотна папрасіў прабачэння – маўляў, я на хвіліначку, -- і пайшоў за дзверы. Але Хахол не павярнуўся ані праз хвіліну, ані праз суткі, ані праз тыдзень. У хуткім часе Кацап і Бульбаш дазналіся з тэленавінаў: нашчадкі сярэдняга *Homo Slavianikus'*а нахабна дэкляруюць, што яны больш не маскоўскія халопы, а праўдзівыя сябры еўрапейскай сям'і, хаця і *козацького роду*.

Праўда, амбітнае высвятленне тамтэйшымі палітычнымі элітамі, хто з іх большы еўрапеец, а хто – меньшы, спрычынілася да чарговай хвалі традыцыйнай казацкай анархіі. Але ж доўжылася яна нядоўга: не паспеў кацапскі кіраўнік нават працверазець, як нашчадкі сярэдняга *Homo Slavianikus'*а апынуліся ў Еўропе. Кантроль за хахляцкім сегментам трубы быў незваротна страчаны.

Гэта страшэнна напалохала тагачаснага лідара Кацапстану. Седзячы за сталом рэстарацыі, ён зморчна засаджваў у сябе шклянку за шклянкай і, пазіраючы са Спасскай вежы на Лобнае месца, прыкідаў сродкі, якімі можна ўтымаць за імперыяй землі з пракладзенымі трубамі. Кайданы, бізуны, калёнае жалеза, катаржныя калодкі і эканамічныя санкцыі былі ў спісе сродкаў ці не самымі памяркоўнымі.

Паводле крамлёўскіх разлікаў, *пайсці і не вярнуцца* мог хто заўгодна, але толькі не Бульбашы. Спадкаемцы малодшага *Homo Slavianikus'*а заўсёды падаваліся Крамлю "недаробленымі Кацапамі", якія толькі і мрояць, як бы прыяднаць свае занядбаныя балотныя выспы да бясконцых імперскіх стэпаў.

Зрэшты, такое сцвярджэнне было небеспадстаўным. Падчас працяглай вандроўкі ў чырвоназорным цягніку ў большасці паспалітых Бульбашоў назаўсёды атрафіраваўся галаўны мозг. Вечныя пасажыры чужых вагонаў незваротна пазабыліся, кім яны ёсць насамрэч і ўпарта ідэнтыфікавалі сябе *Bydlarus Vulgarus'*амі. Некаторыя Быдларусы, неўпадабаныя качагарамі паравоза і кухарамі рэстарацыі, нават марылі павярнуцца ў задушлівае купэ, дзе штовечар кармілі апетытнай баландай і нават налівалі гранчак дармавой сівухі.

Да таго ж, Бульбашы асабліва не прэтэндавалі нават на нафтагазавую трубу. Насельнікі выспаў прасвідравалі ў ёй акуратную дзірачку і распачалі вырабляць з нафты духі *"Красная Москва"*. Неўзабаве асартымент пашырыўся: у продажы з'явіўся адэкалон *"Саша"* і дзіцячы шампунь *"Коленька"*. У Крамлі гэтая саматужная вытворчасць выклікала абсалютнае паразуменне; дробныя крадзяжы не замінала шалёнай плыні нафтадаляраў.

Але ж кацапскія трубнікі так і не ўгледзілі з вышыні Спаскай вежы новых працэсаў, што адбываліся ў пацвілай дрыгве на памежжы з ненавісным Захадам...

На змены аднаклетачным *Bydlarus Vulgarus* спакваля прыходзіла новае пакаленне. Гэтыя маладзёны катэгарычна адмаўляліся звацца "Быдларусамі", душыцца *"Красной Москвой"*, ужываць на апахмел *"Сашу"* і прамываць мазгі падазроным *"Коленькам"*. З цягам часу дзецюкі прыгадалі, што іх краіна -- геаграфічны цэнтр Еўропы, а самі яны – праўдзівыя нашчадкі Вітаўта, Сапегі і Каліноўскага. Многія са здзіўленнем дазналіся, што ў Бульбашоў ёсці свая гісторыя, свая культура і нават нейкая мова. З натуральных прычынаў *Bydlarus Vulgarus* штогод усё меньшала. Прага да самапавагі і жаданне "жыць як у Еўропе" спрыяла значнаму пашырэнню папуляцыі Бульбашоў-патрыётаў. Прагрэсіўная моладзь нікога не баялася – нават правапераемцаў ахоўнікаў з разваленага вагон-зака. Пасля серыі надзвычайна драматычных падзеяў Бульбашыя канчаткова пазбавілася вертухайска-калгаснай улады і нарэшце навярнулася да культуры і цывілізацыі.

Натуральна, у Кацапстане не чакалі ад "малодшых братоў" падобнага спрыту. На Спаскай вежы пагрозліва заблішчэлі біноклі, стэрэатрубы і снайперскія прыцэлы; ўся оптыка была скіраваная ў *мінскім напрамку*. Пабачанае надзвычайна агламошыла кацапскіх імперцаў... Па-над балотамі лунаў сцяг, ненавісны ў Маскве яшчэ з часоў Вялікага князя Альгерда. Самі ж насельнікі выспаў ставілі на нафтагазавыя трубы адмысловыя лічыльнікі, прытым іх мова была абсалютна незразумелай залатаардынскім нашчадкам...

У Крамлі традыцыйна прыгразілі татальным вызваленнем "ісконна кацапскіх земляў" ад усяго насельніцтва; да заходніх межаў імперыі падцягваліся шматлікія танкавыя дывізіі і незлічоныя орды злосных пахмельных пехацінцаў.

Але агрэсія так і не распачалася, бо ў Кацапстане раптоўна надарылася самае страшнае, што толькі маглі сасніць у Крамлі..

Татары, Башкіры, Калмыкі, Чачэны, Ненцы, Якуты, Эвенкі, Чукчы, Ханты з Мансамі і многія іншыя паняволеныя народы нарэшце скемілі, што яны – адзіныя гаспадары сваёй зямлі і больш не жадаюць цярпець ад маскоўскіх крывасмокаў. Так паразумнелыя народы таксама вырашылі *пайсці і не вярнуцца*. Нафтавыя і газавыя свідравіны, вугальныя шахты, дыямантавыя радовішчы, а таксама лясы, палі і рэкі нарэшце перайшлі да законных гаспадароў.

-- *А гвалту мы дамо адпор!* – паабяцалі лідары новастворанных дзяржаваў і падпісалі між сабой вайсковае пагадненне, паводле каторага кожная спроба маскоўскай агрэсіі будзе бязлітасна перасякацца.

Як і мае быць, гэты *ўзброены чын* быў неадкладна кваліфікаваны ў Крамлі як гігантская Сусветная Змова. З тае нагоды Масква абвесціла вайну ўсім без выключэння дзяржавам Еўропы, Азіі, Афрыкі і абедзьвюх Амерык, а таксама Аўстраліі і Акіяніі. З пускавых шахтаў пагрозліва высунуліся балістычныя ракеты, расфарбаваныя пад матрошкі, і неадкладна пацэлілі ўва ўсе бакі свету. Атамныя субмарыны атрымалі загад тапіць нават самыя дробныя чаўны патэнцыйных кацапафобаў. На падмаскоўных аэрадромах звераватыя дэсантнікі паспешліва грузіліся ў самалёты, верталёты і дырыжаблі.

Сам жа кацапскі ўладар схапіў сякеру і ўзяўся плясаць у банкетнае залі Спаскае вежы *"Комаринского"*. Падчас дзіўнай пляскі ён раскроіў

галовы амаль усім прыдворным, пасёк мэблю і нават пабіў усе рэстаранныя унітазы.

Цывілізаваны свет назіраў за дзікунскімі танцамі з роспаччу, здзіўленнем і агідай. Да сусветнай катастрофы заставалася колькі хвілінаў.

Але ж ніводная ракета не паднялася з шахты, ніводная субмарына не выйшла ў мора, ніводны самалёт не ўзляцеў ў паветра і ніводны танк не завёў рухавік...

Таму што ў старэйшага *Homo Slavianikus*'а распачаўся запой.

**Год нулявы**

Аб'яднаныя сілы Чачэнскага Імамату, Казанскага Ханства, Сібірскай Рэспублікі і Дагестанскай Джамахірыі разбілі спітае кацапскае войска ў закалоце на Рублеўскай шашы. Масква, населеная на той час збольшага Чуркамі, Урукамі ды Хачамі, імгненна перакінулася да пераможцаў. Жменька этнічных спадкаемцаў старэйшага *Homo Slavianikus*'а панічна пабегла са сваёй былой сталіцы, неадкладна пераназванай тубыльцамі на Маскву-Сарай.

Тыя Кацапы, якія лічылі сябе ідэйнымі спадкаемцамі Садко, Курбскага, Чаадаева і Шаламава, перабраліся бліжэй да Еўропы, на памежжа с Бульбашыяй. Так было створана Смаленскае княства, класічная буферная дзяржава паміж Усходам і Захадам. Невялікае, але добра ўзброенае смаленскае войска, навучанае дасведчанымі мінскімі і кіеўскімі інструктарамі, *как послушные холопы, держало щит меж двух враждебных рас Монголов и Европы.* Тамтэйшыя гастарбайтары, якія працавалі на рэстаўрацыі бульбашоўскіх замкаў і ў хахляцкіх свінагадоўчых комплексах, прыўносілі ў свой край працалюбства, культуру і талерантнасць. Насельнікі княства, пазбаўленыя залежнасці ад дармавых нафтагрошай, вылюднелі надзіва хутка. На лёсавызначальным рэферэндуме цывілізаваныя смаляне прагаласавалі за канчатковае прыняццё еўрапейскай культуры.

Але ж большасць ацалелых Кацапаў уцякла на паўночны ўсход, дзе заснавала Таймырскую імперыю. У азіятаў яшчэ заставалася колькі дзесяткаў іржавых балістычных ракетаў, якімі яны і палохалі *цэлы бел-свет* з выключна шантажнымі мэтамі. Амерыканскія, еўрапейскія, азіяцкія, аўстралійскія і нават афрыканскія канвоі, наладаваныя пераважна спіртным і закускай, пацягнуліся праз тундру да імперскай сталіцы. Бізантыйская традыцыя, паводле якой насельніцтва краю карысталася плёнам працы іншых народаў, гэтыя самыя народы лаючы, і цяпер спрацоўвала бездакорна.

Але ж шматлікія клептаманы з генералаў-спецслужбоўцаў, якія круцілі таймырскім імператарам, традыцыйна прыўлашчывалі гуманітарную дапамогу; кацапскае войска перабівалася з хлеба на адэкалон...

На ракетнай базе ў Вусць-Зажопінску ніколі не каштавалі гуманітарных прысмакаў -- віскі, джыну, рому, віна і нават піва. Седзячы за баявым пультам, камандзір зраніцы жлукціў вадкасць для распальвання прымусоў і слаў шалёныя праклёны Амерыкосам, Бульбашам, Вузкавокім, Грузошкам, Дэмакратам, Еўрапейцам, Жыдам, Захаду, Італьяшкам, Каталікам, Лягушатнікам, Масонам, Недачалавекам, Обшчачалавекам, Прыбалтам, Румынам, Сіяністам, Татарве, Урукам, Фашыстам, Хахлам, Цыганам, Чарнажопым, Шалудзівым, Шчарбатым, Эстошкам, Юдам і Япошкам. Давечара

камандзір зазвычай напіваўся ва ўмат, але ж зваліцца на пульт не паспяваў, бо непітушчыя падначаленыя-Басурманы абярэжна падхоплівалі яго і цягнулі ў казарму.

Але неяк на чарговае святкаванне Дня Праваслаўнага Харугваносца нажлукціліся абсалютна ўсе, і нават вузкавокія. Нажэрты камандзір зглынуў апошні гранчак улюбёнай вадкасці і неадкладна зваліўся на пульт кіравання -- акурат лобам на чырвоную кнопку...

Бялёсая плазменая сфера імгненна накрыла сабой увесь Таймыр. Пякельны атамны агонь з шалёнай хуткасцю пакаціўся па Еўразіі, бязлітасна выпальваючы на сваім шляху ўсё жывое. Гарады, мястэчкі і вёскі былі знішчаныя разам з усімі насельнікамі.

Нешматлікія людзі з жахам хаваліся ў земляных шчылінах, дзе хутка гінулі ад радыяцыі, голаду і смагі. Ацалелая жменька самых трывушчых нарэшце здолела выбрацца на ўкрытую попелам пустэлыню, яшчэ цёплую ад пякельнага агню.

Прамысловасці, гандлю і земляробства больш не існавала. Культура і цывілізаванасць канчаткова пакінулі занядбаную зямлю. Людзі, якія яшчэ нядаўна ганарылася нана-тэхналогіямі і арганізоўвалі міжпланетныя экспедыцыі, абраслі поўсцю і забыліся на чалавечыя словы. Свае пачуцці яны выяўлялі выключна рыкам і мыканнем -- у залежнасці ад настрою і ступені сытасці. У некаторых калматых істотаў нават адраслі хвасты...

Дні цяклі, нібы вада ў крыніцы: няспешліва, роўна і без падзеяў. З цягам часу на месцы выпаленай пустэльні паўсталі пракаветныя лясы, і дзікуны, хаваючыся ад хіжакоў, перасяліліся на дрэвы. Але ж калматых істотаў усё большала і большала.

Нарэшце, самы разумны самец, які толькі аддалена нагадваў чалавека, здагадаўся адкінуць хвост і злезці з дрэва...

*2002 – 2009 гг. (з перапынкамі)*
*Менск, Чарнігаў, Ладзінка, Лысая Гара.*

*У “Праўдзівай гісторыі Кацапа, Хахла і Бульбаша” выкарыстаныя цытаты з твораў В. Адамчыка, Н. Арсенневай, М. Астроўскага, Б. Ахмадулінай, М. Багдановіча, Ф. Багушэвіча, А. Блока, Я. Бродскага, В. Быкава, Я. Выбіцкага, У. Высоцкага, А. Гаруна, М. Гогаля, М. Горкага, Ф. Дастаеўскага, У. Дубоўкі, В. Іпатавай, К. Каліноўскага, У. Караткевіча, І. Катляроўскага, Р. Квітко-Аснаўяненкі, М. Клімковіча, Я. Коласа, К. Крапівы, М. Краўцова, А. Куляшова, Я. Купалы, М. Ламаносава, У. Леніна, М. Лермантава, Я. Мандэльштама, У. Маякоўскага, І. Меліжа, А. Мікалайчука, А. Міцкевіча, М. Нячуй-Лявіцкага, А. Олеся, А. Пушкіна, В. Пялевіна, М. Рыльскага, О. Руты, У. Сасюры, Г. Сенкевіча, К. Сіманава, В. Сіманенкі, Я. Сталіна, М. Старыцкага, А. Сыса, Л. Талстога, П. Тычыны, Л. Украінкі, І. Франка, П. Чубінскага, Т. Шаўчэнкі, М. Шолахава, С. Ясеніна, а таксама беларускі, расейскі і ўкраінскі фальклёр.*

© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2010 год
© PDF: Камунікат.org, 2010 год